№ 19 (521) 25 траўня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы




## Хімікі зь фізыкам

Павал Севярынец і Мікола Статкевіч выйшлі на свабоду ў адзін дзень. Такіх выпадковасьцяў не бывае. Паддывановыя перамовы з Захадам ідуць, Статкевіч і Севярынец мяркуюць, што іх «выменялі на гандлёвыя прэфэрэнцыі» (**старонка 4**).

Вызваленьне двух палітычных, а цяпер і маральных аўтарытэтаў памяняла расклад сілаў у апазыцыі. Аляксандар Мілінкевіч атрымаў салідную падтрымку ў сваім супрацьстаяньні зь лідэрамі апазыцыйных партый. «Цмокі а пяці галовах нежыцьцяздольныя», заявіў Севярынец у часе онлайн-канфэрэнцыі з чытачамі «НН» (**старонка 6**). «Буду дапамагаць Мілінкевічу», — заявіў ён на сваёй першай прэс-канфэрэнцыі (**старонка 5**). Севярынец, які за час высылкі вырас у найпапулярнейшую фігуру нацыянальнага руху, сваё першае публічнае зьяўленьне зрабіў у нацыянальнай вышыванай кашулі.

Зьмены могуць адбыцца і ў сцэнары суботняга Кангрэсу дэмакратычных сілаў, вынікі якога здаваліся запраграмаванымі (**старонка 12**). Кангрэс партыйных сілаў рызыкуе стаць дэманстрацыяй партыйных слабасьцяў. Статкевіч выносіць на форум альтэрнатыўную стратэгію апазыцыі, якую ён назваў «эўрапейскай» (**старонка 6**).

### У НУМАРЫ

**Разам супраць вялікага д’ябла**

Ахмадынэджад пабываў у Беларусі зь візытам, вынікі якога пакуль цяжка ацаніць. Старонка 13.

**Працэс пяці**

28 траўня распачынаецца суд над Маладым Фронтам. Старонка 8.

**«Белтрансгаз» прадалі незваротна**

Старонка 7.

# Увага!

Каб рэгулярна атрымліваць газэту, вам трэба проста падпісаць дамову на яе пакупку і перавесьці грошы праз банк.

Дамову трэба падпісаць і даслаць на адрас Рэдакцыі (220050 Менск а/с 537) не пазьней за 25 мая.

Аплату па квітанцыі вам трэба зрабіць не пазьней за 1 чэрвеня. Квіток пра аплату перасылаць ня трэба, ён аўтаматычна прыйдзе нам з банку.

Дарагія людзі! Сёньняшняя «Наша Ніва» — гэта ўнікальная зьява, беспрэцэдэнтны выпадак у нацыянальнай гісторыі, калі газэта выходзіць і распаўсюджваецца сваімі сіламі, з апорай на чытачоў. Вашы дзеці і ўнукі будуць распытваць Вас пра гэты час і гэтую газэту.

Не стамляйцеся падпісвацца, а таксама падпісваць суседнія школы, вучэльні, офісы, асяродкі, цэрквы — там, дзе газэта ня будзе прападаць. Прачытаўшы газэту, перадавайце яе школьнікам, студэнтам, пакідайце ў цягніках, цырульнях, усюды, дзе яе могуць прачытаць іншыя людзі, якія яшчэ ня ведаюць, што незалежныя газэты ёсьць, выходзяць.

Пераможа вытрываласьць.

**Ваша «Наша Ніва»**

**Па пытаньнях дастаўкі газэты зьвяртайцеся да Рамана: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84 e-mail: dastauka@tut.by**

## РЭДАКЦЫЙНЫЯ КАМЭНТАРЫ

# Два на два

Было б лягічна, каб у адказ на вызваленьне двух палітвязьняў Эўропа выкрасьліла двух чыноўнікаў са сьпісу невыязных.

Несумненна, што кожны крок Беларусі да нармальнасьці павінен знаходзіць прыязны водгук.

Тады Вячаслаў Дашкевіч захавае надзею пабачыць свайго Зьмітра, а Ірына Казуліна — Аляксандра.

Патэнцыял для збліжэньня з Эўропай вялікі: за кожную газэту, вернутую ў «Саюздрук», — яшчэ па адным. Пасьля — Рада Эўропы. Пасьля — дамова аб добрым суседзтве з Эўрасаюзам.

То не жарты былі б, а жэсты. Адзіная мова, якую разумеюць людзі, што гавораць на розных мовах.

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY



# Саша і Сірожа сустаршыні тожа

Сьмех у залі. Пакуль апазыцыйная вярхоўка ўсур'ёз і са смакам дзеліць крэслы, чытачы сайту nn.by галасуюць за папулярных комікаў Сашу і Сірожу.

**Вы за тое, каб Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы ўзначальвалі...**

| | |
|---|---|
| сустаршыні | 45 (9.7%) |
| адзін старшыня | 198 (42.7%) |
| лідэры партый па чарзе | 16 (3.4%) |
| Саша і Сірожа | 205 (44.2%) |

Ад 16.05. усяго прагаласавала: 464

# Дзяржава для народу

Пасьля адмены льготаў на самае неабходнае — камуналку для пэнсіянэраў і праезд для студэнтаў — Беларусь ператвараецца ў найменш сацыяльную дзяржаву ў Эўропе.

«Хоча Пуцін, каб мы плацілі гэтыя грошы, — будзем зьбіраць ад лекаў, чарнобыльцаў, ад тых, хто ў акопах гніў, зьбяром...», — крыўдаваў нядаўна кіраўнік Беларусі на падаражаньне расейскіх энэрганосьбітаў. Хто тады мог думаць, што гэта ня кідкая рыторыка, а прадуманая стратэгія, якая і легла ў аснову новага закону «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорыяў грамадзянаў».

Будуць адмененыя зьніжка на праезд у пасажырскім транспарце для навучэнцаў, вэтэранаў працы, грамадзян пры выкананьні службовых абавязкаў. Скароцяцца катэгорыі асобаў, якія маюць ільготы па аплаце камунальных і мэдычных паслуг.

Палата прадстаўнікоў прыняла гэты спушчаны з прэзыдэнтуры закон 101 голасам супраць 1. Няма сумневаў, што савет рэспублікі закон зацьвердзіць. І тады, працягваючы цытату, «...перастануць намі маніпуляваць і перастануць нас шантажаваць».

Трансфармацыя сыстэмы льготаў, напэўна, мае эканамічны сэнс. Толькі прапаганда «дзяржавы для народу» пасьля гэтага глядзіцца цынічна. Пасьля адмены льготаў на самае неабходнае — камуналку для пэнсіянэраў і праезд для студэнтаў — Беларусь ператвараецца ў найменш сацыяльную дзяржаву ў Эўропе. Застаецца суцешыцца надзеяй, што льготы з помпай вернуць перад выбарамі 2011 году.

пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# «Нас памянялі на гандлёвыя прэфэрэнцыі»

У аўторак у Наваполацку і Мар'інай Горцы адбыліся выязныя паседжаньні судоў. На іх было прынята рашэньне аб умоўна-датэрміновым вызваленьні **Мікалая Статкевіча** і **Паўла Севярынца**. Палітыкі былі асуджаныя ў траўні 2005 г. на тры гады абмежаваньня свабоды за арганізацыю вулічных дэманстрацый пратэсту.

Павал адбываў пакараньне на лесанарыхтоўках у в.Малое Сітна Полацкага раёну. Сп.Мікалай напачатку быў высланы ў Баранавічы, а пасьля пераведзены ў в.Блонь Пухавіцкага раёну. На волю палітыкі мусілі выйсьці ў жніўні.

**«Наша Ніва»: Да Вас не датэлефанавацца. Столькі віншаваньняў?**

**Павал Севярынец:** Так. За гадзіну пасьля сканчэньня суду ўжо было каля 15 тэлефанаваньняў. Пазванілі сябры з «Маладога фронту», маці, журналісты. Усе віншуюць.

**Мікола Статкевіч:** Тэлефанаваньняў сапраўды шмат. У мяне, як назло, садзіцца батарэя тэлефона, а я ўсё яшчэ не датэлефанаваўся да сям'і.

**«НН»:** Калі даведаліся, што могуць вызваліць?

**ПС:** Пра сёньняшні суд я даведаўся толькі ў пятніцу, калі да мяне дадому ў Віцебск прыходзіў міліцыянт, які сказаў, што ў яго добрыя навіны. Не падмануў.

**МС:** Намёкі пачаліся яшчэ ў пятніцу, але прызнаюся, што ўсё было досыць зьнянацку.

**«НН»: Што сёньня адбывалася на судзе?**

**ПС:** Падалося, што ўсё прайшло па сцэнары, паводле якога я мусіў выйсьці на волю. І пракурор, і судзьдзя адназначна палічылі, што тэрмін маёй «хіміі» мусіць быць скончаны. На мае рэплікі, што я лічу, што незаконна быў асуджаны, таму мне няма за што каяцца, яны папросту не рэагавалі. Прыдумалі трактоўку «за прыкладныя паводзіны». Улады абыходзяць самімі ж прыдуманыя нормы.

**МС:** З Блоні мяне забралі літаральна за 20 хвілінаў да пачатку суду, які быў чыстай фармальнасьцю. Судзьдзя папросту зачытаў пастанову, паводле якой я вызваляюся. Хіба што ў судзе было зашмат «гэбістаў», якія, мабыць, чакалі прыезду палітыкаў і журналістаў. Судзьдзя адзінае запыталася ў мяне, ці ня буду я супрацiўляцца вызваленьню. Дзеля свайго старога бацькі адказаў, што ня буду. Больш пытаньняў не было.

**«НН»: З чым Вы зьвязваеце гэтае вызваленьне?**

**ПС:** Найперш з тым, што Беларусь ужо ў найбліжэйшы час можа страціць гандлёвыя прэфэрэнцыі Эўрасаюзу. Таксама зьвязваю гэта зь нядаўняй сустрэчай намесьніцы кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Натальлі Пяткевіч з прадстаўніком Дзяржэдэпартамэнту ЗША Крамэрам. Пасьля гэтай сустрэчы ў Беларусі не пачалі ніводнай палітычна матываванай крымінальнай справы і нават амаль нікога не садзілі на суткі. Лічу, што пачаўся нейкі гандаль з Эўропай, дзе палітзьняволеныя адыгрываюць важную ролю.

**МС:** Улада спрабуе такім чынам уратавацца. Відавочна, што мяне вызвалілі, каб ня страціць гандлёвыя прэфэрэнцыі. Ідзе сапраўдны гандаль людзьмі. У гэтым пляне Нігерыі яшчэ вельмі далёка да Беларусі.

**«НН»: Зь якім пачуцьцём выходзіце на волю?**

**ПС:** З дваістым. Выходжу на свабоду, якой чакаў. Зь іншага боку — разумею, што мяне абмянялі на гандлёвыя прэфэрэнцыі. Што мая свабода каштуе столькі мільёнаў даляраў. Раней патрабавалі пакаяньня, цяпер ня трэба і гэтага. Эканоміка, відаць, сапраўды прыціснула ўладу.

**МС:** Складаныя пачуцьці. У душы сядзіць нешта вельмі гадкае, а ня радаснае. Мне заставалася прабыць на «хіміі» два месяцы, якія я зьбіраўся адседзець. Я не пісаў ніякіх просьбаў пра вызваленьне спадарыні Пяткевіч, бо лічу гэта ніжэй за ўласны гонар. Нас, як закладнікаў, спрабуюць вызваліць. Аднак трэба запомніць, што закладнікаў нельга выкупаць, бо ў такім выпадку будуць новыя закладнікі.

**«НН»: Што было найцяжэйшым падчас зьняволеньня?**

**ПС:** Бачыць тое, што сёньня ўяўляе Полаччына. Яе дэградацыю праз «максімку», калгасны лад, прыніжаных людзей. Полаччына, якая мае 1000-гадовую гісторыю, якая дала сьвету Скарыну і Эўфрасіньню, заслугоўвае лепшай долі.

**МС:** Пачуцьцё несвабоды. Разуменьне, што тваім жыцьцём распараджаюцца іншыя. Хаця я хачу сказаць, што любой сытуацыяй можна кіраваць самому. Трэба проста з усімі кіравацца годнымі паводзінамі.

**«НН»: Якія пляны на бліжэйшыя дні?**

**ПС:** Зараз паеду да бацькоў у Віцебск. На выходных пляную быць на Кангрэсе, а ў панядзелак — на судзе над «маладафронтаўцамі».

**МС:** Гэтым вызваленьнем улада хоча, каб я ўдзельнічаў у ганебным Кангрэсе. Мы з Паўлам Севярынцам доўга раіліся, ці варта туды ісьці. Вырашылі, што пойдзем, але выкажам там сваю думку. 28 траўня буду на судзе над «маладафронтаўцамі».

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

### Эўрасаюз: Вызваленьне палітвязьняў ня мае сувязі з прэфэрэнцыямі

**Ужо на другі дзень пасьля вызваленьня Паўла Севярынца і Міколы Статкевіча Эўропа дала зразумець, што гэты факт ніяк не адаб'ецца на рашэньні пазбавіць Беларусь гандлёвых прэфэрэнцыяў. Пра гэта на он-лайн канфэрэнцыі на сайце naviny.by заявіў каардынатар па сувязях з Беларусьсю прадстаўніцтва Эўракамісіі ва Украіне і Беларусі Жан-Эрык Хольцапфэль: «Мэханізм сыстэмы прэфэрэнцый ніяк не зьвязаны з палітычнымі вязьнямі, ён зьвязаны з абаронай правоў прафсаюзаў і выкананьнем умоваў Міжнароднай арганізацыі працы».**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Севярынец: Буду дапамагаць Мілінкевічу

Ужо на другі дзень пасьля вызваленьня **Павал Севярынец** прыехаў у Менск. А чацьвёртай раніцы на чыгуначным вакзале яго сустракалі сябры і знаёмыя, з кветкамі і музыкай.

З раніцы Павал наведаў цырульню, а ўжо а 11:00 даваў прэс-канфэрэнцыю ва ўправе Партыі БНФ. Ён быў апрануты ў кашулю зь беларускім нацыянальным арнамэнтам. Паглядзець на Севярынца прыйшло каля 70 чалавек. Сярод іх быў Аляксандар Мілінкевіч, Іна Кулей, Аляксей Янукевіч, Стэфан Эрыксан і шмат хто яшчэ. Мілінкевіч падарыў былому палітвязьню букет бела-чырвона-белых гвазьдзікоў.

Напачатку прэс-канфэрэнцыі зь невялікім словам выступіў старшыня Вінцук Вячорка, які ўручыў Севярынцу прэмію Партыі БНФ за 2006 год. Вячорка адзначыў, што на прыкладзе Севярынца мы можам убачыць, як адзін чалавек здольны рабіць вечнасьць.

Сам Павал Севярынец пачаў сваю прамову з падзякаў на адрас тых, хто прыяжджаў да яго ў Сітна, хто пісаў лісты (агулам ён атрымаў 1480 карэспандэнцый), журналістам, сябрам, усім, хто не забываў яго. Павал сказаў, што менавіта ў Малым Сітне ён як ніколі востра адчуў людзкую салідарнасьць, якое не заўсёды хапала на волі.

Пра пляны на бліжэйшую палітычную будучыню Павал адзначыў, што зьбіраецца дапамагаць Аляксандру Мілінкевічу ў руху «За свабоду», бо бачыць у ім вялікую пэрспэктыву. У плянах Севярынца ператварыць Беларускую хрысьціянскую дэмакратыю ў найбуйнейшую палітычную партыю ў краіне. Севярынец пацьвердзіў, што зьбіраецца ўдзельнічаць у Кангрэсе дэмакратычных сілаў, дзе будзе выступаць за стратэгію «Эўрапейскай кааліцыі».

Севярынец заклікаў усіх прысутных прыйсьці 28 траўня да суду Савецкага раёну, каб падтрымаць пяць «маладафронтўцаў», якіх у гэты дзень пачынаюць судзіць.

Па сканчэньні прэс-канфэрэнцыі каля Паўла сабралася цэлая жывая чарга людзей, якія хацелі паразмаўляць зь ім.

**Зьміцер Панкавец**

# «Цмокі а пяці галовах нежыцьцяздольныя»

У пятніцу на вашыя пытаньні на сайце nn.by адказваў палітссыльны **Павал Севярынец**. Прапануем Вашай увазе некаторыя адказы.

**— Павал, ці зьмянілася нешта ў табе за час пакараньня хіміяй? Вадзім**

— Галоўнае — духовае кшталтаваньне: Бог ведае, дзе трэба быць кожнаму з нас. А яшчэ ўсьведамленьне таго, наколькі моцнай можа быць беларуская салідарнасьць. На гэты момант мяне наведала больш за 500 чалавек і мне даслалі 1478 лістоў.

**— Навошта нам Кангрэс дэм. сілаў? Сьнежны Чалавек**

— Мяркую, нават арганізатары Кангрэсу ня ў стане толкам патлумачыць.

**— Што Вы можаце прапанаваць тым хрысьціянам, якія хацелі б уплываць на грамадзкія справы, але ня бачаць сябе ў сыстэме каардынатаў «улада-апазыцыя»? Якія тыповыя праекты дзейнасьці?**

— Абараняць маральнасьць, законнасьць і хрысьціянскія нормы ў сваім горадзе ці мястэчку.

**— Павал, як спыніць разбурэньне Горадні? Канстанцін**

— Так, як было спынена разбурэньне Курапатаў у 2001-2002 г. Кругласутковая варта соцень актывістаў, людзкая салідарнасьць і адначасова — шырокая інфармацыйная кампанія сярод жыхароў Горадні. За гістарычную Горадню мусіць змагацца не адно апазыцыя, а ў першую чаргу самі гарадзенцы.

**— Паша, тваё стаўленьне да валтузьні вакол Мілінкевіча? Чалавек**

— Пакуль рэжым разбурае краіну — тут год грызуцца, хто галоўны. У Беларусі асноўная сіла нацыянальнага руху гуртуецца цяпер вакол Мілінкевіча. Можна ізноў жа спрачацца, ці пацягне, а можна ўпрэгчыся і дапамагчы. Рух «За Свабоду» можа стаць тым, чым быў пры канцы 1980-х БНФ або нават «Салідарнасьць» у Польшчы, — задаткі для гэтага ёсьць.

**— Ваша стаўленьне да падзей у Эстоніі?**

— Расея раздзьмула міжнародны канфлікт зь беспарадкамі і ахвярамі ў суседняй краіне. На межах з Прыбалтыкай, Грузіяй, у Прыднястроўі, Паўднёвай Асеціі, Абхазіі, у Крыме, а таксама пасярэдзіне Украіны і (увага!) на заходняй мяжы Беларусі імпэрыя сутаргава спрабуе намацаць «заходні вал» супраць дэмакратыі.

**— Што скажаце пра рашэньне Янушэўскага выехаць за мяжу?**

— Наколькі я ведаю, маладафронтаўцы прынялі рашэньне адправіць Аляксея за мяжу, бо ён адказны за працу сайту (www.mfront.net). Ход слушны.

**— Ці патрэбна дэмакратам удзельнічаць у выбарах, і ці пойдуць МФ і БХД на іх? Можа, патрэбна зрабіць супольны сьпіс на чале зь Мілінкевічам? Кастусь**

— На жаль, выбараў у нас даўно няма. Кампаніі праводзіць будзем. А нацыянальнаму руху трэба яднацца, мае це рацыю, і трымацца адзінай моцнай стратэгіі: беларускай паводле мовы, эўрапейскай паводле формы і хрысьціянскай паводле зьместу.

**— Як вы ставіцеся да ствараемага наноў цмока зь пяцьцю галовамі? Людміла**

— Наколькі я ведаю зь біялёгіі, цмокі а пяці галовах нежыцьцяздольныя. Нельга дазволіць камунізму ўзяць рэванш у Аб'яднаных дэмакратычных сілаў.

### Дзьве стратэгіі апазыцыі

Стратэгія Палітрады была абмеркаваная вясной на сэмінары апазыцыі ў Вільні. Стратэгія «Эўрапейскай кааліцыі» фактычна была распрацаваная былым палітвязьнем Мікалем Статкевічам. Чыя возьме на Кангрэсе?

*Кіраўніцтва*

Палітрада: Кааліцыйнае кіраваньне апазыцыяй.

Эўрапейская кааліцыя: Адзін лідэр зь вялікімі паўнамоцтвамі.

*Масавыя акцыі*

П: Адмовіцца ад на пэўным этапе ад правядзеньня масавых вулічных акцыяў.

Э: Рыхтаваць дэмакратычныя сілы й грамадзтва да масавай кампаніі грамадзянскага дзеяньня з палітычнымі й сацыяльна-эканамічнымі патрабаваньнямі.

*Эвалюцыя рэжыму*

П: Разьлік на эвалюцыйны шлях пераходу сёньняшняга рэжыму да дэмакратыі і дыялёг з кіруючымі элітамі.

Э: На эвалюцыю спадзяваньняў няма, бо лідэры гэтага рэжыму разглядаюць дэмакратыю толькі як пагрозу страты ўлады.

*Дыялёг*

П: За дыялёг з уладай праз «круглыя столы».

Э: За дыялёг з асобнымі людзьмі, а не з уладай.

ЗП

## ГОД ПАЭЗІІ. З КЛЯСЫКІ

### МАКСІМ ТАНК

***

Знаю — нялёгка ў закутай краіне
Выламаць краты і зьнішчыць астрог…
Толькі каб дзецям сваім не пакінуць
Торбаў жабрацкіх, этапных дарог.

Знаю — ня мала на родных раўнінах
Вырасьце новых курганаў нямых…
Толькі каб нам не пакінуць краіне
Межаў праклятых і песень глухіх.

*1937*

**2007 год — год 125-годзьдзя Купалы й Коласа. Сёлета «НН» штонумар друкуе вершы. Чакаем новых твораў.**

# «Белтрансгаз» прадалі незваротна

Бяз права залатой акцыі.

Расейскі газавы гігант ААТ «Газпром» і Дзяржкамітэт па маёмасьці Беларусі ў мінулую пятніцу падпісалі дамову куплі-продажу акцый «Белтрансгазу».

Расейская кампанія набывае 50% акцый «Белтрансгазу» за $2,5 млрд.

Аплата будзе ажыцьцяўляцца роўнымі долямі ў чатыры этапы цягам 2007—2010 г. На кожным этапе «Газпром» будзе набываць 12,5% акцый «Белтрансгазу». Да сканчэньня зьдзелкі, акцыі «Белтрансгазу», якія падлягаюць продажу ААТ «Газпром», не павінны быць адчужанымі, абцяжаранымі або перададзенымі ў заклад.

Цягам 50 дзён пасьля пераходу да ААТ «Газпром» права ўласнасьці на першую частку акцый «Белтрансгазу» ў памеры 12,5% статутнага капіталу мае быць скліканы пазачарговы сход акцыянэраў ААТ «Белтрансгаз» па пытаньні новага складу назіральнай рады таварыства.

Дадатак да дамовы прадугледжвае паэтапнае (2008—2010 г.) павышэньне ўзроўню аптовай нацэнкі да цаны газу, што рэалізуецца ААТ «Белтрансгаз» канцавым спажыўцом у Беларусі, і абавязкі беларускага боку ня ўводзіць асобнае права дзяржавы («залатую акцыю») на ўдзел у кіраваньні ААТ «Белтрансгаз».

Транзыт расейскага газу па тэрыторыі Беларусі ў 2007 г. складзе 45,8 млрд. куб.м., у тым ліку па газапроводзе «Ямал-Эўропа» — 30 млрд. куб.м.

**СП**

**Сямашка: гэта толькі пачатак**

Першы віцэ-прэм'ер Ўладзімер Сямашка заявіў, што за 1–2 месяцы ўрад будзе гатовы прадаць акцыі нафтахімічных прадпрыемстваў «Нафтан», «Палімір», «Азот» і «Хімвалакно». Умовы прыватызацыі: наяўнасьць у інвэстара ўласных сродкаў для набыцьця акцыяў і інвэстваньня ў вытворчасьць, сыравіны і рынкаў збыту. Для дакладнай ацэнкі прадпрыемстваў, іх акцыі зьявяцца на заходнеэўрапейскіх біржах каштоўных папераў. Пакеты па 10–15% найхутчэй разьмесьцяць на лёнданскай біржы.

# «Белтэлекам» перастане быць манапалістам

Тым часам зьвесткі пра продаж СП ТАА «Мабільная лічбавая сувязь» (Velcom) і БеСТ не знайшлі пацьверджаньня.

Паводле словаў намесьніка міністра сувязі і інфарматызацыі Мікалая Струкава, падчас першага этапу дэманапалізацыі «Белтэлекаму» арганізацыя была падзеленая на дзьве структуры: цяпер за паштовую сувязь адказвае РУП «Белпошта», за электрасувязь — «Белтэлекам». На сёньня адбываецца тэхнічная мадэрнізацыя, што ўключае ў сябе пабудову апорнай сеткі Інтэрнэт, стварэньне лініяў міжнароднай сувязі, оптавалаконных лініяў. На гэтым этапе прадпрыемства рыхтуецца да працы ў рынкавых умовах. У бягучым годзе пачнецца трэці этап, які скончыцца ў 2009 г.

За гэты час зьменяць мэнэджмэнт прадпрыемства, з мэтаю пазьбяганьня перакрыжаванага субсідыяваньня створаць раздзельны ўлік выдаткаў. Апошняе павінна палепшыць тарыфную палітыку.

Адначасова «Белтэлекам» створыць інфраструктуру для праекту Metro Ethernet. Плянуецца, што да кожнага дому ў сталіцы будзе падведзены оптавалаконны кабэль, што дазволіць падпісчыкам паслугаў атрымліваць па адным канале тэлефонны і тэлевізійны сыгнал, а таксама карыстацца паслугамі інтэрнэт.

Сёлета плянуецца дэманапалізацыя ў сфэры міжнародных паслугаў. Гэта, а таксама допуск на рынак замежных правайдэраў у 2007 г., зьяўляецца адной з умоваў уступленьня краіны ва Ўсясьветную гандлёвую арганізацыю. Цалкам рынак паслугаў электрасувязі лібэралізуецца пасьля напаўненьня фонду ўнівэрсальнага абслугоўваньня, утворанага прэзыдэнцкім указам №96 ад 20 лютага.

Тым часам зьвесткі пра продаж СП ТАА «Мабільная лічбавая сувязь» (Velcom) і БеСТ не знайшлі пацьверджаньня. Намесьнік міністра Мікалай Струкаў пакуль не гатовы камэнтаваць выказваньне прэзыдэнта аб магчымым продажы двух мабільных апэратараў. Нагадаем, што расейскі сотавы апэратар «Білайн» ужо агучыў намер набыць пакет акцыяў аднаго зь беларускіх мабільных апэратараў.

Па словах М.Струкава, разглядаецца магчымасьць атрыманьня дзеючымі айчыннымі апэратарамі ліцэнзіі на выкарыстаньне мабільнай сувязі трэцяга пакаленьня G3. Пры гэтым, дзеля пашырэньня даступнасьці G3-сувязі, кошт ліцэнзіяў для апэратараў ня будзе павышаны.

**Сямён Печанко**

# Акцыянэрныя таварыствы разьлічацца за крэдыты акцыямі

Дзяржава валявым рашэньнем павялічвае сваю долю ў статутных фондах шэрагу акцыянэрных таварыстваў.

Гэтак прадпрыемствы змогуць «разьлічыцца зь дзяржавай» за атрыманыя ў мінулым годзе крэдыты і прэфэрэнцыі.

Пастановай №440 ад 5 красавіка 2007 г. урад аформіў прынятае раней рашэньне аб павелічэньні дзяржаўнай ў статутных фондах 13 буйных акцыянэрных таварыстваў. Сярод гэтых прадпрыемстваў — цукровыя камбінаты, прадпрыемствы малочнай галіны, манапаліст па вытворчасьці соладу «Белсолад» ды інш.

Дзярждоля ў статутных фондах акцыянэрных прадпрыемстваў павялічыцца за кошт друку імі дадатковай колькасьці акцыяў. Плата за рэгістрацыю новай эмісіі не прадугледжваецца. Надрукаваныя акцыі будуць перададзеныя дзяржаве. Такім чынам адбудзецца разьлік за часткова пагашаныя за кошт бюджэту адсоткі па банкаўскіх крэдытах, атрыманых акцыянэрнымі таварыствамі на мадэрнізацыю вытворчасьці. Такія крэдыты атрымалі ААТ «Белсолад» і ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка». Астатнія акцыянэрныя таварыствы атрымалі крэдыты на свае інвэстыцыйныя праекты. Найбольш буйныя інвэстпраекты былі зьдзейсьненыя на цукровых камбінатах у Жабінцы, Гарадзеі і Скідзелі. Тут дзяржава атрымае 98.9%, 99.9 і 99.8% акцыяў адпаведна.

**СП**

28 траўня а 10:00 ў Савецкім судзе Менску пачнецца працэс «маладафронтаўцаў».

# Трэцяя зьмена

Зьмітра Хведарука, Барыса Гарэцкага, Насту Палажанку, Алега Корбана і Аляксея Янушэўскага вінавацяць у парушэньні арт.193 КК «Дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі». Ім усім ад 16 да 21 году. А.Янушэўскага на судзе ня будзе: хлопец папрасіў палітычнага прытулку ў Чэхіі. Астатнім пагражае да двух гадоў турмы. Справу разгледзіць судзьдзя Руслан Аніскевіч.

Спробы зарэгістраваць арганізацыю, скліканьне ўстаноўчага сходу «МФ», каб спыніць крымінальны перасьлед, не далі плёну.

Упершыню ў найноўшай гісторыі Беларусі на лаве падсудных па палітычна матываванай справе апынуцца адразу пяцёра. А раней на «хіміях» і ў калёніі апынуліся старэйшыя лідэры «МФ» — Павал Севярынец, Зьміцер Дашкевіч, Артур Фінькевіч. Абсурдныя абвінавачваньні ў віцебскіх выбухах і двух забойствах выстаўляліся супраць жодзінскага «маладафронтаўца» Паўла Красоўскага. У дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі падазраюць і непаўналетніх Івана Шылу з Салігорску (яго ўжо спрабавалі зьвінавацiць у крадзяжы), Яраслава Грышчэню з Баранавіч. Іх справы не дайшлі да суду. Аршанца Сержука Гумінскага падазравалі ў нанясеньні графіці. Жлобінскага актывіста Эдуарда Зелянкова судзілі, але судзьдзя не адправіў хлопца ў турму, абмежаваўся штрафам.

Ад сакавіка 2006 г. па справе «Маладога фронту» прайшлі сотні допытаў. Пад «крыміналкай» хадзілі Сяржук Лісічонак, Сяржук Гудзілін, Наста Азарка...

У тым факце, што душаць менавіта «Малады фронт», нічога дзіўнага няма. Улада баіцца «МФ», як баіцца любой арганізацыі беларускамоўных. Вось чаму фактычна не засталося беларускіх грамадзкіх аб'яднаньняў, школаў і выданьняў. Вось чаму напаўзабароненай стала беларуская музыка.

28 траўня перад судом паўстануць тыя, хто прыйшоў у арганізацыю ўжо не за Паўлам Севярынцам, а за Зьмітром Дашкевічам, які зьяўляецца для іх неаспрэчным аўтарытэтам. Некаторыя, як Хведарук, упершыню ўбачылі Севярынца ўжо на «хіміі». Гэта ўжо трэцяе пакаленьне «МФ».

Артур Фінькевіч пэўны: нават калі працэс скончыцца прысудамі і турмой для сёньняшніх лідэраў «МФ», маладзейшыя зоймуць іхнае месца. Усе фігуранты крымінальнай справы адзначаюць, што «МФ» для іх стаў сапраўднай школай жыцьця. Ня выключана, што праз пару гадоў у «Малады фронт» прыйдуць маладзёны, якія натхніліся стойкасьцю Хведарука ці Палажанкі.

**Зьміцер Панкавец**

# Працэс пяці

## Зьміцер Хведарук: Хачу вучыцца

Як і мноства аднагодкаў, Зьміцер Хведарук прыйшоў да беларушчыны праз дыск гурту NRM «Тры чарапахі», які даў яму паслухаць аднакласьнік. З гэтага моманту, кажа, усё і пачалося. Што праўда, пасьля пачынае расказваць пра сваю першую настаўніцу Эльвіру Невяроўскую. «Беларускамоўная жанчына, якую пазьней звольнілі са школы праз тое, што адмовілася ў сваім кабінэце вешаць партрэт Лукашэнкі, — кажа Зьміцер. — Яна вазіла нас малых на экскурсіі ў Мір, Нясьвіж, Ружаны, па Гарадзеншчыне. Пэўна, што ўжо тады яна закладвала нешта ў нашы душы».

Хведарук нарадзіўся ў Менску ў 1988 г., скончыў гімназію №11, што на вуліцы Каліноўскага. Да восьмай клясы быў выдатнікам, пасьля стаў аддаваць больш часу і ўвагі тым прадметамі, якімі найбольш цікавіўся.

У «Малады фронт» прыйшоў праз абвестку ў «Нашай Ніве», у жніўні 2005 г. «Патэлефанаваў, сустрэўся са Зьмітром Дашкевічам. Мы зь ім паразмаўлялі хвілінаў 40, але ён загрузіў мяне так, што я зразумеў: «МФ» — гэта на ўсё жыцьцё». Кажа, што спачатку крыху пабойваўся ўступаць, бо думаў, што там усе мэтанакіраваныя, непахісныя, аптымістычныя, як Севярынец. «Цяпер жа «Малады фронт» для мяне сапраўдная сям'я», — гаворыць Зьміцер.

Расказвае, калі ўпершыню ўбачыў Дашкевіча, той быў у строгім касьцюме, таму на першае паседжаньне «МФ» Зьміцер таксама прыйшоў у пінжаку. «Янушэўскі тады нават падумаў, што я гэбіст, — сьмяецца Хведарук. — Пазьней, праўда, мы сталі найлепшымі сябрамі».


PHOTO.BYMEDIA.NET
Зьміцер Хведарук.

Упершыню за краты Хведарук трапіў перад леташнімі выбарамі. Далі пяць сутак. Сядзеў разам зь Яўгенам Скрабутанам, Сяргеем Салашам, Алесем Зарамбюком, Барысам Гарэцкім. На Акрэсьціна ж упершыню галасаваў. Агулам Хведарук ужо адседзеў 33 сутак, у тым ліку трое ў ізалятары КДБ у лютым сёлета.

Зьміцер шкадуе, што летась па сканчэньні школы нікуды не паступаў. Кажа, калі ня трапіць у турму, будзе паступаць у Віленскі пэдагагічны. «Займацца самаадукацыяй, канечне, добра, але хочацца і нейкага кантролю».

Хведарук — вернік, але пакуль ня вызначыўся з канфэсіяй. Шмат чытае — ад Кундэры да Караткевіча і нямецкай паэзіі. Займаўся футболам, быў капітанам каманды «Трактар» у сваім узросьце. Хварэе за ангельскі «Лідз».

Да магчымага прысуду ста-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

віцца спакойна, хаця пасьля дадае: «Хочацца яшчэ троху пажыць нармальным, а не турэмным жыцьцём. Мне ўсё ж не 28, як было Севярынцу, і не 25, як Дашкевічу».

## Аляксей Янушэўскі: Калі б далі паўгоду...

Аляксей Янушэўскі прыйшоў у «Малады фронт» у 2004 г., хаця жаданьне далучыцца да арганізацыі было яшчэ ў 2002. Кажа, гэта быў яго пратэст супраць таго, што адбывалася ў краіне — русіфікацыя, парушэньне правоў чалавека, палітычна матываваныя арышты і г.д.

Канчаткова павярнуў Аляксея ў нацыянальны рух NRM, дакладней, канцэрт гурту ў 2001 г. Янушэўскі прыйшоў на яго нават ня ведаючы, што гэта за гурт і што за музыку ён грае, а выйшаў сьвядомым беларусам. У тым жа 2001-м быў першы мітынг — Дзяды.

Школу скончыў у 2005 г., паступіў у пэдунівэрсытэт імя Максіма Танка на беларускую філялёгію. На пачатку 2006 г. яго выключылі. Летась зноў паступіў у пэдунівэрсытэт, толькі ў Віленскі. Зноў на беларускую філялёгію.

Аляксей гаворыць: «МФ» для мяне — гэта жыцьцё. Была запаветная мара туды ўступіць, калі я быў яшчэ 14-гадовым хлопчыкам. Гэта вялікая адказнасьць перад маімі продкамі, перад нашчадкамі, перад маім народам».

Лідэрскіх амбіцыяў Янушэўскі ня мае, лічыць сябе шарагоўцам.

Упершыню затрымалі Аляксея на Дзень Волі ў 2002 г., калі ён ішоў па праспэкце зь бел-чырвона-белым сьцягам. Хлопцу было пятнаццаць.

Перад выбарамі 2006 г. быў падазраваным у крымінальнай справе Фінькевіча, адсядзеў за кратамі паўтыдня.

Жыцьцёвыя каштоўнасьці вызначае наступным чынам: Бог — Бацькаўшчына — сям'я. Аляксей — уніят.

Кажа, калі даведаўся пра

**Працяг на старонцы 10.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Аляксей Янушэўскі.**

### Артыкул 193

Працэс «МФ» ужо чацьвёрты, калі да суду даходзіць справа ў абвінавачваньнях па 193–м артыкуле Крымінальнага кодэксу «Дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі». Артыкул у тэрміновым рэжыме прымаўся палатай прадстаўнікоў у сьнежні 2005 г. — напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў–2006. Ініцыятарам і натхняльнікам прыняцьця быў старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка.

Першым да суду за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі ў ліпені 2006 г. быў прыцягнуты жлобінскі «маладафронтавец» Эдуард Зелянкоў. Прадстаўнік пракуратуры на судзе патрабаваў для Эдуарда год пазбаўленьня волі. Аднак судзьдзя Шаўцоў даў хлопцу 30 базавых велічынь штрафу.

У жніўні мінулага году прысуды па 193–м атрымалі сябры «Партнэрства». Мікола Астрэйка, Цімох Дранчук, Эніра Браніцкая і Аляксандар Шалайка былі арыштаваныя яшчэ ў лютым, і ўвесь час да суду знаходзіліся ў ізалятары КДБ. 4 жніўня судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Леанід Есьман даў Астрэйку два гады турмы, Дранчуку — год, Браніцкай і Шалайку— па паўгоду арышту. Сёньня ўсе яны на волі.

Апошняй жа па часе ахвярай «сухарэнкаўскага» артыкулу стаў лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту» Зьміцер Дашкевіч. 2 лістапада 2006 г. судзьдзя Ала Булаш прысудзіла Зьмітру паўтара году турмы. Дашкевіч адбывае пакараньне ў шклоўскай калёніі.

# Працэс пяці

Працяг са старонкі 9.

крымінальную справу, нічога асабліва не адчуў. «Ну, скажам, страху дакладна не адчуў, бо практычна быў гатовы. Іншая справа, што гэта было даволі нечакана, я й дасюль ня веру, што ўлады змогуць асудзіць столькі моладзі», — кажа Аляксей.

24 красавіка А.Янушэўскі здолеў выехаць зь Беларусі. Ехаў праз Расею, Украіну, Польшчу. Прыкладна тым самым шляхам, як Алесь Казакоў і Зьміцер Зубро.

Цяпер Аляксей жыве ў Празе ў бацькі, які там працуе. Праўда, найбліжэйшым часам давядзецца перасяліцца ў інтэрнат для ўцекачоў — гэта неабходная ўмова, каб атрымаць у Чэхіі прытулак. У выпадку, калі яго справа ў Беларусі скончыцца штрафам ці ўмоўным пакараньнем, Янушэўскі зьбіраецца вярнуцца на Радзіму.

Аляксей кажа, што рашэньне пра ўцёкі давалася цяжка, хаця і з разуменьнем, што іншага выйсьця няма. «Зьехаў не празь сябе, я не зьбіраюся апраўдвацца, зьехаў праз «Малады фронт». Бо ў турме я рабіць тое, што я раблю тут, ня меў бы магчымасьці. Хаця, калі б мне, напрыклад, сказалі, што атрымаю дакладна шэсьць месяцаў, я б застаўся. Цяпер справа ідзе пра тое, каб уратаваць арганізацыю, таму й зьехаў. Функцыі, якія я выконваў у Беларусі, цалкам выконваю і тут», — кажа Янушэўскі.

## Алег Корбан: Кандыдат у палітыкі

Алег Корбан нарадзіўся 4 лютага 1985 г. у Менску. Ён старэйшы за ўсіх тых, хто 28 траўня паўстане перад судом. У 2000 г. Алег упершыню паўдзельнічаў у вулічнай акцыі апазыцыі — «Маршы Свабоды-2», там жа ўпершыню пачуў песьні NRM, менавіта гэтыя падзеі найбольш паўплывалі на Алега. Пасьля гэтага ён паўсюль пачаў размаўляць па-беларуску.

У «Малады фронт» Алег Корбан таксама прыйшоў раней за астатніх — увосень 2000 г., акурат напярэдадні парлямэнцкіх выбараў. «Я прыйшоў ва ўправу БНФ, дзе пабачыў Севярынца, — кажа Корбан. — Сказаў, што вось я хачу дапамагаць «Маладому фронту». Севярынец тады так натхніў мяне сваімі прамовамі, што болей ні пра якую іншую арганізацыю думаць не хацелася».

Пасьля сканчэньня сярэдняй школы, Алег паступіў у машынабудаўнічы ліцэй, скончыў яго. Летам 2004 г. паступіў на завочнае аддзяленьне юрыдычнага факультэту Міжнароднага гуманітарнага эканамічнага інстытуту. Алег кажа, што ў тыя гады менш актыўна браў удзел у дзейнасьці «МФ», у першую чаргу праз вучобу. У лютым 2006 г. Корбана выключылі з ВНУ за актыўны ўдзел у перадвыбарнай кампаніі. За некалькі дзён да гэтага ён быў асуджаны на 10 сутак арышту. Агулам Корбан адседзеў за кратамі 49 сутак.

Працаваў на менскім заводзе шасьцерняў, адкуль быў звольнены з-за ціску КДБ на кіраўніцтва. Сёлета ў студзені ўдзельнічаў у выбарах у мясцовыя саветы, па менскай 23-й Рафіеўскай акрузе, дзе заняў другое месца з трох, набраўшы 12,5% галасоў.

Сярод хобі Алега — турызм, ён аб'езьдзіў палову Беларусі. Быў багата дзе і ў Эўропе. Ён яшчэ ня лічыць сябе сапраўдным палітыкам, а толькі «кандыдатам у палітыкі». Разам з тым адзначае, што ў будучыні хацеў бы займацца якраз палітыкай.

У сакавіку 2006 г. на Корбана ўжо заводзілі крымінальную справу за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, але спынілі. Алег мяркуе, што так улада папярэджвала моладзь, каб тая спыняла змаганьне. Не атрымалася, таму справа і дайшла да суду. Корбан лічыць, што некага з «маладафронтаўцаў» абавязкова пасадзяць. Адносна сябе прагназуе, што атрымае паўгоду турмы.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Алег Корбан.

## Наста Палажанка: Жанчыне месца ў палітыцы

Наста Палажанка нарадзілася 2 жніўня 1990 г., яна адзіная няпоўнагадовая сярод фігурантаў крымінальнае справы. Палажанка яшчэ вучыцца ў школе, у дзясятай клясе.

Наста кажа, што шлях да беларушчыны найперш праходзіў праз самавыхаваньне. Чытаньне беларускіх кніжак, слуханьне песень беларускіх гуртоў. Уласна ў «Малады фронт» Наста трапіла ўвосень 2004 г., пасьля сьвяткаваньня ўгодак Аршанскай бітвы. «Там мы сустрэліся з хлопцамі з «Маладога фронту», якія і прывялі нас у арганізацыю, — кажа Наста. — Нас прыйшло тры дзяўчыны, на сёньня засталася я адна. Тады «МФ» падаваўся мне не да канца зразумелай арганізацыяй: ці то нейкі клюб аматараў беларушчыны, ці то сапраўдная палітычная партыя. Я вельмі ўдзячная Зьмітру Дашкевічу за маё далейшае знаходжаньне ў «МФ», бо калі я нешта не разумела, Зьміцер заўсёды цярпліва мне тлумачыў». Увогуле, для Палажанкі Дашкевіч — гэта прыклад шчырасьці ў палітыцы і жыцьці.

Наста мяркуе, што менавіта жанчына здольная прынесьці новую плынь у беларускую



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Наста Палажанка.**

палітыку, зачапіць паспалітага грамадзяніна. Кажа, што да крымінальнай справы нават ня думала, што ўсур'ёз можа заняцца палітыкай, цяпер не выключае такой магчымасьці. Што праўда, сябе ў ролі будучай прэзыдэнткі Беларусі не разглядае.

«У «Маладым фронце» я зразумела, што тут маё месца, што гэта мая сям'я, — гаворыць Наста. — Я вельмі задаволеная, што некалі прыйшла сюды. Галоўная наша задача — выхаваньне моладзі, праца зь людзьмі».

Палажанка расказвае, што яе і Хведарука палічылі нявартымі ўдзелу ў будучым Кангрэсе. «Нашы кандыдатуры нават не разглядаліся, — кажа яна. — Што ж, пэўна, ёсьць больш годныя людзі». Наста мяркуе, што нешта ў палітычным жыцьці краіны можа зьмяніць толькі вуліца, а яе галоўная задача не стаяць збоку, а дапамагчы гэтым працэсам.

Раней Палажанка актыўна займалася музыкай, была вакалісткай у рок-гурце. Цяпер праз грамадзкую дзейнасьць часу на музыку не застаецца.

Наста гаворыць, калі завялі крымінальную справу, жаданьня ўсё кінуць і заняцца сваім жыцьцём не было. Наадварот, тады яна зразумела, што назад дарогі няма. «Менавіта цяпер я, як ніколі раней, адчуваю, што такое людзкая салідарнасьць, падтрымка блізкіх і сяброў». Пры канцы размовы дзяўчына дадае: «Калі яны перасьледуюць менавіта нас, значыць, сапраўды нас баяцца».

## Барыс Гарэцкі: Ня веру ў турму

Барыс Гарэцкі ўжо другі раз знаходзіцца пад крымінальнай справай за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Першая справа была заведзеная адразу па выбарах 2006 г., але ўвосень яе спынілі. Як высьветлілася, толькі для таго, каб завесьці зноў.

Барыс прыйшоў у «Малады фронт» у 2001 г., 14-гадовым хлопцам, акурат перад «Чарнобыльскім Шляхам». У тым самым годзе была першая палітычная кампанія «Выбірай», зь якой Барыс аб'езьдзіў палову Беларусі.

Некаторы час Барыс працаваў на Чэрвеньскім рынку разам са Зьмітром Дашкевічам і Артурам Фінькевічам. Там у іх была невялікая фірма, якая гандлявала кавай і гарбатай. Галоўнай асаблівасьцю фірмы была беларуская мова. Прыкладна з часу ўладкаваньня на гэту працу Барыс пачаў паўсюль размаўляць па-беларуску. Фірма спыніла сваю працу толькі пасьля таго, як пасадзілі Дашкевіча.

У 2001 г. Гарэцкі прайшоў спэцыяльныя курсы і стаў дыджэем Адраджэньня. Гэта пазнавальная віктарына для школьнікаў і студэнтаў — галоўнае хобі Барыса на далейшыя гады. Гарэцкі кажа, што віктарыны праводзяцца і цяпер. «Настаўнікі па-ранейшаму клічуць у школы, нават ведаючы, што рызыкуюць працай», — кажа Барыс. Два разы на тыдзень Гарэцкі ходзіць у царкву, ён пратэстант.

Пасьля школы Б.Гарэцкі паступіў у політэхнічны каледж. Барыс мае матэматычны склад мысьленьня, у школах улюбёнымі прадметамі былі матэматыка і фізыка. Гаворыць, што менавіта прыхільнасьць да гэтых прадметаў часам дапамагае ў палітыцы.

З каледжу Гарэцкі быў адлічаны напярэдадні выбараў за ўдзел у акцыях пратэсту. Летам 2006 г. пасьля шматлікіх перакананьняў Барыс зьехаў па адукацыйнай праграме Каліноўскага ў Польшчу. Вучыўся на факультэце інфарматыкі Беластоцкага ўнівэрсытэту. Сёлета вярнуўся назад у Беларусь, бо «зразумеў, што працаваць трэба тут, асабліва калі на сяброў пачаўся крымінальны ціск».

Гарэцкі таксама адзначае, што «МФ» для яго — вялікая сям'я. Цяпер Барыс працуе ў штабе Аляксандра Мілінкевіча, ён хацеў бы ў «Маладым фронце» займацца менавіта палітычным складнікам. Гарэцкі кажа, што налета на парлямэнцкіх выбарах «МФ» зможа закрыць палову выбарчых акругаў.

Ён верыць, што ня трапіць у турму, застанецца на волі. «Страху няма ніякага», — кажа хлопец.

**Зьміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Барыс Гарэцкі.**

# Кангрэс партыйных сілаў

рызыкуе стаць дэманстрацыяй партыйных слабасьцяў.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Правядзеньне другога Кангрэсу дэмакратычных сілаў неаднаразова адкладалася. Першапачаткова плянавалася правесьці яго яшчэ перад Днём Волі, у сакавіку. Пазьней лідэр камуністаў Сяргей Калякін настойваў, каб Кангрэс адбыўся 21-22 красавіка — таксама ня выйшла. Урэшце, было прынятае рашэньне, што дэмакраты зьбяруцца 26-27 траўня, на гэты раз канчатковае.

Доўгі час не было яснасьці і з памяшканьнем, дзе адбудзецца Кангрэс. Ці дазволяць правесьці яго ў Менску? Улады трымалі паўзу. Разглядаліся варыянты за мяжой — Літва, Украіна, Расея. Аднак ужо ў сярэдзіне траўня з волі Лукашэнкі Кангрэс пагадзіўся прыняць Палац культуры МАЗу.

Асноўнае пытаньне Кангрэсу заключаецца ў тым, ці варта выбіраць на ім адзінага лідэра апазыцыі (на гэтым настойвае Мілінкевіч), ці кіраваць мусіць калегіяльная рада сустаршыняў у складзе пяці чалавек. Другі падыход перамог на рэгіянальных сходах удзельнікаў Кангрэсу.

А.Мілінкевіч адразу заявіў, што не зьбіраецца вылучаць кандыдатуру ў сустаршыні дэмакратычнай кааліцыі. Ён лічыць, што такі спосаб кіраўніцтва будзе азначаць для апазыцыі крок назад. Мілінкевіч зьбіраецца засярodзіцца на тварэньні «Руху «За Свабоду».

Разам з тым, А.Мілінкевіч ня будзе ігнараваць Кангрэсу. Палітык выступіць на ім з плянам стратэгіі дзеяньня апазыцыі. Стратэгію, якую прапануе Палітрада, Мілінкевіч лічыць малаэфэктыўнай. Ён будзе выступаць за прыняцьце стратэгіі «Эўрапейскай кааліцыі», якая прадугледжвае «больш актыўную працу зь людзьмі, правядзеньне вулічных акцыяў, а не кабінэтную працу».

Дэлегатамі другога Кангрэсу стануць актывісты апазыцыі, якія сёлета падчас мясцовых выбараў назьбіралі па 300 подпісаў у сваю падтрымку. Разам з тым, палітрада адмовіла ва ўдзеле ў Кангрэсе VIP-пэрсонам — пісьменьнікам, прадстаўнікам інтэлігенцыі, навукоўцам, палітзьняволеным, абаронцам Плошчы. Было адмоўлена ва ўдзеле «маладафронтаўцам» Насьці Палажанцы і Зьмітру Хведаруку, суд над якімі пачынаецца на наступны дзень пасьля паседжаньня. Гэта выклікала рэзкую крытыку Мілінкевіча, які назваў мерапрыемства «кангрэсам партыйных сілаў».

Паводле папярэдніх падлікаў, колькасьць прыхільнікаў Мілінкевіча складае меншасьць. Аднак на ягоным баку аўтарытэт вызваленых Паўла Севярынца і Міколы Статкевіча, якія рашуча падтрымліваюць прапановы экс-кандыдата ў прэзыдэнты. Высокі маральны аўтарытэт палітвязьняў будзе стрымліваць партыйных бонзаў.

Рэгістрацыя дэлегатаў і гасьцей пачнецца ў суботу 26 траўня а 9.00. Адкрыцьцё Кангрэсу заплянаванае на 13.00. З дакладамі мусяць выступіць Аляксандар Мілінкевіч, Сяргей Калякін, Анатоль Лябедзька, прадстаўнік Казуліна. Пазьней пачнуцца выступы дэлегатаў і гасьцей форуму А 20.00 скончыцца праца першага дня форуму.

Назаўтра праца пачнецца а 9.30. Будзе галасаваньне адносна стратэгіі і праграмных дакумэнтаў дэмсілаў, будзе зацьверджаная палітрада. А 15-й Кангрэс скончыць працу.

Праз супярэчнасьць пазыцый гэты Кангрэс мае мала шанцаў вырашыць прынцыповыя мэты. Калі палітычным лідэрам удасца зацугляць уласныя амбіцыі і стрымаць сваіх прыхільнікаў ад эскаляцыі ўнутрыкааліцыйнага канфлікту, гэта ўжо можна будзе лічыць посьпехам.

**Зьміцер Панкавец**

**У пяці нянек...**

**За тры дні да Кангрэсу арганізатары яшчэ нават не ўзгаднілі канчатковы сьпіс гасьцей. «На папярэднім Кангрэсе гэта вызначаў Аргкамітэт, а цяпер гэтую функцыю ўзяла на сябе Палітрада, — тлумачыць старшыня аргкамітэту Аляксандар Бухвостаў. — І яшчэ ня ўсе суб'екты перадалі свае прапановы».**

## Уладзімер Арлоў: Гэта раскольніцкі Кангрэс

Уладзімер Арлоў пра Кангрэс дэмакратычных сілаў: «Калі папярэдні Кангрэс дэмакратычных сілаў быў аб'яднаўчым, то гэты будзе раскольніцкім. У асобе Мілінкевіча Беларусь пабачыла свабодны эўрапейскі твар, што, як выглядае, зусім не даспадобы некаторым іншым гэтак званым лідэрам апазыцыі».

**Запісаў Арцём Лява**

# Разам супраць вялікага д’ябла: Ахмадынэджад у Беларусі

У сухой астачы ад такіх візытаў застаецца піяр для ўнутранага спажываньня. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**



AFP

«Ваш вельмі апэратыўны прыезд у Беларусь у хуткім часе пасьля майго візыту ў Іран сьведчыць аб тым, што ў нас усталяваліся дачыненьні стратэгічнага партнэрства». Вось такі сылягізм прагучаў з вуснаў беларускага афіцыйнага кіраўніка на сустрэчы з іранскім калегам.

«Стратэгічнае партнэрства» з Іранам, між тым, вымяраецца болей чым сьціплай лічбай 35,5 мільёна даляраў — такі быў леташні тавараразварот. Дзеля параўнаньня: беларускі гандаль зь Нямеччынай летась дасягнуў $2,423 мільярда. Гэта ў 68 разоў болей. Во дзе дэ-факта абсяг нашых стратэгічных інтарэсаў! Але ж чортава Эўропа тыцкае правамі чалавека! А вось сябар Ахмадынэжад у гэтым сэнсе без прэтэнзіяў.

Высокі госьць заявіў, што лічыць Лукашэнку адным з найлепшых сяброў і што стасункі між дзьвюма краінамі маюць «вялікі патэнцыял на доўгатэрміновую пэрспэктыву».

Там, дзе зашмат рыторыкі, звычайна бракуе рэальнага плёну. Вось і кіраўнікі дзяржаў падпісалі пераважна дэклярацыйныя або рамкавыя двухбаковыя дакумэнты. Між тым, Эўропа сапраўды магла б даць нам крэдыты, інвэстыцыі, найноўшыя тэхналёгіі. Але гэтыя бонусы магчымыя толькі ў абмен на паступовае выкананьне леташніх 12 умоваў. Нам гэта не пад нос! У выніку Менск выбірае іранскую тэхналягічную «асятрыну другой сьвежасьці» кшталту зборкі «Самандаў» — копіі далёка не апошняй мадэлі «Пэжо». Нават Лукашэнкаў малодшы сын ацаніў «Саманды» без залішняй паліткарэктнасьці: «Гэта дыхтоўная ВАЗаўская «дзявятка». Цана 12500 даляраў мне падаецца завышанай. Спадзяюся, яшчэ дапрацуюць».

Мала хто ведае, што ў самім Іране — ліміты на бэнзын.

Як сказаць... Адмыслоўцы сьцьвярджаюць, што праект зборкі ў нас «Самандаў» фактычна ўжо ляснуўся. «Скакун» (так перакладаецца з фарсі «Саманд») зламаў нагу на самым старце. Увогуле, каб аўтазборка была рэнтабэльнай, трэба рабіць сто тысячаў легкавікоў за год. У нашай жа краіне ўвесь рынак новых аўто склаў летась дзесяць тысячаў.

«Іран і Беларусь — ня тыя краіны, якія могуць дапамагчы адна адной рэальна», — зазначыў у размове са мной палітоляг Андрэй Фёдараў. На яго думку, тэарэтычна сфэры супрацы ёсьць. Але ўсё гэта цяжка ўвасобіць у жыцьцяздольныя праекты. Бо, напрыклад, нафтаздабыча ў Іране вымагае шматмільённых укладаньняў. «Зь іншага боку, мала хто ведае, што ў Іране — ліміт на бэнзын, — кажа Фёдараў. — Не стае магутнасьцяў нафтаперапрацоўкі! Але Беларусь і ўласныя НПЗ мусіць мадэрнізаваць з замежнай дапамогай, так што дапамагчы Тэгерану разьвіваць гэтую галіну нам наўрад ці пад сілу».

Так што, рэзюмуе экспэрт, у сухой астачы ад такіх візытаў застаецца піяр для ўнутранага спажываньня.

Карацей, шараговым пэрсам і беларусам даводзяць, што байкі пра міжнародную ізаляцыю — гэта выдумкі «вялікага д’ябла». Так Ахмадынэжад называе Амэрыку ў сваім інтэрнэт-дзёньніку.

# Сход сам сябе замінаваў

Міліцыя шукае «тэлефоннага тэрарыста», які ледзь не сарваў устаноўчы сход «Руху за свабоду» ў Горадні. Рабочыя вэрсіі: гэта або апазыцыянэр, або беларускі паляк. Піша **Ірына Чарняўка**.


PHOTO.BYMEDIA.NET

«Ну каму гэта трэба?! Вось патэлефанаваў чалавек, па-беларуску гаварыў — хто гэта можа быць?! — даводзіў Мілінкевічу і дэлегатам сходу супрацоўнік міліцыі. — Можа, гэта ваш хтосьці, абазьліўся на вас?»

«Невядомы зламысьнік» пазваніў а 10.10 з тэлефоннага аўтамата. Намесьнік начальніка аддзелу дазнаньня Ленінскага РУУС Павал Койта пацьвердзіў, што, згодна з запісам паведамленьня пра замінаваньне, гэта — мужчына, які гаварыў па-беларуску. Цяпер сьледзтва вывучае дзьве вэрсіі: гэта была альбо «п'яная выхадка», альбо «асабістая непрыязь».

Сьледзтва мяркуе, што «асабістая непрыязь» магла ўзьнікнуць ў кагосьці з апазыцыі, хто хацеў сарваць устаноўчы сход «Руху «За свабоду», альбо ў навучэнца, які хацеў сарваць трэці этап іспытаў на польскі атэстат.

Абодва мерапрыемствы, і устаноўчы сход, і іспыт, праходзілі ў нядзелю ў будынку на Будзённага, 48а. Першы ў офісе Таварыства Беларускай Школы (ТБШ), другі — у памяшканьні арганізацыі «Polska Macierz Szkolna» — дзьверы ў дзьверы.

## Сход

Аляксандар Мілінкевіч і больш за 70 дэлегатаў устаноўчага сходу «Руху «За свабоду» з усіх рэгіёнаў Беларусі якраз скончылі рэгістрацыю ўдзельнікаў. А 10.40 у офіс ТБШ увайшоў падпалкоўнік міліцыі з чалавекам у цывільным і заявіў, што будынак замінаваны, таму ўсе прысутныя павінны «пакінуць памяшканьне». За іх сьпінамі маячыў міліцэйскі апэратар зь відэакамэрай.

Дэлегаты сустрэлі прапанову міліцыі сьмехам, прапанавалі даць пісьмовую згоду на тое, каб заставацца ў «замінаваным» будынку. Пасьля зачыніліся і пад грукат міліцэйскіх кулакоў у дзьверы імкліва, хвілінаў за 30—40, вырашылі ўсе пытаньні парадку дня.

За апошні дзясятак гадоў, гэта быў бадай, самы хуткі і прадуктыўны сход апазыцыі. Статут грамадзкай праваабарончай арганізацыі «Рух «За свабоду» быў зацьверджаны. Яе кіраўніком абраны Аляксандар Мілінкевіч. Намесьнікамі — белаазёрац Юры Губарэвіч і Віктар Карняенка з Гомеля. Пасьля гэтага дэлегаты «пакінулі памяшканьне», і пачалося «разьмінаваньне». Праўда, калі вайсковыя сапёры паспрабавалі адразу ж праверыць памяшканьне ТБШ, іх спынілі супрацоўнікі міліцыі: «Гэта правяраем апошнім».

## Іспыт

Іспыт у памяшканьні «Polska Macierz Szkolna» быў апошнім з трох іспытаў на польскі атэстат, яго праходзілі каля сотні маладых беларусаў польскага паходжаньня, якія зьбіраюцца паступаць ў ВНУ суседняй краіны. Каля дзьвярэй іх чакалі бацькі, чалавек сорак. Іспыт ледзь ня быў сарваны «разьмінаваньнем», але Фарны касьцёл прадаставіў у экстранай сытуацыі сваё памяшканьне.

Спраўдзіць вэрсію, што «замінаваў» будынак нехта з навучэнцаў, адсеяных на ранейшых этапах іспыту, сьледчыя маглі б проста — сёлета такіх было толькі два чалавекі. Аднак у «Polska Macierz Szkolna» ніхто па гэтыя зьвесткі дагэтуль не зьвяртаўся. Ды і «разьмінаваньне» ў іх шасьціпакаёвым памяшканьні было даволі павярхоўным — усяго хвілінаў пятнаццаць, кажуць работнікі арганізацыі.

## Ці абясшкодзілі «міну»?

У «разьмінаваньні» будынку бралі ўдзел падразьдзяленьні ўсіх сілавых ведамстваў: УУС, ДАІ, МНС, «Аховы», групы разьмінаваньня. КДБ афіцыйна не называецца, але ўвесь час побач зь міліцыянтамі ды сапёрамі былі людзі ў цывільным, якія заходзілі ва ўсе кабінэты. Напрыклад, у «Polska Macierz Szkolna» чалавека ў цывільным больш за ўсё зацікавілі тэчкі з дакумэнтацыяй ды стосы польскамоўных падручнікаў.

Будынак на Будзённага, 48а быў апячатаны, ачапленьне зьнялі толькі а 8-й раніцы ў панядзелак. Паводле афіцыйнага паведамленьня, сапёры праверылі ўсе 198 офісаў. Аднак у памяшканьні ТБШ яны не працавалі — прынамсі, так, як гэта прадугледжана працэдурай, з прысутнасьцю кіраўніка арганізацыі.

Раней тактыка фіктыўных «званкоў пра замінаваньне» выкарыстоўвалася для зрыву сходаў дысыдэнтаў у іншых рэгіёнах краіны.

# Сьпёка б’е рэкорды

22 траўня быў пабіты шматгадовы рэкорд тэмпэратуры паветра. Папярэдні быў зафіксаваны ў Горадні ў 1950 г.

Рэкорд быў пабіты амаль ва ўсіх гарадах Беларусі: Лельчыцах (+31.3°C), Васілевічах (+31.2°C); Гомелі (+31.1°C), Жыткавічах (+30.9°C), Івацэвічах (+30.8°C), Лідзе (+30.7°C), Брагіне, Мазыры, Слуцку, Жлобіне (+30.5°C), Пінску (+30.4°C).

На выходных — чаргповы віток сьпёкі. Антыцыклён з Заходняй Эўропы прынясе сьпякотнае сухое паветра. На выходных таксама будзе да 32, а ў нядзелю аж да 34 градусаў гарачыні.

**АК**




**Выстава ўзбраеньняў «Milex-2007» прайшла 22–25 траўня ў выстаўным цэнтры «Белэкспа». Прадукцыю выставілі 135 экспанентаў зь Беларусі, Расеі, Украіны і Швэцыі. Былі 50 дэлегацый з розных краін. Быў і Махмуд Ахмадынэджад, а міністар абароны Сірыі прыцэньваўся да беларускіх зэнітных комплексаў.**

## Студэнты беларусізавалі журфак БДУ

Студэнты правялі Дзень беларускай мовы. Першы курс распытваў выкладчыкаў пра самае мілагучнае слова ў мове. Найбольш выбітныя цытаты зьявіліся на афішах. У сам дзень было вырашана размаўляць выключна пабеларуску. Нават супрацоўнікі сталоўкі й ахова прынялі ўмовы. Арганізавалі вечарыну «Патэльня каханьня». На ёй гучалі беларускія песьні, вершы, ладзіліся сярэднявечныя танцы.

Цікавасьць выклікаў конкурс сярод кіраўніцтва факультэту (дэкан С.Дубовік і намесьнікі). Удзельнікам прапаноўвалі абраць бульбу і выразаць зь яе сардэчка.

Усім удзельнікам раздаваліся прызы — цукеркі і дыскі са «Шрэкам-2» і «Маленькай каляднай казачкай». Завяршыўся Дзень дыскатэкай.

**Паводле «Звязды»**

## Яшчэ адзін незаменны

Прэзыдэнт Казахстану падпісаў папраўкі ў канстытуцыю, якія скарачаюць тэрмін прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў да пяці гадоў і здымаюць абежаваньні на колькасьць тэрмінаў для першага кіраўніка дзяржавы.

Парлямэнт Казахстану прыняў тыя папраўкі.

## Страйк у Варнянах

У сельскім кааперэтыве «Варняны» (Астравеччына) два дні доўжыўся страйк мэханізатараў. У ім бралі ўдзел 43 чалавекі ў першы дзень, 24 — у другі. Хоць дні страйку залічваліся як прагул, большасьць бастуючых ня выехала на працу і ў другі дзень.

Людзі пратэстуюць супраць жорсткага стылю кіраваньня, нявыплаты прэмій і ўразаньня заробкаў, якія практыкуе кіраўніцтва СПК «Варняны». Мэханізатары патрабавалі, каб старшыня кааперэтыву Ўладзіслаў Рук напісаў заяву аб звальненьні.

**МБ**

## Паменшацца памежныя зоны

«Мы самі цудоўна разумеем і бачым, што там знаходзяцца гістарычныя і культурныя аб’екты, цудоўныя месцы адпачынку, куды нашы грамадзяне ня могуць трапіць праз залішняе зарэжымліваньне гэтых зонаў», — заявіў на прэс-канфэрэнцыі новы старшыня Дзяржкамітэту памежных войскаў Ігар Рачкоўскі.

Межы зонаў звузяцца да памеру сельсавету, да 6—8 км уздоўж мяжы.

**АГ**

## Румынія вярнула прэзыдэнта

У Румыніі на выходных прайшоў рэфэрэндум, падчас якога вырашалася, ці прэзыдэнт Траян Басэску, якога парлямэнт абвінаваціў у «парушэньні канстытуцыі», застанецца на пасадзе прэзыдэнта. Аж 74% выбарцаў падтрымалі прэзыдэнта. Басэску прыйшоў да ўлады ў выніку своеасаблівай «аранжавай рэвалюцыі», скіраванай супраць карумпаванай палітычнай эліты краіны.

**ВД**

# Мэнтальная нястраўнасьць

Беларусь на тле канфрантацыі Масквы з Захадам пасьля саміту ў Самары. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Буш у інтэрвію «Ройтэрз» выступіў з беспрэцэдэнтна рэзкай крытыкай палітыкі Пуціна. Перад гэтым у Самары з трэскам праваліўся саміт «Расея — Эўразьвяз». Трохі раней няўдачай скончыўся вояж у Маскву Кандалізы Райс. А на 9 траўня Пуцін фактычна правёў паралель між ЗША і Трэцім райхам.

Што гэта — прэлюдыя да новай халоднай вайны? І ці выйграе ад гэтага трэнду афіцыйны Менск?

Дык вось, амэрыканскі прэзыдэнт выказаў сумнеў, што сябар Уладзімер вядзе краіну ў бок дэмакратыі. Адносіны Расеі з Захадам Буш без эківокаў назваў напружанымі. А сярод іншага — во на які ўзровень пытаньне выйшла! — закінуў Маскве і дыскрымінацыю польскага мяса.

Далося ў знакі гэтае мяса! Фармальна праз яго атрымаўся безвыніковым і саміт у Самары. Варшава, якую страшэнна пакрыўдзіла эмбарга, на знак помсты блякуе заключэньне новай дамовы паміж Расеяй і Эўразьвязам.

Між іншым, Польшчы ёсьць за што змагацца. Раней яна прадавала ў Расею мяса на 350 мільёнаў эўра за год (прыкладна столькі каштуюць гандлёвыя прэфэрэнцыі Эўразьвязу для Беларусі). Масква закінула палякам тое, што яны гоняць пад выглядам свайго прадукту ці не індыйскую буйваляціну.

Хаця мяса, нібыта не адпаведнае санітарным нормам, — толькі падстава. Тут у Масквы нястраўнасьць іншага кшталту. У прыватнасьці, Крэмль разьюшыла роля Варшавы ў пераменах ва Ўкраіне. І роля Вільні таксама, дарэчы. Ці выпадкова перасохла неўзабаве труба «Дружбы» ў кірунку Мажэйкаўскага НПЗ?

Карацей кажучы, Крэмль ня можа зьмірыцца, што колішнія краіны сацлягеру і нават былыя «малодшыя сёстры» ня толькі выпалі са сфэры ўплыву, але і паказваюць палітычны нораў. Каса на камень. Асабліва крыўдна, што са старой Эўропай з абліччам а-ля Шродэр амаль што было паразумеліся, гешэфты ладзіць пачалі, а тут, халера іх бяры, вылезьлі нейкія палякі!


REUTERS
**Ангела Мэркель і Ўладзімер Пуцін.**

Ад шэрагу аналітыкаў можна пачуць: расейскія вярхі наўмысна раскручваюць антызаходнія настроі перад хуткімі выбарамі Думы і прэзыдэнта. На тле канфрантацыі лягчэй адкідаць прэтэнзіі Захаду да «кіраванай дэмакратыі» крамлёўскага разьліву.

Менскі палітоляг Андрэй Фёдараў схільны глядзець на калізію шырэй. Рэч ня столькі ў перадвыбарных гульнях, колькі ў паглыбленьні каштоўнаснага канфлікту між цяперашнім расейскім рэжымам ды заходняй дэмакратычнай супольнасьцю.

Беларускія дзяржаўныя мэдыі камэнтуюць няўдалы вояж Райс ды правал саміту ў Самары з кепска прыхаванай зласьлівасьцю. У сваім верхаглядзтве яны не заўважаюць драматызму моманту для нашай краіны. Аб'ектыўна акурат цяпер узмацніліся чыньнікі збліжэньня з Эўропай. Масква сама, калі хочаце, туды Беларусь падштурхоўвае! Хаця б такі штрых: праз дыскрымінацыю польскага мяса затаварыліся і нашыя мясакамбінаты, не атэставаныя грознымі расейскімі правяральнікамі. У нашых інтарэсах, каб нафта і газ ішлі з Азіі ў Эўропу ў абыход Расеі (хаця айчынная прапаганда бязглузда радуецца таму, што высілкамі Крамля быў скамечаны энэргетычны саміт у Кракаве). Хіба мы ня зьведалі, што такое нафтагазавы шантаж, якога так баіцца Эўразьвяз?

Шлях у Эўропу блякуецца мэнтальнасьцю сёньняшняй улады. Заходнія каштоўнасьці як у Маскве, так і ў Менску выклікаюць ідэалягічную нястраўнасьць. Затое хто-колькі тут пацірае рукі, калі Райс фігуральна б'ецца галавой аб крамлёўскую сьцяну, Буш сварыцца на Пуціна, а на саміце ў Самары расейскі прэзыдэнт скубецца з Мэркэль. І калі «пуцінскія хунвэйбіны» пасьля аблогі эстонскай амбасады у Маскве пераключаюцца на прадстаўніцтва Эўракамісіі.




Анталёгія «Жанчыны выходзяць з-пад кантролю: беларускае жаночае апавяданьне».

Творы найлепшых сучасных аўтарак. Прадмова Іны Кулей.




Андрэй Хадановіч. Сто лі100ў на tut.by

Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.




Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі




Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў




Бабілёнская бібліятэка.
Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы»




Сямён Печанко. У Беларускім войску.
(Падарунак прызыўніку)




Найясьнейшая Рэч Паспалітая.
Цывілізацыя–Культура–Рэлігія–Палітыка–Авантура–Героіка–Успамін




# Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна

Кнігу склалі апавяданьні і дэтэктыўная аповесьць адчайнай пісьменьніцы з нашаніўскай жаночай лігі.




Застаемся!
Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае

з ь б я р ы « К н і г а р н ю « Н а ш а Н і в а »

# Глядзіце, хто пайшоў!

Піша **Віталь Тарас.**

У сярэдзіне траўня амаль адначасова прыйшлі два паведамленьні пра адстаўкі з высокіх пастоў, якія фармальна адбудуцца пры канцы чэрвеня, з розьніцай усяго ў адзін дзень. Абедзьве будуць мець значныя наступствы для міжнароднай палітыкі. Толькі заяву Тоні Блэра пра адстаўку з пасады лідэра Лейбарысцкай партыі, а значыць — і прэм’ер-міністра Вялікай Брытаніі, чакалі ўжо даўно. А вось вымушаная адстаўка прэзыдэнта Ўсясьветнага банку Пола Вулфавіца выглядала сэнсацыйнай. Вулфавіц хоць і прызнаў свае памылкі, да апошняга часу адмаўляўся сыходзіць з пасады добраахвотна. Але галасаваньне рады дырэктараў УБ вісела над ім дамоклавым мячом, і прэзыдэнт банку абвясьціў пра свой «добраахвотны сыход».

## Пол і Тоні

Пяцідзесяцічатырохгадовы Тоні Блэр і шасьцідзесяцідвухгадовы Пол Вулфавіц абсалютна не падобныя. Адзін нарадзіўся ў шатляндзкім Эдынбургу ў сям’і юрыста. Другі нарадзіўся ў Нью-Ёрку ў сям’і матэматыка — габрэйскага эмігранта з Польшчы.

І хаця для абодвух палітыка сталася галоўнай справай жыцьця, у іх ад самага пачатку былі зусім розныя матывы, мэты, стыль і манера паводзінаў. Дастаткова згадаць скандальны выпадак з Вулфавіцам, калі ён падчас наведваньня мячэці мусіў зьняць чаравікі, і ўсе ўбачылі, што ў яго дзіравыя шкарпэткі. Уявіць сабе падобную гісторыю з заўсёды апранутым паводле моды, франтаватым і адначасова прывабным Блэрам проста немагчыма.

Блэр застаўся ня толькі самым маладым у гісторыі Вялікай Брытаніі прэм’ерам (ён прыйшоў да ўлады ўсяго ў сорак чатыры), але, бадай, самым папулярным. Яму не хапіла пары гадоў, каб дагнаць кансэрватарку Маргарэт Тэтчэр паводле працягласьці прэм’ерства. Але тройчы запар перамагчы на ўсеагульных выбарах лейбарыстам да Блэра не ўдавалася ніколі. Пры ім эканоміка Англіі дэманстравала стабільны рост, зьменшылася беспрацоўе, пашырыўся доступ да адукацыі. Не ў апошнюю чаргу праз актыўную ролю й пасярэдніцтва Блэра ўдалося дасягнуць доўгачаканага палітычнага ўрэгуляваньня ў Паўночнай Ірляндыі.

Вулфавіц, які некалькі разоў займаў пост намесьніка міністра абароны ЗША, лічыўся клясычным «ястрабам» у палітыцы. Ня меншым ястрабам, чымся ягоны непасрэдны шэф — Доналд Рамсфэлд. Вулфавіц быў адным з галоўных распрацоўнікаў амэрыканскай вайсковай стратэгіі ў Іраку, а таксама адным з архітэктараў канцэпцыі глябальнай вайны з тэрарызмам (калі тут падыходзіць слова «архітэктар»).

Вайна ў Іраку стала самым непапулярным «эпізодам» у палітычнай кар’еры Тоні Блэра, які ў сакавіку 2003-га цалкам падтрымаў прэзыдэнта Джорджа Буша-малодшага ў вайсковай апэрацыі супраць Хусэйна. І хаця летась частка брытанскага кантынгенту была выведзеная зь Іраку, папулярнасьць лейбарыстаў і асабіста Блэра сярод брытанскіх выбарцаў за гады іракскай вайны адчувальна зьменшылася. Пацыфісты нават прыдумалі яму крыўдную мянушку – «пудзель Буша».

Але тая самая вайна каштавала кар’еры і Вулфавіцу. У 2005-м, калі празь няўдачы ў Іраку пачала траціць папулярнасьць адміністрацыя Буша, ён быў адпраўлены ў адстаўку. Праўда, адстаўку больш чым ганаровую: узначаліў Усясьветны банк.

Гэтая міжнародная фінансавая інстытуцыя дапамагла вельмі многім краінам у эканамічным разьвіцьці і карыстаецца высокім аўтарытэтам ва ўсім сьвеце. З банкам супрацоўнічае сёньня і ўрад Беларусі. УБ нядаўна вылучыў 50 млн даляраў на пераадоленьне наступстваў Чарнобылю.

## На скрыжаваньні палітыкі й маралі

Менавіта вайна ў Іраку міжволі скрыжавала біяграфіі гэтых двух абсалютна неардынарных асобаў у сучаснай палітыцы, якія жывуць па розныя бакі Атлянтыкі, патрапіла ў абодвух рыкашэтам.

Але ёсьць яшчэ адзін важны момант, які дазваляе разглядаць абедзьве адстаўкі ў адным ключы. Гэта маральны фактар. У 2006 годзе ўспыхнуў скандал, калі стала вядома, што лейбарысты падчас выбарчай кампаніі сталі прымаць ня толькі прыватныя ахвяраваньні (гэта паўсюдная практыка для палітычных партыяў на Захадзе), але ж і браць пазыкі ў буйных прадпрымальнікаў. Апошнія ў абмен нібыта атрымлівалі пасады лордаў, званьні рыцараў і г.д. Блэра некалькі разоў выклікалі ў сувязі з гэтымі абвінавачаньнямі на допыты ў пракуратуру. І хаця доказаў віны ці хаця б датычнасьці прэм’ера да скандалу не было, лідэр лейбарыстаў вырашыў узяць адказнасьць за лёс сваёй партыі на сябе і заявіў пра будучую адстаўку. Калі ён абвясьціў яе перад выбарцамі сваёй акругі, побач зь ім была ягоная каханая жонка.

Пол Вулфавіц на той момант, калі ён перайшоў на працу ва ЎБ, быў ужо ў разводзе. Супрацоўніца банку Шаха Рыза, якая была палюбоўніцай Вулфавіца, зрабілася ягонай падначаленай. Гэта ўжо само па сабе пярэчыла этычным нормам карпарацыі. Але Вулфавіц яшчэ й выкарыстаў сваё службовае становішча для таго, каб падвысіць сваёй падначаленай аклад да 193 590 даляраў у год. Гэта больш, чымся ў дзяржсакратара ЗША Кандалізы Райс.



**Пол Вулфавіц выходзіў на людзі ў дзіравых шкарпэтках.**



REUTERS

**Тоні Блэр адразу пасьля таго, як даведаўся пра тэракты ў Лёндане. 2005 г.**

І нашмат менш, дадамо, чымся ў шмат якіх банкаўскіх работнікаў альбо чыноўнікаў у якой-небудзь Расеі, напрыклад. Для крутога расейскага ці нават і беларускага бізнэсоўца 16 тысяч на месяц — гэта не мяжа.

Але такі вось дзіўны народ, як выявілася, працуе, ва Ўсясьветным банку, які можа выдаваць шматмільярдныя крэдыты цэлым краінам. Шчодрасьць новага шэфа ў дачыненьні да ягонай падначаленай не была ацэненая выканаўчымі дырэктарамі ўстановы, якія яшчэ нядаўна аднагалосна прызначалі Вулфавіца яе прэзыдэнтам. Між іншым, заступаючы на пасаду, ён абяцаў у першую чаргу змагацца з… карупцыяй.

Апраўданьні Вулфавіца, быццам ён ня ведаў правілаў карпарацыі, у якую прыйшоў працаваць, гучаць, мякка кажучы, непераканаўча. У ЗША, дзе так зацята змагаюцца з усімі відамі полавай дыскрымінацыі, выкарыстаньнем полавай прыналежнасьці ў службовых мэтах ды й проста забараняюць «шуры-муры» на працы, падобныя апраўданьні выглядаюць, дальбог, наіўнымі.

Кажуць, што Вулфавіц зусім ня меў прафэсійнага досьведу й здольнасьцяў, каб заняць самую высокую пасаду ва Ўсясьветным банку. Але гэта не зусім так. Ён пачынаў адукацыю на факультэце матэматыкі. Акрамя таго, у яго ёсьць досьвед у распрацоўцы ядравай стратэгіі, у кіраваньні вялікімі калектывамі.

Але ж прафэсійныя якасьці тут не дапамаглі. Не дапамагло ні прызнаньне Вулфавіца ў дапушчаных памылках, якія ён абяцаў выправіць ударнай працай, ні падтрымка прэзыдэнта ЗША. Нават выключная роля Злучаных Штатаў у міжнароднай фінансавай палітыцы, якую падрываў гэты банкаўскі скандал, ня стала вырашальным фактарам.

Калі Вулфавіца дэманстратыўна не ўлучылі ў сьпіс запрошаных на міжнародную канфэрэнцыю па праблемах Афрыкі, той публічна заявіў, што сыходзіць.

Цікава, што ў прэсе адразу зьявіліся чуткі, быццам Блэру ў будучым могуць прапанаваць пасаду прэзыдэнта Ўсясьветнага банку.

## Адстаўка як самагубства

Як бы там ні было, ясна, што Тоні Блэр са сваімі здольнасьцямі, заслугамі перад брытанцамі ды абаяньнем не прападзе. Напэўна, і Вулфавіц зможа ў далейшым пракарміць і сябе, і сваіх дзяцей, і Шаху Рызу.

А ці можна ўявіць сабе падобную сытуацыю ў нас? Зразумела, як і трэба было чакаць, абедзьве гісторыі былі выкарыстаныя дзяржаўнымі СМІ напоўніцу. Яны абсмокваліся ў прэсе як знак разлажэньня заходняга грамадзтва. Калі ўжо на самым версе можна сустрэць падобных амаральных тыпаў, дык што ўжо гаварыць пра астатніх?

Між тым, Блэр павёў сябе ў вышэйшай ступені карэктна і тактоўна пасьля гібелі прынцэсы Дыяны. Сытуацыя для каралеўскай сям'і, брытанскай каралевы ды нават у цэлым для ўсяго ангельскага грамадзтва была тады блізкай да крытычнай. І ў гэтай сытуацыі Блэр праявіў сябе як сапраўдны джэнтэльмэн, які ўратаваў гонар каралевы.

Ды й сам ягоны сыход у адстаўку, калі прэм'ер-міністар дае магчымасьць праявіць сябе на новай пасадзе свайму старому сябру і — што там хаваць — шматгадоваму спаборніку Гордану Браўну, сыход на ўзьлёце бліскучай кар'еры… Хіба гэта ня прыклад высакароднай і адказнай пазыцыі моцнага палітыка й чалавека?

Вулфавіц павёў сябе куды менш прыстойна. Але ж і ён вымушаны быў пайсьці ў адстаўку. І ня проста пад ціскам дырэктараў банку. А пад ціскам грамадзкасьці, інтарэсы якой заўсёды прадстаўляе прэса. Не які-небудзь асобны орган, а прэса ў цэлым, як зьява, ад якой палітык нікуды не схаваецца.

Няма сэнсу нават параўноўваць сытуацыю з гучнымі адстаўкамі на Захадзе (якіх было й будзе яшчэ шмат у сучаснай гісторыі) і сытуацыю ў нашай краіне. Яны прынцыпова адрозьніваюцца, паколькі на высокія пасады, паводле савецкай традыцыі, не абіраюць, а толькі прызначаюць. І якую б гнюснасьць ні зьдзейсьніў намэнклятурны чыноўнік (калі толькі вышэйшай асобе ня прыйдзе да галавы зрабіць публічную дэманстрацыю публічнага пакараньня якога-небудзь міністра), пакараньнем яму будзе ў горшым выпадку паніжэньне ў пасадзе. Засунуць куды-небудзь, дзе да злачынцы не дабяруцца журналісты і дзе можна перачакаць да лепшых часоў, — вось і ўсё пакараньне.

Добраахвотная адстаўка, тым больш з маральных прычынаў, успрымаецца супольнасьцю чыноўнікаў амаль як самагубства. Таму тым, хто рашыцца на яе, альбо адмовіцца ад пасады, дараваньня чакаць не даводзіцца. Мы ведаем шмат выпадкаў, калі высокапастаўленыя дзяржаўныя чыноўнікі, пазбаўленыя пасадаў, пераходзілі ў апазыцыю. Выпадкаў, калі чыноўнік сыходзіў у адстаўку добраахвотна, — адзінкі. Паводзіць сябе па-людзку ў нас лічыцца подзьвігам. Ня толькі на высокай пасадзе. У звычайным паўсядзённым жыцьці таксама.

Таму ў нас і не было пакуль свайго Блэра. І нават Вулфавіца.



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Адбываў высылку ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны. 22 траўня выйшаў на волю.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Сумленная дэмакратыя

— Чуеш, Паша, калі ўжо возьмеш у сваю партыю? — пытаюцца вяскоўцы. — Як там яна, кажаш, *хрысьціянска-дэмакратычная*? Ну, «дэмакратычная» — ясна, а «хрысьціянская» — што, у царкву хадзіць трэба?

Тлумачу: калі хочаш мяняць краіну — трэба пачынаць мяняцца самому. Разьвітацца з п’янствам, блудам, крадзяжом, хлусьнёй, верыць у Бога і любіць блізкага. Хрысьціянская дэмакратыя — гэта палітыка сумленьня.

— Палітыка… сумленьня?!.. — суразмоўнікам відавочна падаецца абсурдным само спалучэньне словаў. — Хто ж тады да вас пойдзе? *Ва ўласьці* ж задача — хапнуць. Гэтыя нахапаліся, а тыя яшчэ хочуць, ну і тэ дэ. А абяшчаюць усе, дурыць мастакі. Якое там, у вярхах, сумленьне?..

Сіценскае пытаньне — у самую кропку.

Ці магчымая ў Беларусі палітыка сумленьня? Маральная дэмакратыя?

Роўна 90 гадоў таму, 25 траўня 1917 г. 30 маладых каталіцкіх сьвятароў у Менскім катэдральным касьцёле абвесьцілі: магчымая. І заснавалі Хрысьціянскую Дэмакратычную Злучнасьць — першую беларускую хрысьціянска-дэмакратычную партыю.

Разгортваньне нацыянальнага руху ў эпоху войнаў і рэвалюцыяў вымагала ад беларусаў кшталтаваньня палітычнай ідэалёгіі, здольнай супрацьстаяць і камунізму, і анархізму, і фашызму. Гэта кіраўнікі ХДЗ сталіся сумленьнем эпохі ў міжчасьсі ўсясьветных войнаў: ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, правадыр незалежніцкага падпольля, расстраляны гестапаўцамі ў Трасьцянцы на Раство 1942-га; архімандрыт Фабіян Абрантовіч, закатаваны бальшавікамі ў Бутырцы ў 1946-м; рэпрэсаваныя энкавэдыстамі ксёндз Адам Станкевіч, рэдактар «Беларускай Крыніцы» і кіраўнік ТБШ у Заходняй Беларусі; старшыня Беларускага Народнага Аб’яднаньня і дзед лідэра БНФ Ян Пазьняк.

Менавіта хадэцыя, пераняўшы эстафэту ад БНР, адстойвала каштоўнасьці, якія пазьней узьдымуць на сьцяг БНФ і Рух «За Свабоду!» — незалежнасьць, свабоду, праўду, справядлівасьць і духовае Адраджэньне.

Насамрэч, хрысьціянская дэмакратыя — ідэя для Беларусі глыбока гістарычная. Яшчэ з часоў Ізяслава й Эўфрасіньні сьветапоглядным падмуркам для беларускага *народаўладзьдзя* (веча, шляхецкае дэмакратыі, магдэбурскага права) было хрысьціянства. Дастаткова працытаваць Скарыну й Каліноўскага, каб уявіць, наколькі па-хрысьціянску лідэры беларускай гісторыі разумелі праваcьвядомасьць: «У Біблії ўсе законы й правы, якімі людзі на зямлі кіравацца маюць, напісаныя… Тут справа ўсякага збору людзкога і ўсякага гораду выкладаецца, каб вераю, яднаньнем ласкі й згоды паспалітае памножана была». (Ф.Скарына) «Бог стварыў чалавека, каб ён карыстаў з вольнасьці справядлівай» (К.Каліноўскі).

Хрысьціянская дэмакратыя — прыўнясеньне хрысьціянскіх маральных прынцыпаў у

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 16 траўня

**Некалькі соцень юнакоў**

Штомесячная акцыя салідарнасьці «16» у сераду сабрала пад сьценамі касьцёлу Сьвятога Язэпа 300 чалавек. Так моладзь выказала падтрымку вернікам, якія змагаюцца за вяртаньне храму. Людзі трымалі ў руках сьвечкі, маліліся. За ўсім уважліва назіралі некалькі дзясяткаў спэцслужбістаў і амонаўцаў. Недалёка стаяў аўтазак.

Маладзёны трымалі ў руках літары, якія ўтваралі надпіс: «Вярніце храм вернікам». Акцыя скончылася сумесным выкананьнем гімну «Магутны Божа». Пасьля моладзь паставіла сьвечкі да прыступак бажніцы.

**Затрымалі дзяўчат**

Каля станцыі мэтро «Няміга» міліцыянты затрымалі трох актывістак моладзевага руху **Насту Шышкову**, **Касю Дзядкоўскую** і **Алесю Кавалеўскую**. Дзяўчаты ішлі на акцыю ў бок будынку КДБ. Міліцыянты знайшлі ў іх партрэты зьніклых палітыкаў і сьвечкі ды завезьлі ў РУУС Цэнтральнага раёну.

**Юрась Зяньковіч расплаціцца**

Супрацоўнікі міліцыі Савецкага раёну Менску затрымалі аднаго з заяўнікаў «Чарнобыльскага шляху» сябра Сойму Партыі БНФ **Юрася Зяньковіча.** На яго склалі пратакол паводле арт. 23.34. КаАП («парушэньне грамадзкага парадку падчас правядзеньня масавых мерапрыемстваў»). Паводле міліцыянтаў, калёна дэманстрантаў падчас «Чарнобыльскага шляху» выйшла на праезную частку, спыніўшы рух транспарту.

**Акцыі ў рэгіёнах**

Адметнасьцю травеньскай акцыі салідарнасьці стала вывешваньне бел-чырвона-белых сьцягоў. Асіповіцкія «маладафронтаўцы» 16 траўня вывесілі ў сваім горадзе некалькі нацыянальных сьцягоў. Сьцягі, расьцяжкі і графіці зьявіліся і на цэнтральных вуліцах **Нясьвіжу**. У **Наваградку** «маладафронтаўцы» распаўсюджвалі ўлёткі з інфармацыяй пра перасьлед па палітычных матывах, разда-

палітыку, эканоміку, сацыяльную галіну, культуру, адукацыю — любую сфэру жыцьця. Стрыжань сыстэмы хадэцыі — трыяда паняцьцяў: Бог, чалавек, Бацькаўшчына. Асноўныя прынцыпы — маральнасьць, адказнасьць, салідарнасьць, пэрсаналізм (асобасная раўнавага паміж індывідуалізмам і калектывізмам) і субсыдыярнасьць (імкненьне прымаць рашэньні на тым узроўні, на якім яны найбольш эфэктыўна выконваюцца).

Чым мацнейшыя катастрофы скаланалі чалавецтва за апошнія два стагодзьдзі — крызісы капіталізму, марксісцкія рэвалюцыі, таталітарныя рэжымы, усясьветныя войны — тым больш запатрабаванай ды папулярнай рабілася хрысьціянская дэмакратыя. Нарэшце, пасьля 1945 г. пачаўся сапраўдны бум: хадэкі прыйшлі да ўлады ў Нямеччыне, Аўстрыі, Італіі, Швайцарыі, Лацінскай Амэрыцы, распачалі эўрапейскую інтэграцыю й істотна ўдасканалілі саму мадэль дэмакратыі.

І ў цяперашняй Беларусі ўмовы *дзяржаўнай залежнасьці*, задушэньня дэмакратыі й грамадзкага заняпаду вымагаюць моцнае ідэйнае праграмы Адраджэньня. Перамагчы рэжым і прычыны, што яго спарадзілі, магчыма толькі аднаўляючы разбураныя законнасьць і незалежнасьць, культывуючы любоў да Радзімы і бліжняга, супрацьстаючы разгулу алькагалізму, крыміналу, разбэшчанасьці, гвалту, падтрымліваючы ўцісканыя цяпер цэрквы ды сем'і. Агульнанацыянальнае пакаяньне, магутная вера як рухавік пераменаў, крышталёвая маральная чысьціня — вось першачарговыя задачы палітычнага лідэрства ў сучаснае Беларусі.

Ва ўсім сьвеце з падобнымі задачамі найлепш спраўлялася якраз хрысьціянская дэмакратыя.

Больш таго, масавая хадэцыя пакліканая стаць сапраўдным прарывам нацыянальнага адраджэньня. Тысячагадовая моўная й культурная традыцыя, сьвядомасьць беларусаў узгадаваныя й высьпелі на Эвангельлі й веры ў Бога — і беларусізацыя касьцёлу, пратэстанцтва й праваслаўя, асабліва сярод моладзі, яўна апярэджвае падобныя працэсы ў астатнім грамадзтве.

Невыпадкова якраз новае пакаленьне беларускага руху зноў падымае сьцяг хрысьціянскай дэмакратыі. У аргкамітэт БХД, створаны ў Менску, увайшлі перадусім маладыя вернікі й сьвятары: маладафронтаўскія лідэры Зьміцер Дашкевіч, Зьміцер Хведарук, Барыс Гарэцкі, прадпрымальнікі Георгі Зьмітрук і юрыст Мікалай Арцюхоў, бард Андрэй Мельнікаў і актор Павал Харланчук, гісторык Алесь Белы, а таксама легендарны вязень ГУЛАГу, пастар Беларускай Эвангельскай Царквы Эрнэст Сабіла. Хадэкі рыхтуюць устаноўчы зьезд у трыццаці гарадах Беларусі, разам з эвангельскімі цэрквамі зьбіраюць подпісы за зьмену «Закону аб свабодзе сумленьня» (якраз за ўдзел у гэтай кампаніі, дзе падпісаліся ўжо больш як дванаццаць тысяч беларусаў, мітрапаліт Філарэт адлучыў ад сьвятарства айца Аляксандра Шрамка), праводзяць акцыі супраць гістарычнага бяспамяцтва, распусты ды парушэньня правоў вернікаў…

Тое, што адбылося ў менскім катэдральным касьцёле ў траўні 1917-га, было толькі пачаткам.

Палітыка — брудная справа толькі для тых, хто робіць яе бруднымі рукамі ды з бруднымі намерамі. Сёньня нацыянальны рух ня мае права дзейнічаць пад лёзунгам «Мэта апраўдвае сродкі». Хрысьціянскія дэмакраты абвяшчаюць палітыку сумленьня, бо маюць мэтаю нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

Нацыянальны рух ня мае права дзейнічаць пад лёзунгам «Мэта апраўдвае сродкі».

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

валі мінакам значкі «За Свабоду».У **Салігорску** акцыя салідарнасьці адбылася, нягледзячы на моцны дождж, што цягнуўся акурат тыя 15 хвілінаў, колькі й акцыя. Міліцыянты і «ціхары» сядзелі ў аўто і не заміналі ўдзельнікам.

За вывешваньне расьцяжак у Нясьвіжы ў ноч на 16-га была затрыманая актывістка **Наста Азарка**. Яе выклікалі на гутарку ў РУУС, дзе палохалі адказнасьцю за ўсе наступныя апазыцыйныя акцыі ў горадзе.

У **Полацку** ўвечары актывісты незарэгістраванага «Маладога фронту» зладзілі пікет ля помніку сьвятой Эўфрасіньні.

У **Магілёве** група актывістаў з партрэтамі зьніклых і зьняволеных палітыкаў прайшла цэнтральнымі вуліцамі.

### 17 траўня

**Дашкевічу далі іншую**

Лідэр «Маладога фронту» **Зьміцер Дашкевіч**, які адбывае паўтара году зьняволеньня за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі, атрымаў лягчэйшую працу — пілаваць дошкі. Раней ён цягаў бярвеньне.

**Казулін сустрэўся**

Палітвязень Аляксандар Казулін, што ад-

Працяг на старонцы 22.




**19 траўня ў Менску быў флэшмоб «Пінокіё». Удзельнікі з папяровымі насамі і плякатамі «Беларусь – самая дэмакратычная краіна» і г.д.раздавалі ўлёткі ў падтрымку маладафронтаўцаў.**

**Працяг са старонкі 21.**

бывае пакараньне ў калёніі «Віцьба–3», сустрэўся са сваякамі. Паводле словаў дачкі палітыка Юліі, выглядае бацька няблага.

### Міліцыя разагнала флэш-моб

17 траўня ў Горадні мусіў адбыцца флэшмоб на знак пратэсту супраць высяканьня дрэваў у розных раёнах гораду. На гарадзенскім блогу зьявіўся заклік зладзіць у цэнтры гораду 15–хвілінную акцыю — выйсьці на вуліцы з плякатамі «Я дрэва. Сьсячыце мяне».

Міліцыя таксама цікавіцца інтэрнэтам — у вызначаны час маладых людзей чакалі супрацоўнікі ў форме, у цывільным і з відэакамэрай. Мерапрыемства расцанілі як несанкцыяваную акцыю і пікет. Ва ўдзельнікаў перапісалі дадзеныя, аднаго чалавека затрымалі, але пасьля высьвятленьня асобы адпусьцілі.

## 18 траўня

### Суд не задаволіў скаргі

На паседжаньні Гомельскага абласнога суду намесьніку старшыні абласной арганізацыі АГП **Уладзімеру Кацору** і сябру КХП–БНФ **Уладзімеру Шыцікаву** было адмоўлена ў задавальненьні скаргаў на рашэньне суду Цэнтральнага раёну Гомелю. Перад Днём Волі У.Шыцікаў ды У.Кацора былі прызнаныя вінаватым і ў зьдзяйсьненьні адміністрацыйнага правапарушэньня і асуджаныя на арышт.

### Забаранілі пікеты ў падтрымку

Менгарвыканкам забараніў пікеты ў падтрымку палітзьняволенага **Андрэя Клімава**. Заяўкі на правядзеньне 21 і 22 траўня каля пракуратуры Менску і СІЗА № 1 падаў намесьнік старшыні АГП Ігар Шынкарык. У адказе за подпісам намесьніка старшыні Менгарвыканкаму Мікалая Мятліцкага гаворыцца, што паводле Закону аб масавых мерапрыемствах не дапускаецца правядзеньне акцыяў на адлегласьці менш за 50 мэтраў ад пракуратуры, а таксама «тэрыторыяў арганізацыяў, што забясьпечваюць абароназдольнасьць, бясьпеку дзяржавы і жыцьцядзейнасьць насельніцтва».

### 10 тысячаў подпісаў за зьмены

Столькі было сабрана за месяц. Арганізатары кампаніі разьлічваюць сабраць 50 тыс. подпісаў пад зваротам да кіраўніка дзяржавы, Канстытуцыйнага суду, палаты прадстаўнікоў з заклікам прывесьці ў адпаведнасьць з Канстытуцыяй закон «Аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях».

## 20 траўня

### Разгон студэнтаў

А 17:00 на плошчы Бангалор мусіла быць акцыя пратэсту моладзі супраць адмены льготаў. Каля парку сабралася 200 удзельнікаў. Пляцоўка была ачэпленая міліцыянтамі. Былі затрыманыя **Алесь Каліта**, **Андрусь Саротнік**, **Франак Вячорка**, **Андрусь Ігнатовіч**, **Андрусь Ігнатчык**, **Мікалай Якушаў**. Хлопцаў каля гадзіны пратрымалі ў РУУС Савецкага раёну. Моладзь рушыла да сквэру імя Янкі Купалы, дзе меркавала працягнуць мерапрыемства. Па дарозе затрыманьні працягваліся. На вуліцах па шляху калёны стаялі аўтазакі. Працяг акцыі адыбыўся на плошчы Незалежнасьці. Пасьля калёна рушыла па праспэкце ў бок Кастрычніцкай. Каля КДБ моладзь спынілі і разагналі амонаўцы. На вул.Гарадзкі вал затрымалі яшчэ 12 чалавек.

## 21 траўня

### Янукевіча забралі ў суд з дому

Раніцай **Аляксей Янукевіч** быў затрыманы ў сваёй кватэры супрацоўнікамі міліцыі. Ужо а 15–й судзьдзя Савецкага райсуду Аксана Рэлява пакарала яго штрафам у 30 б.а. (945 тыс. рублёў). А.Янукевічу, заяўніку «Чарнобыльскага шляху» інкрымінаваўся артыкул «Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў». За тое самае атрымала ў судзе Савецкага раёну 25 б.в. (775 000 рублёў) штрафу актывістка АГП **Валянціна Палевікова**.

**СП**



**Цягам тыдня адбываліся лякальныя студэнцкія акцыі супраць адмены ільготаў.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

## Студэнт. І без ільгот?

**«Надышоў час перагледзець сыстэму льгот, якая для асобнай катэгорыі нічога ня значыць, а толькі распыляе сродкі. Я пэўны, што, калі людзям правільна патлумачыць, яны зразумеюць», — заявіў Аляксандар Лукашэнка 12 красавіка.**

Хтосьці ўсьміхаўся і ня верыў, іншыя нэрвова падлічвалі, на колькі зьменшыцца таўшчыня іх кашалька, трэція проста махалі рукамі, маўляў: мне ўсё роўна! Прайшоў месяц. 200 студэнтаў Менску паспрабавалі выказаць сваё меркаваньне.

Мы—студэнты! Нас шмат! Мы не маўклівы статак! Мы паўнапраўная частка грамадзтва. Мы маем права бараніць свае інтарэсы! Мы маем права свабодна сказаць НЕ! Усё залежыць толькі ад ЦЯБЕ. Студэнты розных краін бароняць свае правы і інтарэсы. Яны не маўчаць.

Акцыя сацыяльнага пратэсту мелася адбыцца на плошчы Бангалор. Арганізатары рыхтавалі ўлёткі і апаратуру для канцэрту (плянаваўся выступ айчынных музыкаў). Але ўлады традыцыйна знайшлі прычыны адмовіць: парк трэба было «тэрмінова» прыбіраць.

> І нам яшчэ кажуць, што Беларусь — сацыяльная дзяржава.

Студэнты ўсё адно вырашылі сабрацца. Акурат а 17 гадзіне ля парку людзей з вушамі і ў аранжавых майках «Без квітка, бо ільготаў няма» чакалі спадары міліцыянты. Ня вельмі ветліва прасілі паказаць, што ў заплечніках, праход на Бангалор быў забаронены. Хутка пачалі зьяўляцца першыя затрыманыя.

Але народ усё адно крочыў наперад, да ўнівэрсаму «Рыга». Акцыя не была дазволеная, таму людзі проста ішлі па горадзе, размаўлялі, сьпявалі песьні. На скрыжаваньні з вул. Сурганава адзін з амапаўцаў без тлумачэньня загадаў усім разысьціся праз хвіліну, але хвіліна яшчэ не прайшла, як з аўтазакаў пачалі выбягаць яго калегі і хапаць людзей. Нехта спрабаваў тлумачыць, што «мы проста гуляем». Але іх ніхто не пачуў. Хапалі і білі як хлапцоў, так і дзяўчат. Каля 30 затрыманых павезьлі ў РУУС. ...Праз паўгадзіны адтуль выйшаў мой знаёмы і расказаў, як яго дапытвалі і называлі (за што—невядома) «вырадкам».

Нам зь дзіцячага садку кажуць, што «Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная САЦЫЯЛЬНАЯ прававая дзяржава». Ці ведалі пра гэта міліцыянты, якія затрымлівалі студэнтаў? Ведалі! Але якая ім розьніца, для іх жа льготы застануцца!

**Яня Елка, Менск**

## У абарону Delphi

**Насьмяшыў выраз «састарэлая мова праграмаваньня Delphi».** Дадзеная мова праграмаваньня, а таксама адпаведная сыстэма для распрацоўкі, хаця і маюць немалую гісторыю, дагэтуль актыўна разьвіваюцца кампаніяй Codegear (www.codegear.com), былой часткай кампаніі Borland. Гэтая сыстэма шырока выкарыстоўваецца, хаця і не займае лідуючых пазыцыяў сярод іншых вядомых інструмэнтальных сродкаў. Падставаў лічыць яе састарэлай у аўтараў артыкулу ня больш, чым, напрыклад, беларускую мову.

**Чытач, tut.by**

## Што з кляштарам?

**Пасьля таго як прачытала артыкул «Кляштар з прэзыдэнцкім люксам» у «НН» №8, адправіла ў газэту «Советская Белоруссия» ліст** з прапановай абмеркаваць пытаньне аб лёсе бэрнардынскага кляштару і ўсяго гістарычнага цэнтру Менску.

Ліст рэдакцыя пераслала ў гарвыканкам, адкуль я атрымала адказ. Не зусім разумею сэнс слоў: «Основным положением Концепции является создание соответсвующего уровню столицы Республики Беларусь исторического центра г.Минска» і г.д. Гістарычны цэнтар ужо існуе, і яго ня трэба ствараць. Яшчэ зьвярнула ўвагу на словы: «предусмотрено изменение использования с приспособлением под объекты *культурно-просветительного* и торгово-бытового назначения». Але ніжэй ужо «*с приспособлением под гостиничный комплекс* и объекты торгово-бытового назначения» (як і ў копіі дакумэнту, зьмешчанай у вашым артыкуле). Слова *«культурно-просветительный»* зьнікла. Гэта не зусім аднолькавыя рэчы. Верагодна, спачатку было іншае рашэньне.

Магчыма, пасьля таго як я змагу пазнаёміцца з дакумэнтамі і публікацыямі, аб якіх піша сп.А.Андрончык, сытуацыя стане мне больш зразумелай.

У апошні час матэрыялы аб Верхнім горадзе зьявіліся ў розных газэтах і на беларускім тэлебачаньні, у тым ліку ў «КП», «СБ», «Минский курьер». Хочацца верыць спадарам М.Жыху і І.Чарняўскаму («СБ» ад 4 красавіка 2007 г.), што канчатковы лёс кляштару пакуль ня вырашаны. Гэта дае некаторую надзею. На жаль, маленькую.

**Натальля Мацкоўская, Менск**



ДЗЯНІС РАМАНЮК

## Стань беларускім гісторыкам

Факультэт мастацтваў і гісторыі культуры Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ужо другі год робіць набор на аддзяленьне «Беларусістыка». На ім прадугледжаныя бакаляўрскія («Гісторыя Беларусі і культурная антрапалёгія», «Ахова і выкарыстаньне культурнай спадчыны», «Візуальны дызайн і мэдыя», «Тэорыя і практыка сучаснага мастацтва») і магістарскія («Ахова і інтэрпрэтацыя культурнай спадчыны») праграмы для асобаў з вышэйшай адукацыяй і студэнтаў апошніх курсаў зь Беларусі.

Бакаляўрскія праграмы прадугледжваюць вочную і завочную формы навучаньня; магчымасьць вывучэньня літоўскай мовы і культуры; атрыманьне дыплёму дзяржаўнага ўзору Літоўскай Рэспублікі, які прызнаецца ў краінах Эўрапейскага Саюзу.

Да прыкладу, па сканчэньні праграмы «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалёгія» даецца дыплём «бакаляўр гісторыі» эўрапейскага ўзору і, вядома, грунтоўныя веды па беларускай, эўрапейскай і сусьветнай гісторыі, культурнай антрапалёгіі, этналёгіі, археалёгіі. Апроч таго, студэнт мае ўнікальную магчымасьць жыць і вывучаць гісторыю ў горадзе, вуліцы якога памятаюць вялікага князя Гедыміна, першадрукара Францішка Скарыну, паэта Адама Міцкевіча і паўстанца Кастуся Каліноўскага. У Вільні жывуць традыцыі шматнацыянальнага Вялікага княства Літоўскага, дзе пераважаў дух нацыянальнай і рэлігійнай талеранцыі. Курс прадугледжвае сустрэчы і кантакты зь вядомымі беларускімі гісторыкамі, пісьменьнікамі, паэтамі, журналістамі і палітыкамі.

Выпускнікі праграмы могуць працаваць навуковымі супрацоўнікамі музэяў, экскурсаводамі, выкладчыкамі гістарычных дысцыплінаў, выступаць у якасьці экспэртаў па праблемах гістарычнай спадчыны, весьці самастойныя даследаваньні ў галіне гістарычнай навукі альбо працягваць навучаньне ў магістратуры.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць у кіраўніка праграмы, доктара гістарычных навук Аляксандра Смаленчука (e-mail: smalian2001@tut.by).

**...піянэрыя, як кажа афіцыёз, паўплывала на фармаваньне асобы кожнага, хто насіў чырвоны гальштук.**

**Бібліятэкар:** Табе якую кніжку, Мілінкевіч?

**Піянэр:** Пра Паўліка Марозава, калі ласка. Які Бацьку ў турму засадзіў.





**...Ён кіраваў казачным каралеўствам.**

**Шрэк:** Фіёна, табе давядзецца зноў ператварыцца ў прынцэсу, якая быццам чакае ў замку жаніха. У такім разе мы маглі б недзе жыць. Бачыш, прыняты закон, які пазбаўляе троляў ільготных правоў на балоты.



**...архітэктурны дызайн Нацыянальнай бібліятэкі сапраўды спадабаўся прэзыдэнту Ірану.**

— Шаноўны прэзыдэнт ЗША, шаноўная спадарыня Райс. Нашы касьмічныя спадарожнікі змаглі зрабіць некалькі фотаў іранскіх цэнтраў, дзе ідзе працэс узбагачэньня ўрану.

МАЛЮНКІ І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Дзякуй

Асаблівы дзякуй **Міхасю Л.**, які цяпер у ЗША.

Асаблівы дзякуй **Андрэю В.** і **Сыльвэстру Б.**, якія цяпер у Вялікай Брытаніі.

Дзякуй **Тадэвушу Д.**, **Сяргею С.**, **Міхасю Б.**, якія цяпер у Вялікай Брытаніі.

**Міхаілу А.** з Наваполацку.

**В.К.** з Рэчыцкага раёну.

**Антону Т.**, **Анатолю П.** зь Менскага раёну.

**Мікалаю С.** з Ганцавіцкага раёну.

**Ю.Ц.**, **Аляксею Ш.**, **Лідзіі А.**, **Вячаславу С.**, **Анжэле Б.**, **Тацяне Ш.**, **Руслану Г.** з Баранавіч.

**Вользе Ш.** з Ваўкавыску.

**Кастусю З.**, **Уладзіславу І.**, **Карыне Ш.** зь Віцебску.

**Іне С.** з Барысава.

**Але Г.** з Бабруйску.

**Юліі С.** з Пастаўскага раёну.

**Мар’яну М.** зь Лідзкага раёну.

**Вользе А.** зь Любанскага раёну.

**Андрэю Г.**, **М.К.** з Наваполацку.

**І.Г.** са Смалявіч.

**Валер’ю П.** з Баранавіч.

**Валянціне С.** зь Менскага раёну.

**Вячаславу К.** з Барысава.

**Паўлу Ж.** зь Віцебску.

**К.М.**, **Мікалаю В.** зь Берасьця.

**Уладзімеру П.**, **Аляксандру Ш.** з Аршанскага раёну.

**Вікторыі К.** зь Пінску.

**Тацяне В.**, **Тамары К.**, **Яўгену К.**, **Валер’ю К.**, **А.Р.**, **Валерыі Ч.**, **М.Г.**, **Сяргею К.**, **Д.К.**, **А.Г.**, **Марыі Г.**, **Юр’ю М.**, **Андрэю С.**, **Людміле Б.**, **Галіне Г.**, **І.М.**, **Віктару М.**, **Канстанціну К.**, **Сьвятлане Р.**, **І.Г.**, **М.С.**, **Сяргею Ж.**, **Генадзю Я.**, **М.Б.**, **Юліі П.**, **Яўгену К.**, **Настасьсі Ж.**, **Мікалаю Ш.**, **А.П.**, **Уладзімеру З.**, **Ірыне І.**, **Рыце Н.**, **Сяргею Г.**, **Казімеру Г.**, **Ірыне Б.**, **Леаніду Г.**, **Мікалаю А.**, **Багуславу У.**, **Л.Г.** зь Менску.

**Жаньне Ш.**, **Д.Т.**, **В.Ц.**, **К.Ж.**, **Але Г.**, **В.К.**, **Валянціне Ш.**, **В.К.**, **Пятру Б.**, **Г.К.**, **К.П.**, **Алесю Л.**, **Юр’ю Ш.**, **Юр’ю Ш.**, **Цімафею А.**, **Ігару П.**, **Станіславу Б.**, **Тацяне П.** зь Менску.

**Сяргею К.** з Салігорску.

**Андрэю А.** зь Менскага раёну.

**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.

**П.Г.**, **Зьмітру К.**, **В.М.**, **А.Р.** з Мастоўскага раёну.

**Алесю С.** з Кіраўскага раёну.

**Сяргею С.** з Барысаўскага раёну.

**Мікалаю В.** з Пружанскага раёну.

**Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.

**Сяргею К.** з Горадні.

**Мікалаю В.** зь Бярозаўскага раёну.

**П.Д.** са Сьвіслацкага раёну.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пераказваць на рахунак** газэты грошы з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакзу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828

МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828

МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

# Дзікар і Джулія

Калі хтосьці з чытачоў «НН» надумаецца наведацца на Наваградчыну, не абмініце вёску Паплава: будзе цудоўная магчымасьць абнавіць сад, набыць смачнага мёду, альбо проста пасядзець у прыемнай кампаніі. Для гэтага ў вёсцы трэба запытацца, дзе жыве Дзікар. Такая мянушка ў мясцовага мастака і пчаляра Сяргея Емельяновіча. Так вяскоўцы звалі яго дзеда, бо адмовіўсяісьці ў калгас.

Емельяновічы жывуць з уласнай гаспадаркі: разводзяць пчолы, вырошчваюць шчэп. Часу на іншае не хапае. Па іх яблыні, ігрушы, сьлівы, вішні з чарэшнямі прыяжджаюць з усёй Беларусі. Аднойчы нават з Масквы чалавек колькі дрэўцаў замаўляў, сьмяецца Юлія. Узяў тым, што добра размаўляў па-беларуску. Колькі гадоў таму пачалі асвойваць вінаград. Захапленьне садовымі справамі перадалося гаспадару ад дзеда, чыя некалі ўшчэпленая яблыня дагэтуль расьце ў полі.

### Я не любіў роднай мовы ў школе

У сям'і Емельяновічаў размаўляюць толькі па-беларуску. У вёсцы, дзе мясцовых паступова выцясьняюць прыежджыя з Расеі, гэта рэдкасьць. «У школе я не любіў заняткаў па беларускай мове з-за настаўніцы, а вось расейскую мову выкладаў цікавы чалавек, то й мова тая больш падабалася», — узгадвае Сяргей. Гэта ўжо потым ён адчуў неабходнасьць вызначыцца: «Рана ці позна задаеш сабе пытаньне — хто ты ёсьць». Дзед і бабуля яго жонкі Юліі трапілі ў Беларусь з Расеі ды Казахстану ў 1939 г. Яны раўніва аберагалі дзяўчынку ад мясцовых уплываў. Школьніцай яна часьцяком перамагала на алімпіядах па расейскай мове, але вучыцца пайшла на беларускі філялягічны факультэт. Атрымалася выпадкова — пераблыталіся дакумэнты, ды яна насуперак пратэстам сваякоў ня стала настойваць на пераводзе. У Гарадзенскім унівэрсытэце пачаўся яе шлях да беларускай мовы. Потым было знаёмства зь Сяргеем. «У гэтай сям'і я канчаткова стала беларускай», — кажа Юлія. Пра тое, што інакш і не магло быць, сьведчаць кніжныя паліцы ў хаце — спрэс застаўленыя беларускімі кнігамі: ад Васіля Быкава да нядаўна



СЯМЁН ПЕЧАНКО

выдадзенай кнігі Юр'я Туронка. Для дзетак — кніга Пятра Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі». Побач з музычным цэнтрам ляжаць плыткі зь беларускай музыкай. Папаўненьнем бібліятэкі цяпер займаецца гаспадыня. Каля хаты на слупе замацаваная спадарожнікавая «талерка». Гаспадар кажа, што чакае не дачакаецца новага тэлебачаньня з Польшчы.

## Маленькія ліцьвіны

Разам зь бялявымі валасамі дзеці ўспадкавалі ад бацькі і вясковую мянушку — пра іх так і кажуць: «А, ды гэта дзікаронкі малыя гуляюць!» Дачушка Дамініка ходзіць у садок, маленькага Яна мама выхоўвае дома. Імёны дзецям выбіралі адмыслова. Кажучы пра дачушку, бацькі прыгадваюць, што так завецца ўнучка Рыгора Барадуліна. Бацька Сяргея, Сяргей Іванавіч, ня можа нарадавацца ўнукам. Прыгадвае свайго бацьку, што працаваў у каваля-жыда. «Жыд той разумны быў, называў бацьку Янам, а бацька супраціўляўся — казаў, што Ванька яму больш даспадобы». Дзядуля кажа, што ўнукі вырастуць сапраўднымі ліцьвінамі. Слова «ліцьвін» часта гучыць у гэтай сям'і. Калі Ян пачынае капрызіць, яго пытаюць: «Ты ліцьвін ці маскаль?» Дзейнічае амаль бездакорна.

Слова «маскалі» пачуеш на Наваградчыне спрэс. З расейцаў тут часьцяком пасьмейваюцца. Традыцыя гэтая, як вынікае зь мясцовых гісторыяў, пайшла ад 1939 г. «Вызваліцелі, а як жа! Павызвалялі нас ад хлеба ды сала», — сумна ўсьміхаюцца сталыя людзі. Сяргееў дзед не пайшоў у калгас пасьля размовы з чырвонаармейцам, які распавёў пра жахі калектывізацыі. Старыя людзі і цяпер пераказваюць гісторыі пра расейцаў, якіх пасьля аб'яднаньня Беларусі раскватаравалі па хатах. Найбольш пашыраная байка пра «жыр» — сьметанковае масла, якое чырвонаармейцы палічылі за тлушч. Цяпер тут па вёсках расьсяляюцца прыбышы з Расеі. Часьцей за ўсё нехта зь мясцовых вяртаецца дамоў, везучы вялікую радзіну. Разам з гасьцямі завозяцца новыя традыцыі. Апошнім часам на хлявах сталі чапляць замкі, чаго раней ніхто ня ведаў.

Жонку Сяргей называе Джуліяй, бо так «пішацца лацінкай». Тая прызвычаілася. Нават дзеці на пытаньне, як завуць бацькоў, кажуць «Сярзук і Дзулія».

## Майстар на ўсе рукі

Звычайная вясковая хата Емельяновічаў вельмі ўтульная. На вуліцы побач зь сьцяной амаль гарадзкая лава, на вугле хаты — ліхтар. Вострыя дах калодзежа аздоблены каваным пеўнем. На сьценах у кухні чатыры гадзіньнікі. Два зь іх маюць французскі ды нямецкі мэханізмы. Гаспадар парабіў ім новыя карпусы. На сьценах вісяць намаляваныя Сяргеем карціны. Гэта, як і садаводзтва, хутчэй захапленьне, кажа ён. Гаворачы пра маляваньне, Сяргей увесь час прыгадвае свайго земляка мастака Кастуся Качана, чые карціны купляюць калекцыянэры з Амэрыкі ды Турцыі. Разам яны малююць краявіды. Напрыклад, стары драўляны млын у суседняй Баярскай ці берагі Нёману. Адзін натурморт прысьвечаны ўлюбёнаму занятку: валошкі, пчалярскі рыштунак ды слоік мёду. Пры канцы траўня Сяржук зьбіраецца на мастацкі пленэр на Астравеччыну, дзе будзе працаваць разам з Алесем Марачкіным.

## Настаўнік

У дзяцінстве Сяргееў талент угледзеў школьны настаўнік маляваньня Іван Клімко, які параіў яму пайсьці вучыцца ў мастацкую вучэльню. Але да Бабруйску, дзе ў той час дзейнічала такая вучэльня, было далёка. Так Сяргей і не атрымаў прафэсійнае адукацыі. Былы настаўнік жыве ў суседнім Весялове. За саветамі ён быў абылганы аднавяскоўцамі і адбыў 10 гадоў на лесапавале. Пілаваньне драўніны па паўтары нормы ў дзень ня стала нагодай для нянавісьці да дрэваў: вярнуўшыся дамоў, былы вязень знайшоў каля хаты прарослы жалудок, пашкадаваў яго і пасадзіў ля ганку. Цяпер побач з хатай — магутнае дрэва. Па вызваленьні Іван Клімко насіў пошту, а потым стаў настаўнічаць. Мае невялічкую майстэрню, дзе на сьценах, зацягнутых павуціненьнем, суседнічаюць гіпсавыя выявы Хрыста ды Леніна, вісіць некалькі аўтапартрэтаў ды партрэт жонкі.

## З Паплавы ў Вільню

Разглядаючы фотаальбомы Емельяновічаў, адчуваеш адкрытасьць гэтых людзей сьвету. Здымкі адлюстроўваюць ня толькі выявы тутэйшай мясцовасьці ці нейкія сямейныя сцэны. Тут і нямецкія гарады, і польскія, куды гаспадар рэгулярна наведваецца на ладжаныя польскімі пчалярамі сьвяты, і Наваградак зь Нясьвіжам у часе сярэднявечных фэстаў. Емельяновічы любяць падарожнічаць. Дзякуючы Зьмітру Касьпяровічу і яго сяброўскім вандроўкам, наведаліся ў Вільню.

Не абыходзяць Сержука зь Юліяй і мясцовыя праблемы. У тым самым фотаальбоме ёсьць колькі здымкаў мясцовых п'янтосаў. «Гэты ўжо закадзіраваўся ды жаніўся, а гэты прападае», — распавядае пчаляр. Пад здымкам зьбітага на горкі яблык старога стаіць подпіс: «Павіншавалі дзеда зь Перамогай». Віншаваў гэтак малады хлопец, мясцовы «бандыт».

Аграгарадкі дайшлі і да суседніх з Паплавай Нягневічаў, колішняга жыдоўскага мястэчка. Ахвярамі аграўрбанізацыі сталі некалькі старых жыдоўскіх моцных яшчэ камяніц. Зруйнаваўшы «развалюхі», на іх месцы збудавалі новыя дамкі, якія мясцовыя, праз іхныя габарыты, празвалі «шпакоўнямі». Емельяновічы спрабавалі неяк перашкодзіць разбурэньню, але марна.

Дзякуючы Емельяновічам у Паплаве ды навакольных вёсках скалалася суполка маладых беларускамоўных сем'яў.

...Аглядаючы вульлі, Сяргей знаёміць са сваімі крылатымі выхаванцамі: тут аўстрыякі, там маскалі, а вось тутэйшыя. Распавядае, што сёлета будзе багата трутняў: «Бачыш, якія ячэйкі ў сотах вялікія, значыць мае пчолкі хочуць мужыкоў». Вульлі ў паплаўскага пчаляра шматпавярховыя. Ён кажа, што савецкія вульлі-шпакоўні трапілі да нас з Амэрыкі: «Амэрыканцы іх нам спэцыяльна далі, каб мы ня мелі мёду». Мёду сёлета небагата, таму пчаляр частуе гасьцей леташнім — рапсавым. Дарэмна гаспадары называюць яго ня вельмі смачным. Разьліваючы па кілішках трохгадовую медавуху, Сяргей прыгадвае ліцьвінаў ды іх слаўныя традыцыі. Каштуючы духмяны напой, міжволі пачынаеш зайздросьціць продкам.

**Сямён Печанко**

# Хібы праектнай дакумэнтацыі

Для посьпеху беларускаму праекту трэба рэгулярна рабіць работу над памылкамі і не баяцца адмаўляцца ад усяго, што не спрацоўвае.

Сяргей Богдан («Перазагрузка Беларусі», «НН», 6 красавіка) спрабуе падвесьці вынікі беларускага «Адраджэньня».

Калі коратка, канцэпцыя Богдана выглядае наступным чынам: «Адраджэньне» спрацавала, беларусы «робяць посьпех за посьпехам у стварэньні нацыі», бракуе ім толькі «ўпэўненасьці ў сваіх сілах і пазытыўнага мысьленьня». Асноўныя дасягненьні наступныя: 1) мова пазбавілася плебейскага і вясковага статусу; 2) адна-віўся дэрусіфікаваны несавецкі стандарт беларускай мовы; 3) мова і культура набылі сьвядомых гаспадароў; 4) вырасла новае пакаленьне творцаў і носьбітаў беларускае культуры; 5) працэс разьвіцьця культуры і мовы набыў натуральны характар; 6) культура і мова адкрыліся сьвету.

Пасьля прачытаньня артыкулу спачатку здаецца, што ён напоўнены нейкім нездаровым аптымізмам. Затым была ідэя, што гэта рэдактарская правакацыя з мэтай ініцыяваць дыскусію на тэму. Бо, быццам бы, даўно ўжо час: амаль сямнаццаць гадоў незалежнасьці і трынаццаць пад Лукашэнкам. Тэрмін працяглы. І калі нешта такі доўгі час не атрымліваецца, то або ідэя была ўтапічная, або ў выканаўцаў рукі не пад тое заточаны. Таму трэба высьветліць, што ж адбылося.

Аналіз вынікаў пабудовы нацыі я б прапанаваў весьці ў трох напрамках:

1) посьпехі ў пашырэньні беларускай мовы;

2) посьпехі ў разьвіцьці беларускай нацыянальнай культуры;

3) посьпехі ў стварэньні незалежнага беларускага грамадзтва (ці ўласна нацыі).

**Пашырэньне мовы**, на маю думку, цяпер галоўнае. Колькасьць спрэчных месцаў у «нашаніўскім» аналізе ў гэтым пытаньні найбольшая, часам проста скажаецца рэальная сытуацыя з мовай.

Па-першае, колькі можна ўжо спэкуляваць на гэтых 37%? Але тут наагул нешта новае: Богдан падае гэта як «сьвядомую дэклярацыю пра выкарыстаньне беларускай мовы ўжо як мовы нацыі ў 1999 г.». Калі нехта яшчэ нечага не разумее з гэтым перапісам, то яму варта патлумачыць, што больш за 30% — гэта наша вёска зь яе трасянкай і дыялектамі (згодна зь перапісам, на вёсцы жыло 3,08 млн чал.).

Дыялекты ж сам аўтар (у тым самым сказе!) адмаўляецца лічыць за беларускую мову. Трасянка таксама ня цягне на «мову нацыі». Застаецца некалькі «гарадзкіх» працэнтаў, якія сапраўды задэкляравалі сваю мову «сьвядома». Прычым большасьць зь іх беларускай не карыстаюцца, а зрабілі гэта зь любові.

Такім чынам, застаецца недзе каля 2%. Вось і ўсе вынікі.

Хоць я не разумею, чаму дыялекты ня могуць лічыцца за беларускую мову. Немцы, швэды і іншыя цалкам сфармаваныя нацыі размаўляюць на дыялектах. Нельга казаць, што несьвядомае карыстаньне імі — гэта абавязкова «зьява данацыянальнага характару». Несьвядомае карыстаньне мовай (неістотна, у якім варыянце) — гэта ў любым выпадку вялікі пазытыў. Яно сьведчыць пра пераемнасьць традыцыі. Мая бабуля размаўляе на дыялекце, але сама яна лічыць сваю мову беларускай.

Таму я б зь вялікай асьцярожнасьцю прымаў лічбу 37%, але ні ў якім разе не падаваў бы яе як «мову нацыі» ці дасягненьне.

Ёсьць нашмат больш надзейны мэтад, з дапамогай якога можна вызначыць, ці ёсьць посьпехі ў пашырэньні беларускай мовы. Проста ідзеш па горадзе й прыслухоўваесься.

Дзевяць гадоў назад, калі я толькі прыехаў у Менск, мне здавалася, што па-беларуску я тут размаўляю адзін. Я чуў беларускую на вуліцы ў сярэднім недзе раз на месяц. Цяпер я чую яе амаль кожны дзень. І кожны раз радуюся. Хоць, прызнацца, асаблівых прычынаў для радасьці няма. Хай сабе гэта ўжо не адзін, а два ці тры працэнты — што ад гэтага мяняецца? Пакуль няма крытычнай масы, рана казаць, што крызісу не існуе.

Другі момант, які б я адзначыў, — гэта зьяўленьне беларускай рэклямы. Пазытыў тут несумненны. І хоць прычыны яе зьяўленьня трохі, гм, празаічныя, гэта ня мае вялікага значэньня, бо істотны сам вынік.

Зацемка пра аднаўленьне «дэрусіфікаванага, несавецкага стандарту беларускай мовы». Так склалася, што для мяне засваеньне абодвух варыянтаў мовы ішло амаль паралельна, калі не лічыць малодшых клясаў. Але часам чытаеш тэксты на тарашкевіцы (асабліва пераклады) і проста не «ўтыкаеш», што значыць тое ці іншае слова. Пытаўся ў сябра — сытуацыя тая самая. Дапамагае веданьне польскай. Але ж гэта таксама не варыянт — замяніць усе запазычаньні і калькі з расейскай на калькі з польскай. Што казаць пра звычайных грамадзянаў, якія маюць менш жаданьня разьбірацца ва ўсім гэтым. Выходзіць, што ўвесь гэты час прадукцыя на тарашкевіцы была адрасаваная дастаткова вузкаму колу. Гэта, несумненна, нэгатыўна адбілася на агульных выніках нашага «праекту пабудовы нацыі».

Параўнаньне з кітайскімі герогліфамі, ужытае Богданам, недарэчнае. Больш дарэчы быў бы прыклад зь дзьвюма нарвэскімі мовамі. Толькі… ці патрэбна нам гэта?

Упарадкаваньне «клясычнага правапісу» аўтар падносіць як ледзь не галоўнае дасягненьне (хоць зноў жа не зразумела, ці паўплывала яно на пашырэньне мовы ў грамадзтве). Аднак гэта толькі пачатак кадыфікацыі дадзенага варыянту мовы, бо няма адпаведных «упарадкаваных» слоўнікаў. Цікава, хто будзе імі займацца: зноў аматары ў розных канцах сьвету ці нейкая пэўная інстытуцыя? І на колькі расьцягнецца гэтая праца? Безь фінансаваньня, трэба думаць, на многія дзесяцігодзьдзі. І ўвесь гэты час кожны будзе працягваць пісаць, як хоча. Якія нацыянальныя ўнівэрсытэты, калі нельга будзе нават праверыць дыктоўку, напісаную на такой мове?

«Я паклаў руку на стырно гелікоптэра», — колькі чалавек можа зразумець гэтую фразу ў Беларусі? Мова ў першую чаргу прызначана для каму-

нікацыі, якая немагчымая без узаемаразуменьня. Можна яшчэ сто гадоў з падобным посьпехам прапаведаваць такую мову і нацыянальную ідэю на такой мове. А можна прыняць некаторыя зьмены савецкага пэрыяду як незваротныя і пагадзіцца на ўніфікацыю правапісу ў будучыні. Сыстэма, у якой умяшаньне звонку аднойчы парушыла стабільнасьць, ніколі ня вернецца да пачатковага стану. Калі стабільнасьць будзе дасягнутая зноў, стан будзе ўжо якасна іншы.

Так што існаваньне двух варыянтаў мовы ўсё-такі тармозіць яе прапаганду. А кадыфікацыя тарашкевіцы запатрабуе яшчэ шмат энэргіі, якую можна было б скіраваць у іншае рэчышча. У нас рэальна мала часу і рэсурсаў, каб імі раскідвацца.

**Беларуская нацыянальная культура** знаходзіцца ў такім самым «цудоўным стане», як і мова. Адзінае, што пазытыўнага можна тут заўважыць, дык гэта рост колькасьці перакладаў. Унёсак уласна беларускіх творцаў у сусьветную мастацкую культуру мізэрны. Калі б я не баяўся пакрыўдзіць беларускіх аўтараў, то сказаў бы, што ён адсутнічае як такі.

Прычынаў тут я б вылучыў тры. Папершае, як гэта ні парадаксальна, лякальнасьць тэматыкі і праблематыкі і палітызацыя. Сёньня дастаткова напісаць проста твор на беларускай мове (на любую ўнівэрсальную тэму), а не пра беларускую мову (гісторыю і г.д.). Ёсьць, праўда, у літаратуры фэномэн галісійскага пісьменьніка Альфрэда Кондэ, які на ўвесь сьвет славіць свой малы народ і яшчэ меншую мову, але гэта выключэньне. Да таго ж там зусім іншая парадыгма, а не рамантызм; ніякіх празьмерных жарсьцяў з гэтай нагоды, наадварот — міжземнаморскі спакой і раўнавага. Па-другое, гэта інтэлектуальны ўзровень нашых творцаў. Па-трэцяе, захапленьне рознымі постмадэрнісцкімі гульнямі.

Адсутнічае таксама *масавая беларускамоўная культура*. Богдан гэтую праблему проста замоўчвае. А можа, ён зьбіраецца перакаваць традыцыйнае грамадзтва на нацыю інтэлектуалаў?

Па вялікім рахунку, праблема ня толькі з масаю, але і з элітаю. Фразы кшталту «беларуская мова набыла элітарны характар» — ня больш чым спроба выдаць свае жаданьні за рэчаіснасьць. Бо, як слушна заўважана, ня трэба блытаць эліту з багемай.

**Незалежнае беларускае грамадзтва**, трэба прызнаць, робіць некаторыя посьпехі. Ствараюцца «сайты, праекты, таварыствы, суполкі, ячэйкі» і г.д. На гэта трэба было арыентавацца з самага пачатку, а не панікаваць пасьля кожнага чарговага «закрыцьця». Тут я згодны на ўсе сто.

Але апускаецца адно вельмі істотнае пытаньне — пытаньне фінансаваньня незалежнага грамадзтва. Зрэшты, мне асабіста ўсё роўна — лічыцца толькі канчатковы прадукт. Праблема ў іншым. Як слушна адзначыў нехта на форуме, фінансаваньне ажыцьцяўляецца толькі ў пэўных галінах. І далёка не само незалежнае беларускае грамадзтва выбірае, у якіх. Калі нам, напрыклад, кроў з носа патрэбна пашыраць і паляпшаць беларускамоўную школьную адукацыю, а грошы ідуць на розныя радыёстанцыі, якіх ніхто ня слухае. Толькі на трынаццаты год панаваньня Лукашэнкі дажылі нарэшце да альтэрнатыўнага тэлеканалу. Дзякуй палякам, а то так і эра тэлебачаньня магла б скончыцца.

За «незалежнае беларускае грамадзтва» часам спрабуюць выдаць сыстэму недзяржаўных арганізацый на грантавай аснове. Гэта заганная рэдукцыя.

У Беларусі за гады незалежнасьці так і ня склалася нацыянальная буржуазія — і гэта не выпадкова, а вынік пасьлядоўнай палітыкі ўладаў, скіраванай на поўны кантроль над бізнэсам. Ёсьць шмат заможных людзей, але гэта не карпарацыйны стан.

Таму трэба быць гатовымі самім скінуцца на тое, што Вы самі лічыце патрэбным.

Зарабляньне грошай — гэта, увогуле, лепшае, чым беларускія нацыяналісты маглі б сёньня заняцца. Бо пакуль што беларуская мова ні зь якім жыцьцёвым посьпехам не атаясамліваецца. Стэрэатып «калхозьніка» сапраўды пераадолены. Але замест яго склаўся стэрэатып «інтэлігента». Гуманітарыя, дакладней. Якому беларуская мова патрэбна *па спэцыяльнасьці*. Але, на шчасьце, ёсьць надзея, што гэты стэрэатып таксама доўга не пратрымаецца.

Прычыны для аптымізму наступныя. Гляджу я на сваіх знаёмых і бачу, што многія пачалі проста займацца справай замест таго, каб сядзець і тупіць. Калісьці «Наша Ніва» напісала, што ў нас павінны быць свае «прадпрымальнікі, бандыты і прастытуткі» (цяпер дакладна ўжо не працытую), што выклікала шок у прававернай частцы чытачоў. Ня ведаю, як наконт апошніх, але сёньня ўжо ёсьць беларускамоўныя практычна ва ўсіх сфэрах: ад праграмістаў і будаўнікоў да вайскоўцаў і «мянтоў». У некаторых сфэрах іх пакуль што ня так шмат, але галоўнае — тэндэнцыя. Гэта і ёсьць сапраўднае незалежнае беларускае грамадзтва.

**Падагульняючы**, можна сказаць, што беларуская нацыянальная ідэя рэалізуецца марудна. Пераклады, трохі рэклямы — гэта ўсё прыватнасьці. Колькасьць беларускамоўных у горадзе за час панаваньня Лукашэнкі вырасла ў лепшым выпадку на 1—2%. Хай сабе гэта рост у два-тры разы, але нас пакуль што вельмі мала, каб казаць пра «пераадоленьне крызісу», «зьмену стэрэатыпаў» і стварэньне незалежнага грамадзтва. Мізэрны вынік за столькі гадоў.

На шчасьце, ніколі не бывае нейкага аднаго варыянту разьвіцьця падзеяў.

Выміраньне вёскі і працяг урбанізацыі, працэсы ў прынцыпе цалкам натуральныя, прывядуць да таго, што праз дваццаць-трыццаць гадоў на вёсцы больш-менш чыстай беларускай мовы не пачуеш наагул. Амаль не застанецца й самой вёскі.

Але калі нацыя ўсё ж працягне фармавацца і прыцягне сотні тысяч рук, каб скінуць *самі ведаеце што*, можа высьветліцца адна нечаканая рэч. Можа так аказацца, што гэта расейскамоўная нацыя. Такі сабе ірляндзка-шатляндзкі шлях. Ці лаціна-крэольскі. Плошча будзе называцца Каліноўскага, але *рукі вверх, золотое кольцо, комсомольская правда толстушка і квн* — усё гэта застанецца.

Тут патрэбны ня проста павольны рост. Патрэбны выбух. Геамэтрычная прагрэсія. Дзеля гэтага патрабуюцца дзьве ўмовы. Па-першае, свае грошы, якія б укладаліся ў нацыянальную справу. Па-другое, подзьвіг энтузіястаў, якія створаць і ТБШ, і спартыўныя клюбы, і бары, і прафэсійныя асацыяцыі, і «беларускую мафію».

Таму, спадарства, кідайце свае сэмінары, трэнінгі, нарады па ўпарадкаваньні правапісу і займіцеся чым карысным.

**Zmicier-X,**
**tut.by**

# Перазагрузка пазытыўнага

*«Нам вчера дали мечту, но мы не нашли в ней ни тепла, ни привета».*
**БГ**




WWW.SVABODA.ORG

Артыкул Сяргея Богдана «Перазагрузка Беларусі» выклікаў моцнае ўзрушэньне на форуме «НН». Вырашыў выкласьці сваё набалелае і я.

Перадусім дазволю сабе паралель між агульнай інтанацыяй артыкулу і думкамі героя аповесьці Максіма Гарэцкага «Дзьве душы» (1919 г.) настаўніка Міколы Канцавога, які шчыра дзівіцца, чаму разумныя і інтэлігентныя людзі гэтак квола падтрымліваюць нацыянальныя ідэалы, тады як *«...адраджэньне ў астатні час, праз вайну і рэвалюцыю, зваявала сабе калясальны пасьпех, так што няма ўжо патрэбы давадзіць шмат чаго такога, што вымагала даводжаньня яшчэ ўсяго якіх пяць гадоў таму назад... Яму здавалася, што ўсе рэнэгаты-беларусы ведаюць аб адраджэньні і аб тым, што павінны адраджацца, і калі не адраджаюцца, дык з прычыны прыкрай людзкой нядбайнасьці і папсаванасьці сваей натуры».*

Так, 37%, што заявілі пра беларускамоўнасьць падчас перапісу 1999 г., сп.Сяргей называе гіганцкім посьпехам і кажа пра «сьвядомую дэклярацыю пра выкарыстаньне беларускай мовы ўжо як мовы нацыі». Згубна абмінаецца тое, што беларуская мова насампраўдзе дасюль ня ёсьць мовай нацыі, а ёсьць «мовай Плошчы» (Андрэй Дынько). Між тым, асэнсаваньне гэтага фэномэну неабходнае, каб рухацца далей...

## Плошча як прошча

Адной з прычынаў таго, што чалавек, нягледзячы на відавочную небясьпеку для здароўя й дабрабыту, выходзіць на пляц/шэсьце ў нашай сытуацыі, бачыцца ня так жаданьне пратэсту як такога (як у краінах, дзе гэты пратэст сапраўды мае плён), як патрэба адчуць сябе часткай актыўнай групы, якую расейскі этноляг Леў Гумілёў назваў кастай пасіянарыяў, альбо нацыянальнай эліты, як яна сама сябе называе.

Ачоліць пасіянарную эліту могуць ня толькі фармальныя лідэры, а, як паказаў сакавік 2006-га, і «людзі з натоўпу» — г.зн. індывіды пэўнага псыхалягічнага і мэнтальнага тыпу, здольныя да самаахвярнасьці. Паводле Гумілёва, калі сярод тысячы чалавек ёсьць сотня пасіянарыяў, дык гэтая група можа выйграць бітву, сысьці ў новыя землі альбо збудаваць горад на роўным месцы (чытай — намётавае мястэчка на асфальце пры –10 °C). Іншая рэч, ці дастатковыя суадносіны людзей пасіянарнага тыпу ў беларускім грамадзтве. Рэпрэсіі супраць моладзевых актывістаў і вулічныя акцыі — непазьбежны шлях для выяўленьня гэтага.

Беларус, пазбаўлены беларускамоўнай камунікацыі ў паўсядзённасьці, выходзіць на акцыі апазыцыі ў тым ліку і для таго, каб спрычыніцца да свайго, жывога, што ганьбіцца й аплёўваецца афіцыйнымі мэдыямі. І мова, як ключавы кампанэнт самаідэнтыфікацыі, тут набывае *сакралізаваны* характар. Пасьля, едучы дахаты, ён гучна папросіць кіроўцу маршруткі спыніцца на патрэбным прыпынку па-беларуску, чаго ня зробіць ужо заўтра, каб ня трапіць у няёмкае становішча белае вароны. Дарэчы тут прыгадаць словы Валянціна Акудовіча зь ягонага суплёту эсэ пад агульным назовам «Вялікая здрада» (гл. «Дзеяслоў» №12): *«...сам зварот да беларускага слова на Беларусі ёсьць ня чым іншым, як грамадзянскім учынкам (і яшчэ — эстэтычным актам). Ва ўсім сьвеце чалавек, размаўляючы на роднай мове, проста размаўляе. У нас зусім інакш. Кожны раз, калі на людзях мы прамаўляем па-беларуску, то ня проста сумовімся, а як бы ладзім грамадзянскую акцыю ці мастацкі пэрформанс, паколькі ўвага ўсіх, хто выпадкова апынуўся побач, адразу засяроджваецца на нечаканым дзіве».*

Такім чынам, Плошча становіцца сымбалічным месцам, сакральнай прошчай, якое няможна ганьбіць мовай каляніялістаў. Каб жа тыя тысячы, што, хай сабе й з памылкамі, перамаўляюцца тут па-беларуску, несьлі гэтую мову ў сем'і!

Таму, сп.Сяргею, мы ў чарговы раз катастрафічна падманваемся што да сапраўдных адсоткаў нашае беларускамоўнасьці. Мне ведама безьліч прыкладаў, калі чалавек, які рэпрэзэнтуе сябе як «сьведамы», удома карыстаецца расейскай моваю. Прыгадаю свой вопыт працы ў Саюзе пісьменьнікаў, калі, абзваньваючы чальцоў СБП, дзеля сплаты сяброўскіх складак, напачатку жахаўся, што іхныя сямейнікі не адказваюць па-беларуску. Ды і аўтар гэтых радкоў з бацькамі, сваякамі ды школьнымі сябрамі таксама размаўляе пераважна па-расейску. Рады быў бы пачувацца выняткам, але ж, пэўна, гэта правіла.

## Пад віскат Люсі Лушчык

Думаю, што мой шлях да беларускай мовы як сакральнай праходзілі і іншыя

# мысьленьня

людзі рознага веку. Для мяне ён пачаўся недзе з шостай клясы праз школьнага настаўніка беларускай. Тады віталася стварэньне розных пазаклясных літаратурна-гістарычных гурткоў, якія малады выпускнік філфаку арганізаваў і ў нас. Яны карысталіся вялікай папулярнасьцю і большасьць нашых хлопцаў зацята іх наведвалі. Цяпер, дарэчы, амаль усе яны працуюць у дзяржаўных структурах (МУС, УДАІ, падатковая...), а настаўнік пакуе сьняданкі ў шэнанскім аэрапорце. На беларускім шляху засталіся адзінкі. Парадокс? Ды гаворка пра іншае.

Да пэўнага ўзросту падавалася, што той, хто спрычынены да беларускасьці й размаўляе выключна па-беларуску, ледзь не сьвяты. Пазьней выявілася, што й тут досыць падлюкаў, але тое хлапечае пачуцьцё сьвятое павагі да мовы засталося й дасюль... І таму сёньня асабліва абражае нават ня тое, калі з школьных праграмаў выкідаюць творы Купалы, Быкава й «іншых нячэсных» (яно робіцца рукамі вандалаў і даўно прагназавалася), а віцебскі настаўнік беларускай мовы, пераможца «першага ў Беларусі рэаліці-шоў», які на ўсю краіну мацюкаецца пад адпаведны віскат Люсі Лушчык.

## Па-за каляінай каляніялізму

Існуе распаўсюджаная думка, зь якой цяжка не пагадзіцца, што засільле расейскага мату й іншых «браткоўскіх» праяваў у нашым побыце — вынік глябальнага мэдыяціску ўсходняга суседа, які адчувальны нават у эўразьвязаўскай Польшчы (прыкладам, мацюкі ў моладзевай лексыцы). Цяпер цалкам нармалёва пачуць у транспарце, на вуліцы, школьнай клясе ці студэнцкай аўдыторыі нават ня лаянку — размову матам у прысутнасьці дзяўчат ці нават ад саміх дзяўчат.

Неяк падумалася, што ў Беларусі можна вылучыць дзьве сацыяльныя групоўкі, што могуць прэтэндаваць на «эўрапейскасьць» праз супраціў гэтаму ціску. Абедзьве ідэнтыфікуюцца па моўнай дамінанце. Гэта беларускамоўная моладзь і... глухія. Апошнія, як правіла, кідаюцца ў іншую крайнасьць, становячыся адэптамі розных таталітарных сэктаў ці дэнамінацыяў.

Беларусы — інтравэртная нацыя. А той, хто абірае шлях па-за каляінай каляніяльнай «культурнай парадыгмы», — інтравэрт ды нонканфарміст у кубе. Праз тое, пэўна, беларусы ня ўмеюць дамаўляцца й ахвяраваць уласнымі амбіцыямі дзеля агульнае справы (самаарганізацыя на Плошчы — сапраўды дзівосны вынятак). Пры гэтым дзейнасьць паводле прынцыпу «бі сваіх, каб чужыя баяліся», тлумачыцца «дасягненьнем высокай экалёгіі творчага асяродзьдзя» (словы Валера Булгакава з форуму радыё «Свабода»).

## «Паляпшэньне экалёгіі»

Яшчэ адзін прыклад з саюзапісьменьніцкага досьведу. Пры канцы 2005 г. да нас зьвярнуліся з просьбай паспрыяць у арганізацыі залі для беларускай ёлкі ў Доме літаратара. Было вырашана правесьці сьвята ў фае каля прыёмнага пакою Саюзу пісьменьнікаў — гэтак званым Холе Славы (там, дзе вісяць фатаздымкі літаратараў-франтавікоў). За тры гадзіны да пачатку выявілася, што побач ладзіцца «карпаратыўная ёлка» — са скокамі ды калёнкамі, што выводзяцца ў Хол (нармалёвая практыка: фатаздымкі франтавікоў завешваюць і п'юць-гуляюць). Даводзіцца тэрмінова весьці перамовы з адміністрацыяй Дому аб іншым месцы. Адзіны варыянт — вялікая актавая заля, дзе ўрэшце ўсё і адбываецца (цалкам бясплатна!). Лепшага цяжка і ўявіць. Але ж не — прыходзяць і з выглядам абражанае годнасьці пытаюцца: чаму не паводле запланаванага сцэнару, чаму ўваход з чорнага ходу і хто ў тым вінаваты. Вядома, безь ніводнага дзякуй. Нібыта не зразумела, на якіх правах знаходзіўся ў сваім Доме Саюз і як даваліся ўсе тыя дамовы з адміністрацыяй (але ж даваліся цягам апошніх судовых-акупацыйных гадоў, калі, ізноў жа бясплатна, зладзілася сотня літаратурных вечарынаў).

Вось і сам сп.Богдан прызнаецца, што не чакаў «такой значнай варожай рэакцыі» з боку чытачоў сайту «НН» на сваё «пазытыўнае мысьленьне». Ня маючы нічога супраць апошняга, гэтым водгукам хацелася б засьцерагчы ад галавакружэньня ад посьпехаў, уласьцівага адраджэнцам і 1920-х, і пачатку 1990-х, якія ў аднолькавай ступені замыкаліся ў сваіх нацыянальных праектах.

## Апошні шанец для «тэхнароў»

Дарэчы, герой М.Гарэцкага меў куды больш рэальныя падставы для аптымізму. Сёньня студэнты тэхнічнага ВНУ, дзе я выкладаю беларускую мову, на пытаньне, хто летась намінаваўся ад Беларусі на Нобэлеўскую прэмію, адзінагалосна адказваюць: Васіль Быкаў. Натуральна, ня ведаюць яны ні пра «НН», ні пра іншых «кітоў» сп.Богдана.

Узровень веданьня мовы катастрафічны (пры тым што палова пісала ўступнае тэставаньне па-беларуску і прахадны бал там даволі высокі), але стаўленьне да прадмету ў цэлым пазытыўнае і цікавасьць да беларускага непадробная. Дарэчы, з наступнага году дысцыпліна «Беларуская мова: прафэсійная лексыка» разам зь іншымі «гуманітарнымі» зьнікне з навучальных плянаў тэхнічных ВНУ. Ня будзем зараз абмяркоўваць рэальную карысьць гэтага курсу, але тое была ці не апошняя магчымасьць для «тэхнароў» выйсьці з вышэй названае каляіны.

## Каб не праспалі!

Разумею, што толькі стаўлю пытаньні, але адказаў няма і ў тых, хто заклікае да чарговае самаізаляцыі. Так, сп.Богдан, з аднаго боку, ставіць у прыклад дзеяньні габрэяў «у неспрыяльных умовах чужынскае адміністрацыі», а зь іншага — гаворыць пра сьвядомую ідэнтыфікацыю Нацыі. Напраўду, «людзі на месцах» куды болей «у думках з намі», чым многім падаецца. Вядома, яднаньне ня мусіць адбывацца такімі «вясёлымі» мэтадамі, як на вядомай налепцы да сёлетняга Дня Незалежнасьці. Мусім шукаць балянс і сілы дзеля таго, каб працаваць зь існымі людзьмі ды адміністрацыямі.

Тут, паводле лёгікі й законаў жанру, трэба ўзяць маралізатарскі тон і распавесьці нарэшце, як жа трэба жыць і дзейнічаць. Ды наўрад ці тое патрэбна і безь мяне адукаванаму-прасунутаму чытачу «НН». Завяршу свой водгук заклікам да айчынных інтэлектуалаў у духу настаўніка Канцавога: годзе ўжо з нас элітаршчыны; будзьма бліжэй да патрэбаў паспалітага люду — і тады не праспім чарговае мары, калі, дасьць Бог, пабачым яе шчэ раз.

**Анатоль Івашчанка**

# Што беларусам да Ўмару Яр'Адуа?

Нігерыя, ад становішча ў якой залежаць сусьветныя цэны на нафту, абрала новага прэзыдэнта.

Беларусы зьвяртаюць увагу на падобныя краіны, толькі калі там адбываюцца надзвычайныя падзеі — напрыклад, выкраданьне беларускай грамадзянкі. Між тым, ад вось такіх краінаў, як далёкая Нігерыя, у пэўнай ступені залежыць і будучыня Беларусі.

Гэта краіна валодае 3% разьведаных у сьвеце запасаў нафты. А значыць, кожная зьмена сытуацыі ў ёй можа выклікаць ваганьні сусьветных цэнаў на энэрганосьбіты. Захаваньне цэнаў высокімі звужае магчымасьці выхаду Беларусі з-пад расейскае сатрапіі.

Нігерыя — магутная дзяржава і найбольшая па колькасьці насельніцтва краіна Афрыкі: кожны пяты афрыканец жыве ў Нігерыі. Выбары ў Нігерыі — падзея яшчэ і таму, што да гэтага часу яны бывалі вельмі рэдка. З 46 гадоў незалежнага існаваньня амаль 30 Нігерыя правяла пад кіраўніцтвам дыктатараў.

Эпоху тыраніі завяршыла ці, прынамсі, перапыніла сьмерць апошняга дыктатара Сані Абачы ў канцы 90-х і першыя свабодныя выбары ў траўні 1999 г., калі прэзыдэнтам краіны стаў Алусэгун Абасанджа, адстаўны генэрал і былы ваенны дыктатар 70-х. Ён быў першым вайскоўцам у гісторыі Нігерыі, які сам аддаў уладу цывільным.


Умару Яр'Адуа галасуе.

Суботнія выбары былі першымі, у выніку якіх адзін цывільны прэзыдэнт аддаў уладу другому цывільнаму. І хаця гэтая замена ў прэзыдэнцкім палацы Эса Рок у Абуджы абвяшчалася як трыюмф дэмакратыі, нігерыйцам далёка да сьвяточнага настрою.

Шмат хто ў Нігерыі падазрае, што замена кіраўнікоў дзяржавы — усяго толькі спэктакль.

Ня маючы права абірацца на трэці тэрмін, прэзыдэнт Алусэгун Абасанджа, які кіраваў дзяржавай з 1999 г., асабіста выбраў сваім пераемнікам 55-гадовага, хваравітага і ня надта вядомага губэрнатара аднаго з паўночных штатаў Умару Яр'Адуа.

Яр'Адуа і стаў пэўным фаварытам. З 23-х ягоных супернікаў рэальную вагу мелі толькі два — віцэ-прэзыдэнт Атыку Абубакар і былы вайсковы тыран генэрал Мухамаду Бухары, які кіраваў Нігерыяй на чале хунты ў 1983—1985 гадах. Аднак ход і вынікі папярэдніх выбараў губэрнатараў і парлямэнтаў штатаў паказалі, што Абасанджа і ягоная кіраўнічая Народная дэмакратычная партыя робяць усё, каб забясьпечыць інтранізацыю свайго фаварыта. На іх дэмакраты выйгралі ў 29 з 36 шта-




# Як зьмянілі Польшчу




Хуткі эканамічны рост, мільярдныя інвэстыцыі і дзясяткі тысячаў маладых палякаў, якія працуюць у краінах старога Эўрасаюзу — так выглядае Польшча праз тры гады пасьля ўваходу ў Эўрасаюз. У 2004 годзе 62% палякаў падтрымлівала ўступ у ЭС. На сёньня такіх ужо 87%.

За гэтыя тры гады нават эўраскептыкі зразумелі, што ЭС можа прынесьці сапраўды шмат карысьці. Нават зацяты эўракрытык з радыё «Марыя» айцец Тадэвуш Рыдзык хоча атрымаць у межах праграмы «Інавацыйная эканоміка» 23 млн эўра на разьвіцьцё заснаванай ім навучальнай установы — Вышэйшай школы сацыяльнай і мэдыйнай культуры. У тым, што грошы з ЭС у парадку, ня трэба нікога пераконваць: за эўра палякі рэалізуюць сёньня больш як 56 тысячаў праектаў: будуюць дарогі, рамантуюць чыгунку, адкрываюць школы і ачышчальныя збудаваньні. У цэлым да канца першага кварталу 2007 г. з Брусэлю ў Польшчу паступіла больш за 13,02 млрд злотых — каля 39% усіх грошай, якія меліся паступіць для наладжваньня гаспадаркі ў пэрыяд 2004—2006 (іх можна выкарыстоўваць да канца 2008 г.).

Між іншым і дзякуючы ім польская эканоміка разьвіваецца найбольш хутка за апошнія амаль дзесяць год — у 2006 г. эканамічны рост склаў 6,1%, у гэтым годзе ён, магчыма, будзе нават яшчэ больш хуткім.

Аднак у момант уваходу Польшчы ў ЭС усё было ня так радасна.

### Рэкорды прадпрыемстваў

Перад самым далучэньнем палякі моцна нэрваваліся — шмат хто чакаў росту цэнаў, між іншым, і беручы пад увагу тое, што неабхо-

таў. «Гэта фарс і злачынства», — заявіў Атыку Абубакар ад імя Партыі дзеяньня, другой па велічыні апазыцыйнай групоўкі ў краіне побач з Усенігерыйскай народнай партыяй Бухары.

Сябры выбарчых камісіяў яшчэ да адкрыцьця ўчасткаў запіхвалі ў урны папярэдне запоўненыя бюлетэні, каб гарантаваць перамогу таму, каму трэба. Юнакі з бандаў, якіх наймалі палітычныя партыі — як кіруючыя, так і апазыцыйныя, — ладзілі вулічныя бойкі, каб скрасьці заплямбаваныя скрынкі. Такім чынам быў ануляваны голас самога прэзыдэнта Абасанджа. З участку ў Татора/Сакоры ў штаце Агун, дзе ён галасаваў, скралі восем скрынак. Паліцэйскія знайшлі сем, але няма пэўнасьці, ці перад вяртаньнем іх выбарчай камісіі ў іх не дакінулі падробленых галасоў.

У тыя выходныя ў цэлай Нігерыі ў сутычках загінула паўсотні людзей. Узбуджаныя выбаршчыкі спалілі шмат выбарчых участкаў, у адным зь іх жыўцом згарэў чалец выбарчай камісіі. «Улады нас цалкам ашукалі. Гэтыя выбары не былі ані сумленнымі, ані свабоднымі», — заявіў Пітэр Такірамбудэ, кіраўнік афрыканскага дэпартамэнту Human Rights Watch.

Нігерыйская апазыцыя абвясьціла, што не прызнае вынікаў выбараў губэрнатараў і парлямэнтаў штатаў, і за тры дні да прэзыдэнцкіх выбараў запатрабавала перанесьці гэтыя выбары і правесьці іх з удзелам міжнародных назіральнікаў. «Няма сэнсу ўдзельнічаць у выбарах, пераможца якіх ужо вядомы», — крычаў Атыку Абубакар і заяўляў, што, калі ўрад не перанясе суботнія выбары, ён будзе заклікаць да байкоту. Аднак урад і чуць не хацеў нічога пра перанос выбараў.


**Нігерыя валодае 3% сусьветных запасаў нафты.**

Яшчэ да выбараў можна было з пэўнасьцю казаць, што пераможцам іх будзе Яр'Адуа. Як і тое, што апазыцыя не прызнае вынікаў выбараў. Паводле афіцыйных дадзеных, Яр'Адуа атрымаў у суботніх выбарах у 4 разы болей галасоў за генэрала Мухамаду Бухары.

Супернікі Яр'Адуа згодныя з тым, што гэта чалавек зь бездакорнай сумленнасьцю — рэдкая сярод нігерыйскіх палітыкаў рыса. Гэтак жа згодныя яны і з тым, што той будзе марыянэткай у руках Абасанджа, які такім чынам здолее захаваць уладу.

Падобны манэўр выкарыстоўвалі апошнімі гадамі ў Афрыцы шмат якія прэзыдэнты, якім канстытуцыя забараняла кіраваць больш за два тэрміны. Аднак хутка выяўлялася, што падстаўныя асобы, заняўшы прэзыдэнцкае крэсла, рабіліся незалежнымі ад сваіх дабрадзеяў, а нярэдка і абарочваліся супраць іх. Гэтак было ў Намібіі, Замбіі, Малаві.

Жыхары 140-мільённай Нігерыі, адной з найбольшых у сьвеце нафтавых дзяржаваў, спадзяюцца, што Яр'Адуа таксама не акажацца маляваным каралём, а ў Абуджы ён будзе кіраваць гэтак жа сумленна і справядліва, як і ў родным Кацыне. Там Яр'Адуа праславіўся як адзін зь нешматлікіх у цэлай краіне губэрнатараў, які ніколі не абвінавачваўся ў карупцыі, кумаўстве і памкненьні да асабістай выгады, якія, як зараза, точаць нігерыйскую дзяржаву.

Ацэньваецца, што на працягу амаль паўстагодзьдзя нігерыйскія кіраўнікі скралі зь дзяржаўнай скарбніцы каля 400 млрд даляраў.

Амэрыканскае ЦРУ ў дакладах для Белага дому з пэўнага часу б'е трывогу, што раскрадзеная Нігерыя ўсё меней нагадвае нармальную дзяржаву, і гэта проста цуд, што яна яшчэ існуе.

**Паводле артыкулу Войцеха Ягельскага, gazeta.pl**

# тры гады ў Эўрасаюзе

дна было выраўняць узровень ставак ПДВ. Такім чынам з паліцаў зьнікала арматура і кафля, будаўнічыя матэрыялы і цукар. Закупкі палякаў прывялі ў рух эканоміку, якая ў І і ІІ квартале 2004 г. разьвівалася з хуткасьцю 6—7%. Гэта, аднак, выклікала ў наступных месяцах рост інфляцыі да 4% за год. Сытуацыю вымушана была ратаваць Рада грашовай палітыкі, павышаючы працэнтныя стаўкі і ахалоджваючы такім чынам эканоміку.

Аднак з пачатку 2005 г. эканамічны лякаматыў зноў пачаў рухацца хутчэй галоўным чынам дзякуючы імкліваму росту экспарту. «Пасьля ўваходу ў ЭС надышла экспартная экспансія польскіх фірмаў: фірмы, што дзейнічаюць у Польшчы, змаглі павялічыць аб'ём продажаў за мяжой, нягледзячы на тое, што эўрапейская эканоміка не знаходзілася тады ў стадыі буму», — кажа Пётар Каліш, эканаміст Гандлёвага Citibank'у. І менавіта экспарт, асноўным чынам у краіны ЭС, доўгі час быў галоўным маторам польскай эканомікі — ён рос з хуткасьцю больш як 20% за год. «Уваход у ЭС значна спрасьціў вядзеньне эканамічнай дзейнасьці польскімі фірмамі за мяжой, прадпрымальнікі маюць цяпер таксама большы ўплыў на фармаваньне правілаў, між іншым, пры дапамозе галіновых арганізацыяў, што дзейнічаюць у Брусэлі», — кажа Аркадыюш Протас, віцэ-старшыня «Business Centre Club».


**Гэтае прадпрыемства атрымала датацыю ад ЭС.**

У мінулым годзе фірмы, што дзейнічаюць у Польшчы, адзначылі рэкордныя фінансавыя вынікі.

Працяг на старонцы 34.

# Як зьмянілі Польшчу тры гады ў Эўрасаюзе

Працяг са старонкі 33.

Рост спажываньня ў Польшчы і попыт на польскія тавары за мяжой прывялі да таго, што фірмы працавалі на ўсю моц. На шчасьце, у мінулым годзе нарэшце моцна вырасьлі інвэстыцыі, якія сталіся чарговым рухавіком, што штурхае эканоміку наперад. Прадпрыемствы карысталіся пры гэтым эўрасаюзнымі сродкамі, хоць дастаць грошы з Брусэлю было зусім нялёгка. Тое, што польскім прадпрымальнікам патрэбны капітал, было бачна голым вокам: яны падалі заявак на нашмат большую колькасьць грошай, чым можна было ўзяць!

Аказалася таксама, што выкарыстаньне эўрасаюзаўскіх датацыяў найлепш атрымліваецца акурат у прадпрымальнікаў і муніцыпалітэтаў. Менавіта яны кінуліся на датацыі: дарогі, масты, рамонты школаў, навучаньне — гэта ўсё зьяўляецца ў рэгіёнах менавіта дзякуючы рашучасьці муніцыпалітэтаў.

Але мінулы год быў таксама рэкордным з улікам наплыву непасрэдных замежных інвэстыцыяў (14,7 млрд даляраў). Эканамісты падкрэсьліваюць, што калі б Польшча не была ў Эўрасаюзе, то хутчэй за ўсё яна не дасягнула б такога выніку.

Для японскіх ці карэйскіх інвэстараў знаходжаньне Польшчы ў ЭС азначае ў першую чаргу большую бясьпеку інвэстыцыяў пры адносна нізкіх коштах працы, а па-другое — неабмежаваны доступ да больш як 400-мільённага эўрасаюзнага рынку. Між іншым, праз гэта канцэрны з усяго сьвету і будуюць у Польшчы новыя заводы па вырабе бытавой тэхнікі і разьмяшчаюць свае сэрвісцэнтры.




**«...Як дабрацца да касы?» — польскія прадпрымальнікі падалі заявак на нашмат большую колькасьць эўраграшай, чым можна было ўзяць!**

## Ёсьць і выдаткі

Аднак тры гады знаходжаньня ў Эўрасаюзе маюць таксама і мінусы. «Вельмі сур'ёзны мінус — адплыў працаўнікоў за мяжу, часьцей за ўсё маладых і адукаваных», — кажа Аркадыюш Протас. Паводле розных ацэнак, з Польшчы ў апошнія гады выяжджалі на працу ад некалькіх сотняў тысячаў да нават 2 млн людзей. Шмат хто зь іх застаўся за мяжой. «З пункту гледжаньня працадаўцы, гэта значна пагоршыла сытуацыю на рынку працы, аднак з пункту гледжаньня працаўніка, стала лепш», — лічыць Пётар Каліш.

Многія палякі аддавалі перавагу працы ў Ірляндыі ці ў Вялікабрытаніі, бо там можна зарабіць нават у 5 разоў болей, чым у Польшчы. Ярэк з Бранева толькі сёлета зьехаў у Эдынбург на працу ў роварную краму, аднак працу ён знайшоў без асаблівых праблемаў. «Тут мэханік — самая паважаная асоба ў краме, зусім ня так, як у Польшчы», — кажа ён.

У Польшчы за тры гады ўзровень беспрацоўя ўпаў з 19,5% у траўні 2004 г. да 14,4% у сакавіку гэтага году. На думку эканамістаў, з аднаго боку, гэта вынік добрай каньюнктуры і ўсё большай патрэбы ў працаўніках з боку прадпрыемстваў, зь іншага боку — заробкавай эміграцыі палякаў. Недахоп спэцыялістаў у некаторых галінах польскай гаспадаркі ўжо выклікаў моцны рост заробкаў, між іншым, у будаўніцтве. Працаўнікі, якіх у Польшчы гадамі недаацэньвалі і якім мала плацілі, зрабіліся цяпер на вагу золата.

Далучэньне Польшчы да ЭС супала па часе зь вялізным бумам на будаўнічым рынку. Палякі масава кінуліся набываць жытло, карыстаючыся нізкімі працэнтнымі стаўкамі і ўсё больш даступнымі крэдытамі. Аднак зноў жа свой унёсак у гэтую гістэрыю зрабіла далучэньне да ЭС і адкрытасьць замежнаму капіталу. Бо немалую частку кватэраў купляюць інвэстары з Ірляндыі ці Гішпаніі, уздымаючы такім чынам кошты на жытло. На працягу трох гадоў сярэднія кошты на жытло ў сталіцы вырасьлі ў два разы з 4 да 8 тыс. злотых за кв.м.! Падобны рост адбыўся і ў іншых буйных польскіх гарадах.

## Што далей?

Тое, што першыя тры гады знаходжаньня ў ЭС удалося някепска выкарыстаць, — толькі ўступ да ўдзелу ў клюбе найбольш разьвітых дзяржаваў. Бо, насамрэч, пра тое, ці стане Польшча сучаснай, вырашаць наступныя сем гадоў.

Менавіта на 2007—2013 гады для Польшчы запляпаваны найбуйнейшы шанец на разьвіцьцё, пра які іншыя краіны ў стадыі разьвіцьця могуць толькі марыць. Гэта сродкі Эўрасаюзу, якіх у Польшчу трапіць больш за 67 млрд эўра. Гэтых грошай палякі здолелі дабіцца падчас абмеркаваньняў бюджэту ў Брусэлі. Сёньня Польшча вядзе перамовы з Эўракамісіяй пра тое, як іх дакладна патраціць, — калі скончыць, то можна будзе пачаць выдаткоўваць.

Большасьць — звыш 21 млрд эўра — Польшча хоча інвэставаць у інфраструктуру: дарогі, чыгунку, аэрапорты, газавыя трубы і г.д. За эўра, якіх ніколі раней ня бачылі, палякі мусяць зьдзейсьніць цывілізацыйны скачок. Ня толькі ў сфэры інфраструктуры — але таксама і робячы стаўкі на інавацыйныя фірмы, інвэстуючы ў найноўшыя тэхналёгіі.

**Вольга Данішэвіч**
**паводле gazeta.pl**

# Чытач «НН» 100 гадоў таму

Пра лёс Міколы Аношкі з-пад Даўгінава пішуць **Мікола і Ўсевалад Сьцебуракі.**

І ў чарговы раз пераконваемся, што «Наша Ніва», безь перабольшаньня — гэта нацыянальная гісторыя. Гісторыя ў навінах і рэпартажах, вершах і лістах. Па азначэньні Сяргея Дубаўца (які і сам стаў постацьцю ніўскай гісторыі), «НН» – гэта нацыянальны эпас беларусаў».

Бо «НН» — рэзультат супольнай працы ня толькі рэдакцыі, але і чытачоў, што зьяўляліся і суаўтарамі, і фундатарамі, і героямі артыкулаў.

Імёны некаторых шанаваныя, склалі нацыянальны пантэон (Купала, Багдановіч, Цётка), імёны большасьці час не данёс да нашчадкаў. Але сама газэта вяртае зь нябыту нам прозьвішчы тых, хто ў мястэчках і вёсках чытаў «НН»...

Гартаючы факсыміле, трапілі на згадку пра Міколу Аношку, жыхара вёскі Аношкі, што пад Даўгінавам на Вялейшчыне. Да яго зьвярталіся мясцовыя мужыкі ў нястачы, і ён дапамагаў ім зарабіць грошай, даючы якую працу. Старыя насельнікі сучасных Аношак ня памятаюць якога пана ці заможнага селяніна з такім імем.

А ў «НН» знайшліся яшчэ аж пяць артыкулаў, прысьвечаных яму, што зьяўляліся ў 1908—1910 г.

Першая па часе згадка — уласна яго ліст у рэдакцыю, з просьбай дапамагчы з пошукам тэхналёгіі вырабу мыла. Сам па сабе ліст застаўся б шараговай зьявай, калі б хутка ў газэце не прайшла інфармацыя, што партыя мыла, зробленая на спробу ў селяніна Аношкі, выйшла выдатная. Гэта паведамляецца ў лісце карэспандэнта Сосенскага зь мястэчка Даўгінава. (Той В.Сосенскі яшчэ адкрыў для літаратуры Зьмітрака Бядулю, паведаміўшы пра яго здольнасьці «НН» і наладзіўшы сувязь маладога Самуіла Плаўніка зь беларускай газэтай.)

Карэспандэнт Сосенскі называе Аношку мудрым і справядлівым чалавекам, да якога гарнуліся людзі.



АРХІЎ У.СОДАЛЯ

Апісвае яго як асобу, што імкнулася да ведаў і сьвядомасьці ня проста праз чытаньне кніг, але праз зацікаўленьне фізыкай, матэматыкай, філязофіяй і іншымі навукамі. Аношка, са словаў Сосенскага, меў кемлівасьць да прадпрымальніцтва і хоць сам жыў бедна, дапамагаў аднавяскоўцам у нястачы, ды не пазыкай грошай, а разумнай арганізацыяй працы — «*ці гліну капаць паставіць, або каменьне вазіць, і было на кавалак хлеба*».

Распавядаецца і пра тое, што Мікола Аношка сам пісаў «аб *будынках з вапны і пяску*» ды, зь яго ўласных словаў, меў намер напісаць у газэце «*аб рэлігіі, аб торфе, аб гнаю, як рабіць мыдла маім спосабам і яшчэ шмат чаго*». Газэта, што апісваецца ў лісьце, — безумоўна, «Наша Ніва».

Праўда, тое паведамленьне Сосенскага ў «НН» за 1909 г. сталася «in memoriam» па М.Аношку, які пакінуў гаротны сьвет у 40-гадовым узросьце. «НН» згадвае М.Аношка і падчас апошняе сустрэчы з аднавяскоўцамі, што зайшлі праведаць моцна хворага «*на рэўматызм*» суседа: «*Падайце мне маю газэту, пэўне, жонка яе прынесла з Даўгінава...*» Пакуль паслалі па ксяндза, Мікола размаўляў з мужыкамі пра патрэбу ў навуцы і кнігах і «*яшчэ гаварыў аб свабодзе, аб усём... і гэтак ён казаў, што і каменьне б плакала, ня толькі чалавек... Скора прыйшла жонка з «Нашай Нівай»... Адны́мі з апошніх словаў перад сконам, што сказаў Мікола Аношка, былі наступныя: «Няхай Бог дасьць здароўя ўсім, хто працуе дзеля нашага краю*».

Апошняя згадка пра нашага героя — допіс у №13 за 1910 г. Сосенскі піша пра гаротную жытку сялян вёскі Аношкі, і дадае, што цяпер «*агледзеліся людзі, як даўней часта несправядлівы былі да нябожчыка Міколы Аношкі. Даўней — няма заработкаў — да Аношкі... а цяпер ня толькі скончыліся заработкі, але нават няма ў каго нашай беларускай газэтай «Нашай Нівай» пажывіцца, бо, хоць стыдна прызнацца, нашы сяляне неяк ня могуць сабрацца, каб скінуцца па колькі капеек і выпісаць газэту*».

...Такім са скупых зацемак аматарскіх карэспандэнцый паўстаў перад намі шараговы беларускі селянін, чытач «Нашай Нівы» пачатку стагодзьдзя зь яго марамі і расчараваньнямі, надзеямі на лепшае ў непраглядной цемры будзённасьці. У лёсе Аношкі адбіліся лёсы соцень тысяч «паноў сахі і касы», якія жылі, як усе, але спрабавалі «людзьмі звацца».

*Вялейка-Менск*

# Злосная клясыфікацыя

## заказны паклёпніцкі артыкул

*Звышсакрэтна*
*экз №_*
*Перад прачытаньнем — спаліць*

Плоцяць у калгасе мала. Апошні раз атрымаў 70 тысяч за месяц. Грошай на кілбасу не хапае. Але нядаўна прыяжджала вядомая журналістка Тацяна М., кілбасы прывезла. Сказала, трэба артыкул напісаць пра дэмакратычную прэсу і як яна да апазыцыі ставіцца. Тады яшчэ кілбасы прывязе. Газэты я зь дзяцінства люблю. І радыё слухаю. Чаму б і не напісаць? Што, я есьці хачу меней, чым які-небудзь прадажны журналюга? Але не пасьпеў спытаць у Тацяны, чаго хоча: каб я каго-небудзь хваліў ці лаяў? Падумаўшы, вырашыў, што калі б трэба было хваліць, то Тацяна напэўна б сказала — каго. Значыць — мачыць. Але каго? Вырашыў аблаяць усіх. Хай лішняе выкіне, а дзе трэба — назвы падставіць.

Як вядома з станоўчага досьведу майстроў заказной журналістыкі, найлепшы спосаб аблаяць як мага большую колькасьць народу — клясыфікацыя. Я вырашыў не выдумляць новага і правёў клясыфікацыю рупара ўсясьветнага імпэрыялізму. Глядзіце, што атрымалася.

### 1.Баявыя лісткі

Звычайна — бюлетэнь, які накладам 299 асобнікаў выдае кожная паважаючая сябе партыя для ўнутранага карыстаньня. Цікавы толькі яе актывістам і спэцслужбістам, якія на падставе перахопленых на пошце бюлетэняў пішуць дакладныя начальству, пачынаючы са словаў: «Как сообщил наш источник внутри...». Калі партыя багатая, партыйны баявы лісток набывае форму агульнанацыянальнае мэдыі. Нягледзячы на пастаянныя напаміны кшалту: «Мы —незалежная газэта (рэсурс)», партыйная лінія ўпарта выпірае зь яго. Таму ён нецікавы шырокай публіцы. Мне нават лаяць іх нецікава. Але пачакайце — дайце разагрэцца.

### 2.Газэта платных палітычных аб'яў

Гэта толькі зайздросьлівы піпл і асобныя філёлягі лічаць, што недзе за мяжой ёсьць нэгр, які друкуе на станку даляры (на БТ яго паказваюць штодня), і да гэтага нэгра з торбамі езьдзяць рэдактары апазыцыйных газэт і кіраўнікі апазыцыйных партый. На вялікі жаль, гэта няпраўда. Ніхто бедных рэдактараў нідзе не чакае, рэклямы не разьмяшчае, за паперу, друк, памяшканьне, тэлефоны ня плоціць. А яшчэ ж і есьці хочацца. Прыходзіцца блукаць па добрых людзях з працягнутай рукой. А вакол рэдакцыі натоўп апазыцыйных палітыкаў таўчэцца. У парлямэнт іх не пускаюць, па TV не паказваюць, за дэманстрацыі садзяць. Дзе ім яшчэ бедным таўчыся, каб пра сябе самых лепшых і пэрспэктыўных заявіць? Карацей, узьнікае канкурэнцыя за права ціскануць чарговую заяву ці лёсавызначальную падзею партыйнага жыцьця на старонках газэт. Натуральна, рэдактар кажа: хочаце, каб было дзе друкаваць вашыя заявы, дапамажыце газэце. Расцэнкі боскія. Можна выкупляць плошчу ўраздроб, можна браць палосамі. Не дапусьціць друкаваньня канкурэнта каштуе даражэй. Усе задаволеныя. Рэдактар — бо трэба выпрошваць менш грошай, палітыкі — бо дэманструюць сваю наяўнасьць, чытачы — бо газэта выходзіць і большая яе частка друкуецца ўсё ж не на замову. А ўлічваючы, што права выказацца мае кожны, хто заплаціў, і пэўны плюралізм назіраецца. Незадаволеныя толькі тыя, хто грошай ня мае. Але што вы ў палітыцы бяз грошай робіце? Зь іншага боку — зьдзейсьніце подзьвіг, і мы абавязкова напішам, колькі вам за гэта даў суд.

Карацей кажучы, цалкам уваходжу ў становішча, разумею і не асуджаю.

### 3.Надзімальнікі дзіравых паветраных шарыкаў

Прыватны выпадак папярэдняга, калі ў палітыка завяліся грошы, і ён гатовы значную частку іх патраціць на стварэньне свайго сьветлага вобразу. Звычайна гэта навічок у палітыцы, якому абламілася значная сума, і ён ня ведае, куды яе падзець. Структур, здольных зьесьці любыя грошы, за ім няма, застаецца прэса.

У гэтым выпадку палітыку ня трэба напружваць мазгі і самому нешта пісаць. На дапамогу прыходзяць прафэсіяналы-журналісты. Пасьлядоўна і мэтанакіравана (пакуль ня скончацца грошы) яны лепяць вобраз Героя — Адзінага Ўратавальніка Краіны (скарочана — ГАУК). Любы яго крок, рух, чых адразу робіцца на старонках мэдыяў падзеяй усясьветнага маштабу. Магчымыя канкурэнты патроху прышчэмліваюцца, у найлепшым разе замоўчваюцца. Мэдыя ператвараецца ў насос, які напампоўвае фігуру палітыка, як паветраны шар, да велічных памераў. Але ўсё добрае раней ці пазьней канчаецца. Грошы таксама. Як толькі «паліва» перастае трапляць у помпу, яна глухне. Фігура ГАУКа адразу пачынае зьдзімацца, вяртаючыся да ранейшых памераў. І потым яшчэ доўга палітычныя вятры ганяюць пустую абалонку з аднаго канца партыйнага спэктру ў другі.

### 4. Стваральнікі каралёў

Клінічны выпадак і вынік лягічнага разьвіцьця папярэдніх. Здараецца, калі журналісты, расчараваўшыся ў палітыках, бяруць справу ў свае рукі і вырашаюць самі скіраваць палітычны працэс да хуткай і бясспрэчнай перамогі дэмакратыі. Тут да матэрыяльнага кампанэнту дадаецца цьвёрдая ўпэўненасьць, што іх ГАУК — сапраўдны ГАУК. Калі ў папярэднім выпадку дапускаецца суіснаваньне на старонках адной мэдыі некалькіх ГАУКаў (абы плацілі), то тут сапраўдную манаполію атрымлівае толькі адзін. Усе ягоныя канкурэнты бязьлітасна зьнішчаюцца. Кожны рух ГАУКа — подзьвіг, любое дзеяньне яго канкурэнтаў (калі яно не ігнаруецца мэдыяй) — страшэнны правал. Нават рэпрэсіі злачыннага рэжыму ў адносінах канкурэнтаў ГАУКа справядлівыя і бясспрэчныя. Аналягічныя рэпрэсіі да неканкурэнтаў застаюцца злачыннымі.

І вось, надзьмутага да велізарных памераў ГАУКа выводзяць на рашучую бітву з гідрай рэжыму. Нагадвае праход баксэра-прафэсіянала да рынга. Героя суправаджае натоўп прыхільнікаў, трэнэраў, дарадцаў. Яны масіруюць яму біцэпсы-трыцэпсы, шэпчуць парады і адпіхваюць канкурэнтаў, якія пакрыўджана мармычуць, што яны б выступілі лепей. Гледачы вітаюць ГАУКа авацыямі. Ён ідзе, выкрыкваючы пагрозы і абразы ў бок гідры. Ён абяцае даць ёй промеж рагоў па лысай галаве, падраць на дробныя запасныя часткі, выкінуць на сярэдзіну шашы, бэсьціць апошнімі словамі ўвесь ейны род. І вось ён на рынгу. Замах... Напалоханая гідра заплюшчвае вочы і задам адпаўзае ў бок аэрадрому Мачулішчы, дзе ўжо гудуць маторамі самалёты, каб прыняць яе і залаты запас.

Але ў момант замаху з героем нешта здараецца. Я ўяўляю сабе гэта так. У адпаведнасьці з законамі жанру, усё яго жыцьцё праносіцца перад вачыма. Ён бачыць дзяцінства. Ён сядзіць на каленях у мамы (таты) у вясковым клюбе (летнім кінатэатры) і глядзіць на чорна-белы эк-

ран, дзе танчаць і сьпяваюць дзіўнымі галасамі босыя мужчыны з кругленькімі пузікамі ў белых кашулях і кальсонах, а таксама жанчыны з голымі таліямі ў складачкі... Карацей кажучы, героя раптоўна прабівае на гандзізм. Ён разумее, што ня можа проста так узяць і ляснуць жывую істоту па галаве. Рука бясьсільна апускаецца. Герой паварочваецца і зьнікае за сьпінамі канкурэнтаў, што штурхаюцца ззаду. Тыя, неспадзявана апынуўшыся сам-насам з гідрай, таксама імкнуцца за сьпіны іншых. Натоўп імкліва рассыпаецца. На плошчы застаюцца дзеці і жанчыны. Заслона.

Далейшае разьвіцьцё падзей магчыма паводле аднаго з двух варыянтаў.

Варыянт 1. Расплюшчыўшы вочы і ня ўбачыўшы небясьпекі, разьюшаная гідра разяўляе пашчу і... наш герой ператвараецца ў пакутніка. На старонках яго мэдыі надоўга завісае пытаньне з украінскага анэкдоту, якое задала «малесенко гарнесенко цуценятко Муму поганому москалю Герасіму»: «За что?» Пры кантактах з стваральнікамі героя ў мяне звычайна адбываецца наступны дыялёг:

Журналіст: Ну што, недаацаніў ты яго. Ты бачыў, як ён ішоў, як крычаў?

Я (наіўна): А што ж ня ляснуў?

Журналіст (зьбянтэжана): Ну дык... Нявопытны яшчэ.

Раіць яму наступнага ГАУКа спачатку патрэніраваць хоць бы на кошках я праз уласьцівую кожнаму калгаснаму сьлесару далікатнасьць не наважваюся.

Варыянт 2. Гідра ня вельмі напалохалася і ня вельмі раззлавалася на ГАУКа. Магчыма, ня так крычаў ці лёг у першым раўндзе, ці яшчэ што. ГАУК — жывы і на свабодзе. Яго мэдыя з рупару рэвалюцыі таксама ператвараецца ў пасьлядоўніка гандзізму. Уяўляю, як у рэдакцыі ў сары гуляюць босыя журналісткі з голымі таліямі (цікава, са складачкамі ці без?). Яны вядуць міжсобку дыскусіі. Як, напрыклад, маральна павесьціся ў выпадку нападу ў цёмным завулку, каб выпадкова не нанесьці фізычнай ці, крый Божа, псыхалягічнай траўмы ахвотніку да журналісцкага цела. Журналісты — таксама босыя мужчыны ў белых кашулях і кальсонах, але чамусьці бяз кругленькіх пузікаў, вітаюць адзін аднаго словамі: «Беларусь — Індыя: бхай-бхай».

Самы горшы выпадак, калі розныя мэдыі ствараюць розных ГАУКаў. Напрыклад, газэта NN стварае ГАУКа №1 і мочыць ГАУКа №2. А газэта WW, наадварот — стварае ГАУКа №2 і мочыць ГАУКа №1. У выніку чытачы-прыхільнікі ГАУКа №1 перастаюць набываць газэту WW, чытачы-пасьлядоўнікі ГАУКа №2 — газэту NN, а чытачы-непрыхільнікі ГАУКіяды — пасылаюць абедзьве газэты.

## 5. Лаяць усіх, каб выжыць

Безумоўна, кожная мэдыя цьвёрда ведае, каго ёй нельга чапаць. Напрыклад, табу для рэгіянальных мэдыяў — мясцовае начальства. Тыя, хто думалі па-іншаму, ужо ня з намі. Цэнтральныя мэдыі, акрамя пары інтэрнэт-рэсурсаў, ніколі ўсур'ёз не чапаюць ГБ, што наводзіць на сумныя развагі.

Хваліць рэжым і лаяць апазыцыю нельга — «СБ» гэта робіць лепш і каштуе меней, ды і аўдыторыю згубіш. Лаяць уладу і хваліць апазыцыю — закрыюць. Што ж рабіць? Выйсьце ёсьць: лаяць усіх — і ўладу, і апазыцыю. Тады і аўдыторыя застанецца, і ўлада не кране. Бо хто чытае такія газэты? Тыя, хто ўладу і так ня любіць. І тут яна нічога не губляе. Але разам з уладай апазыцыйныя чытачы пачынаюць не любіць і апазыцыю. Галоўнае, не саромецца, а аднолькава мачыць абодвух — і вас ніхто не кране. Гарантавана. Усе задаволеныя. Улада — тым, што мочаць апазыцыю сярод яе патэнцыйных прыхільнікаў. Прыхільнікі — тым, што можна супакоіць сумленьне і не выпаўзаць пад дручкі на плошчы на заклікі нейкай прыдуркаватай апазыцыі. Газэта — тым, што можа не баяцца ліквідацыі ды пры гэтым яшчэ ганарыцца сваёй мужнай апазыцыйнасьцю. Не задаволеная адна апазыцыя, ды гэта яе праблемы.

## 6. Ня лаяць нікога, каб выжыць

Такія мэдыі косяць пад салідныя эўрапейскія выданьні. Толькі інфармацыя, ніякай лаянкі. Чытачы вядуцца, пачынаюць лічыць газэту за саліднае ды аб'ектыўнае выданьне. Аўдыторыя расьце, запаўзаючы на нэўтральнае поле. І ў гэтым — галоўная небясьпека для такіх газэт. Калі колькасьць чытачоў перасягае нейкую крытычную мяжу, гідра рэжыму расплюшчвае адно вока і пачынае ім разглядаць гэтую газэту. Потым, пазяхнуўшы, зноў разяўляе пашчу і...

## 7. Дупло

Гэта калі газэта хоча вырашыць праблему фінансаваньня сваёй барацьбы супраць злачыннага рэжыму за кошт самога рэжыму. Яна арганізуе на сваіх старонках «дупло». Кожны служка рэжыму можа, заплаціўшы газэце, падкрасьціся ноччу, вывернуць праз гэта дупло вядро з брудам на галаву калегу па барацьбе за цёмную будучыню краіны. Той, ачомаўшыся, таксама бярэ вядро і, заплаціўшы, вядома, ноччу крадзецца да дупла.

Усе задаволеныя. Газэта — бо выходзіць і мае раскошу быць нэўтральнай да палітыкаў. Чытачы — бо за адны грошы атрымліваюць дастаткова аб'ектыўную газэту ды яшчэ задавальненьне назіраць за боем быкоў у стане чынавенства. Незадаволеныя адны служкі рэжыму, але гэта іх праблемы. Рэдактара такой газэты лёгка пазнаць па дыпламатычных прыёмах. Чыноўнікі, з асьцярогай паглядаючы, аб нечым шэпчуцца за яго сьпінай, а сам ён мае выгляд чалавека, які занадта шмат ведае пра людзей і таму крыху расчараваны ў жыцьці.

Але, зноў жа, нішто добрае не бывае вечным. Нарэшце служкі рэжыму разумеюць, што іх разводзяць. Яны ідуць да гідры рэжыму, падаюць на калені і доўга б'юцца галавой аб падлогу. Гідра разяўляе пашчу. Дупло забіваюць калодай і замазваюць цэмэнтам.

## 8. Сэксуал-дэмакраты

Вельмі цікавая газэта. Звычайна чытаць яе пачынаюць з апошніх старонак, дзе друкуюцца парады да сэксуальнага жыцьця, анэкдоты, фатаздымкі амаль што голых дзевак. Наталіўшы духоўную смагу, чытач вяртаецца да першых старонак, дзе знаёміцца з чарговымі злачынствамі рэжыму і чытае заклікі да барацьбы зь ім. Добра падыходзіць да сямейнага чытаньня, бо такую газэту чытаюць нават жонкі апазыцыянэраў. Як кажуць мудрыя людзі — усё ў жыцьці чалавека «счэплена з полам». Таму газэта цікавая для многіх, і яе аўдыторыя паступова расьце, ахопліваючы ўсё новыя шэрагі былых камсамольскіх актывістак бальзакаўскага ўзросту. Але галоўнае тут — пачуцьцё меры, густ. Калі дзеўкі на апошняй старонцы занадта агаленыя, а артыкулы на першай — занадта злосныя, узьнікае пачуцьцё дысбалянсу. Гэта як у часопісе «Плэйбой» надрукаваць апошні варыянт Стратэгіі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Хоць калі ў «Плэйбоі» ёсьць разьдзел «Мазахізм», дык... Стоп, мне гэта не замаўлялі.

Дысбалянс у газэце можа абразіць пачуцьцё суладнасьці ў пяшчотнай і так лёгка ранімай душы гідры рэжыму. Тады яна разяўляе пашчу і... газэта адпраўляецца ў астрал. Цьфу ты, у віртуал.

Ну, усё, хопіць — шэдэўр гатовы. Узважваю яго на далоні. Колькі атруты, ажно пальцы пячэ. І жоўць, сьцякаючы, капае долу, з шыпеньнем прапальваючы дзіркі ў падлозе. Ды тут ня толькі на некалькі кіляў сыравяленай, тут на добрую хатнюю паляндвіцу пацягне! Толькі б ня кінулі з ганарарам.

Таня М., дзе ты?

**Мікола, калгасны сьлесар з-пад Пухавіч. Красавік 2007 г.**

**Ці вы здагадаліся, хто аўтар гэтага фэльетону?**

# Перакладчык «Байцоўскага клюбу»: Мы да таго ідзём

У сёньняшняй Беларусі культурныя здабыткі часта зьяўляюцца не дзякуючы, а насуперак абставінам. Так выйшла і цяпер. Культавы раман амэрыканскага пісьменьніка Чака Паланюка «Байцоўскі клюб» на беларускую мову перастварыў не прафэсійны перакладчык, а студэнт–радыётэхнік. Зь **Сержуком Мядзьведзевым** гутарыць **Зьміцер Панкавец**.



Юлія Дарашкевіч

**«Наша Ніва»: Расказвай, кім ты ёсьць, бо пра цябе ўвогуле нічога не вядома.**

**Сяржук Мядзьведзеў:** Прыйшоў на сьвет 6 жніўня 1985 году ў радзільні №2 гораду Віцебску. Пасьля быў дзіцячы садок ад мясакамбінату, музычная школа (і цяпер, калі прыяжджаю дадому, магу ўзяць у рукі акардэон ці гітару), радыётэхнічны ўнівэрсытэт. Недзе зь сёмае клясы, пад уплывам сябра, пачаў цікавіцца інфарматыкай, таму і пайшоў у БДУІР. Я быў пэўны, што пасьля БДУІР заўсёды знайду сабе добрую працу, чаго ня скажаш пра філфак. Да таго ж бацька вучыўся таксама ў РТІ. Пераезд у Менск даўся досыць лёгка. Па-беларуску пачаў пісаць яшчэ ў школе. Цяпер падпрацоўваю праграмістам у «ЕРАМ». Жыву сёньняшнім днём.

**«НН»: Калі ня супраць, то давай пяройдзем да Паланюка. Ці ўсё ж да Паланіка/Палагнюка?**

**СМ:** У нас прозьвішча гэтага пісьменьніка прынята пісаць як Паланік, але калі ўлічыць ягоныя ўкраінскія карані, то правільней было б пісаць Паланюк. Таму ў маім перакладзе яго прозьвішча будзе гучаць менавіта як Паланюк. Хадановіч сказаў бы Паланік, але зь перакладчыкам не спрачаюцца. Некалі «Наша Ніва» пісала Чак Палагнюк.

**«НН»: Дык чаму заняўся перакладамі менавіта Паланюка?**

**СМ:** Усё пачалося на перакладчыцкай майстэрні пры Беларускім Калегіюме. Ужо на першай сустрэчы пайшло абмеркаваньне тых твораў, якія мы б хацелі перакладаць. Працаваць над нейкімі малымі творамі не хацелася. У мяне былі тры варыянты: Кен Кізі «Над гняздом зязюлі», Оруэл «Фэрма» і Паланюк «Удушша». Спыніўся на Паланюку, бо разважыў, што трэба перакладаць сучасьнікаў. Спн. Вольга Калацкая запыталася пазьней, чаму я хачу перакладаць «Удушша», а не «Байцоўскі клюб». Падумаўшы, я ўсё ж выбраў «Байцоўскі клюб». На другім курсе ва ўнівэрсытэце мы зьбіраліся перакласьці на беларускую мову фільм «Байцоўскі клюб». Пасьля пачалася ўласна праца. Памятаю, калі прыносіў першыя аркушы зь перакладамі. Мне сёньня за іх нават крыху сорамна. Дзякуй Вользе Калацкай, якая не забракавала мае спробы, а толькі заахвочвала далей працаваць над творам.

**«НН»: Колькі часу ты працаваў зь перакладам?**

**СМ:** Калі браць час ад пачатку да заканчэньня, то гэта 15 месяцаў. Праўда, былі пэрыяды, калі я ня браўся за пераклад месяц, а то і болей. Былі моманты, калі праца проста не ішла, што б ты ні рабіў. А бывала, што, наадварот, усё іш-

**Сяржук Мядзьведзеў**

нарадзіўся ў 1985 у Віцебску. Студэнт чацьвертага курсу БДУІР. Сёлета пераклаў на беларускую мову раман Чака Паланюка «Байцоўскі клюб». Пераможца літаратурнага конкурсу да 100–годзьдзя газэты «Наша Ніва».

ло добра. Напрыклад, апошнія 20 старонак я пераклаў за 3 дні. Ня тое, каб я ня верыў, што перакладу твор цалкам, але сумняваўся, бо не ў характары маім даводзіць справу да канца. У той самы час, калі зрабіў 80%, то зразумеў, што даб'ю яго. У мяне была ўстаноўка: калі я перакладу гэты раман, то, значыць, зраблю нешта вартае ў жыцьці. Цяпер застаецца дапрацаваць раман, адшліфаваць нейкія моманты. Да таго ж, у мяне значная частка перакладу зробленая на паперы, каля 70%, цяпер гэта трэба загнаць у электронны варыянт. Пасьля ўсяго гэтага застаецца толькі выдаць кнігу.

**«НН»: Чым цябе так захапляе Паланюк?**

**СМ:** Гэта, мабыць, адзіны аўтар, якога я прачытаў поўнасьцю, апроч публіцыстыкі. Ён прываблівае мяне нейкай бунтарскай энэргіяй. Прасторай свабоды.

**«НН»: На твой погляд, ці будзе «Байцоўскі клюб» цікавы ў Беларусі сёньня?**

**СМ:** У рамане вядзецца гаворка пра тое, як на фоне пасьпяховага капіталістычнага грамадзтва паўстае пласт насельніцтва, які ня згодны жыць па ранейшых каштоўнасьцях. Гэта найперш сярэдняя кляса — клеркі, мэнэджары. Яны ўзьнімаюцца на бунт. Гэтая нефармальная арганізацыя разрастаецца па ўсёй краіне. У канцы твору яны кантралююць ужо амаль усё. Зьнішчаючы буйныя кампаніі, яны спрабуюць зьнішчыць усю гэтую спажывецкую цывілізацыю. Калі ты зьнішчаеш усю інфармацыю пра крэдыты, то эканоміка пачынаецца з нуля. Урэшце, ствараецца досыць утапічная карціна: руіны Нью-Ёрку, ліяны на хмарачосах, ласі ходзяць па гарадох. У значнай ступені Паланюк іранізуе і з спажывецкага ладу, і з тых, хто спрабуе яго зруйнаваць. Гэта таксама нейкі бунт супраць сыстэмы. І ў нас, і ў іх сыстэма выкарыстоўвае мэтады татальнага кантролю, для кожнага грамадзтва яны свае. Натуральна, нам яшчэ далёка да амэрыканскіх рэаліяў з рынкам і ўсім такім, але паступова і мы ідзём да гэтага. У хуткім часе праблема спажывецкага грамадзтва можа стаць актуальнай і для Беларусі. Цікава, што Паланюк пісаў «Байцоўскі клюб», калі наведваў літаратурныя гурткі. Там зьбіраліся пісьменьнікі, быў нейкі вядоўца ўсяго гэтага ці настаўнік, які казаў, што да наступнай сустрэчы трэба напісаць, скажам, шэсьць старонак. Так, уласна, «Байцоўскі клюб» і паўстаў.

**«НН»: Ці не нагадвае табе гэта Беларускі Калегіюм?**

**СМ:** Нешта сапраўды ёсьць: калі нам патрэбна было пацьвердзіць статус студэнта, а ня вольнага слухача, мы пісалі эсэ, зачытвалі яго перад іншымі аднагрупнікамі, нам выстаўлялі адзнакі. Таму нейкія паралелі ёсьць.

**«НН»: Дык мо і ў цябе такім чынам народзіцца нейкі культавы раман?**

**СМ:** Пакуль што ў прозе мяне не хапае на вялікія творы. Хіба што напішу цяпер шасьцістаронкавае апавяданьне. У мяне ня той узрост, каб пісаць раманы. Для прозы патрэбны нейкі жыцьцёвы досьвед, а яго ў мяне пакуль малавата.

**«НН»: Дзе цябе можна пачытаць?**

**СМ:** Хіба толькі ў ЖЖ — siarzh.livejournal.com. Калісьці некалькі маіх вершаў друкавала «Наша Ніва», а таксама на сайце www.newlit.info.

**«НН»: Дзеля чаго ты вядзеш «Жывы журнал»? Што ён табе дае?**

**СМ:** Сябры падбілі на яго. Спачатку ня думаў, што так захопіць, бо некалі ў дзяцінстве вёў папяровы дзёньнік, але не сыстэматычна. Мне здавалася, што гэта ня мой фармат, але зацягнула. Мне ён дае да халеры пазытыву, таго, чаго мне не хапае ў рэальным жыцьці, дае мне кантакты зь цікавымі людзьмі. Гэта вялікая гульня, набліжаная да жыцьця. Гэта цікава і весела. Натуральна, зьявілася нейкая залежнасьць ад блогу, але яна не паталягічная.

**«НН»: Якія ёсьць пэрспэктывы з выданьнем раману?**

**СМ:** У нармальных краінах перакладчык атрымлівае грант. Ён перакладае і адпрацоўвае гэтыя грошы. Я ж пераклаў кнігу за ўласны кошт, уласнымі рэсурсамі. Я, натуральна, нічога за гэта не патрабую. Мне хацелася б, каб выданьне кніжкі не было маёй праблемай. Проста хочацца, каб «Байцоўскі клюб» пабачыў сьвет. Можа быць, прапаную ў «ARCHE», але хацелася б убачыць гэта асобнай кнігай.

**«НН»: Ці будзеш перакладаць фільм?**

**СМ:** Насамрэч 20% сцэнару фільму я пераклаў яшчэ на першым курсе. Дзесьці ён у мяне яшчэ захаваўся. Мне здаецца, што беларускі пераклад «Байцоўскага клюбу» мусіць пайсьці ня горш за тое ж «Крымінальнае чтыво». «Байцоўскі клюб» менш абцяжараны ненарматыўнай лексыкай, таму ў гэтым пляне працаваць будзе лягчэй.

**«НН»: І каго будзеш агучваць?**

**СМ:** Каго дадуць, таго і буду, але спадзяюся неяк паўдзельнічаць у агучцы. Хацелася б кагось з галоўных герояў.

**«НН»: Што плянуеш перакласьці зараз?**

**СМ:** У мяне ў стале ўжо ляжыць арыгінальны тэкст другога раману Паланюка «Удушша». Паланюка часта называюць аўтарам адзінай кнігі. Я абсалютна ня згодны. Таму, калі бліжэйшым часам мне не падвернецца нічога больш цікавага, буду перакладаць менавіта «Удушша».

**«НН»: Наколькі я ведаю, у той самы дзень ты атрымаў ліст ад самога Паланюка. Пра што ён табе напісаў?**

**СМ:** Адчыняю паштовую скрыню, а адтуль вылятае паперчына: «На вашае імя атрымана пасылка з ЗША». Скончыць працу над перакладам і атрымаць у адзін дзень пасылку ад Паланюка! У пачатку кастрычніка пабачыў абвестку: Чак Паланюк адчыняе паштовае акно для фанатаў. Трэ было даслаць ліст на адрас яго мэнэджара, і пісьменьнік адкажа асабіста кожнаму лістом або пасылкай. Я напісаў, як шчыры фанат, словы захапленьня, адзначыў, што перакладаю «Байцоўскі клюб», напісаў як складана было дастаць арыгінал, як цяжка ў нас з роднай мовай, папрасіў даслаць пару кніг. Я не спадзяваўся на адказ, пагатоў на пасылку. Усярэдзіне пасылкі быў ліст і штук 15 розных дробязей — цацачная морква a la кіндэр-сюрпрыз, калькулятар, плястмасавы адрэзаны палец, калядныя сьвечкі, насеньне незабудкі, два аўдыёдыскі зь ягонымі чытаньнямі падчас кніжных тураў, а таксама жывёла, якая сымбалізуе маю моц: маленькі плюшавы мядзьведзік. Паланюк сам у лісьце маркерам напісаў: «Your Power Animal is enclosed!!!» Прыемна. А ліст — тры маленькія абзацы — Паланюк напісаў асабіста. Даў пару карысных парадаў па жыцьці.

# Проста Кул



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Пра канцэрт «Neuro Dubel» у падпольнай закусачнай і дзень народзінаў Кулінковіча піша **Сяргей Будкін**.

Напярэдадні выступу гурту «Neuro Dubel» прайшла хваля забаронаў на канцэрты іншых беларускіх рокераў. У Мазыры адмянілі канцэрт з удзелам «Indiga», чыноўнікі з упраўленьня культуры Менгарвыканкаму адмовілі «Краме», быў забаронены сумесны канцэрт «Zet» і «IQ48». Апошнія ўсё ж выступілі ў іншым клюбе, але на арганізатараў склалі пасьля пратакол за «арганізацыю несанкцыянаванага мерапрыемства». Нават канцэрт барда Алеся Камоцкага ў Маладэчне адмянілі зь незразумелых прычынаў.

Сольны выступ «дзюбеляў» у пятніцу 28 траўня, прымеркаваны да 35-годзьдзя Аляксандра Кулінковіча таксама быў пад пытаньнем. Месца правядзеньня мянялася тройчы і канчаткова вызначылася за тры гадзіны да пачатку. Інфармацыя перадавалася з вуснаў у вусны. Без аніякай рэклямы ў адзін зь менскіх клюбаў набілася сто чалавек. А.Кулінковіч перад выступам выглядаў стомленым: «Колькі ўжо можна бегаць і хавацца?!» На танцпляцы яго гадзіну чакалі адданыя прыхільнікі — пачатак канцэрту пасунулі, каб пасьпелі сабрацца ўсе жадаючыя. На канцэртах «дзюбеляў» можна сустрэць і няпоўнагадовых панкаў, і прыстойна апранутых мэнэджэраў сярэдняга зьвяна. Як музыкі зайгралі «Вітальную», і тыя, і тыя насунуліся на невялічкую сцэну ды пусьціліся ў шалёныя скокі. Сэк'юрыці разышліся: ахоўваць «дзюбеляў» ад прыхільнікаў няма сэнсу.

На віншаваньні з народзінамі Кулінковіч рэагаваў стрымана: «Усё б аддаў, каб зноўку стаць дваццацігадовым». «Дзюбель» не зьмяняецца ўжо васемнаццаць гадоў. Хіба сам Кулінковіч, якога прыхільнікі завуць проста Кул, ужо меней скача па сцэне. Але усё адно на «ўра» заходзяць і старыя гіты, і новыя. На «Пераехала камбайнам» заля падхоплівае за другім вакалістам Паскудам немудрагелісты прыпеў: «Ла-ла-лай-ла-ла!» — разносіцца далёка за межы клюбу. Новую песьню пра пі..расаў, якія «п'юць гарбату і слухаюць Рацыю-FM», публіка жыва ўспрымае і сходу вучыць словы.

Сярод гледачоў, якія паразьбіралі нятаннае піва, ходзіць Алег Хаменка з кубкам гарбаты. Кулінковіч запрашае лідэра «Палацу» на сцэну, і яны зацягваюць «Гузік» на тры галасы. Градус весялосьці спадае толькі на сур'ёзных, трагічных песьнях — «Жыцьцё», «Край».

«Neuro Dubel» грае канцэрты на адным дыханьні — нон-стопам, які перарываюць хіба вершаваныя зацемы Кулінковіча пра прастытутку, што чакае «чырвонай арміі сыноў» і бусла — «сэкс-сымбаля Беларусі». Бескампрамісны выканаўца клянецца ў любові да краіны. Краіны, дзе вядучы рок-гурт вымушаны не афішаваць свае выступы ў падпольных закусачных.

# Каліноўскі як ідэоляг рэпу

Беларускамоўныя прыхільнікі рэп-музыкі займелі інтэрнэт-партал. На старонцы www.repka.pananieba.org абмяркоўваецца ідэя амэрыканскага прадусара забараніць рэпэрам брыдкасловіць, рэпэр Кроў тлумачыць, за што не паважае рэпэра Памідорава, а стваральнікі рэсурсу, якія называюць сябе Хвядот і Сьведак, не шкадуючы выразаў, чыхвосьцяць айчынных расейскамоўных рэпэраў. «Немагчыма нідзе выказацца напоўніцу так, як у рэп-творы. Словам можна забіць, дык чаму не скарыстаць гэтую зброю?» — разважае Хвядот, удзельнік гурту «PANaNieba».




У Беларусі — бум на рэп. Раней рэпэраў трэба было ўгаворваць, каб яны засьпявалі на роднай мове, а цяпер фармуюцца суполкі прыхільнікаў гэтага кірунку. Зьяўляюцца і запамінальныя творы — «Не!» ад «Партызанскай школы», «Вечна жывая» Вожыка і «Непераможныя» ад «Чырвоным па белым». На апошні трэк стваральнік «Мультклюбу» Алег Мініч днямі намаляваў кліп. «Беларускі рэп яшчэ не сапсаваны грашыма, у адрозьненьне ад амэрыканскага, таму нашы рэпэры не пяюць пра тое, на якой машыне яны ўчора езьдзілі. Іх цікавяць праблемныя моманты», — мяркуе Сьведак.

Хлопцы называюць стварэньне беларускамоўнага парталу пра гіп-гоп першым крокам да фармаваньня каліцы — музычнай ды ідэйнай. «І няхай нехта кажа, што няма сэнсу ў існаваньні такой рэчы, як беларускі гіп-гоп, мы ўсё адно будзем займацца сваёй справай. Добра казаў Кастусь Каліноўскі: «Ня трэба тысячы, каб пачаць, ня трэба двух, каб пачаць, і ня трэба аднаго, каб пачаць».

**СБ**

# Новы кліп «Крамы»

«Крама» прасьпявала па-беларуску знакамітую песьню «Pink Floyd» «The Wall». Пачуць яе і пабачыць кліп можна ў інтэрнэце, на сайце праекту «Мур» http://murproject.org. Калі адчыняеш сайт, бачыш абрыс Беларусі, закладзены цаглягай сьцяной. Аўтары праекту прапануюць разам тую сьцяну бурыць. Кожны наведнік можа «выняць» адну цагліну ў дзень. Ужо «вынята» больш за 11000 «цаглін».

«Вандроўкі па сайтах у сеціве могуць быць ня толькі забавай, але і часткай удзелу ў грамадзкай дзейнасьці, — кажуць у звароце ініцыятары праекту з суполкі Homo Faber. — Мы хочам перадаць асноўную інфармацыю пра праблемы з дэмакратыяй у Беларусі і адначасова паказаць, як можна (нават не жывучы у Беларусі) падтрымаць дзейнасьць. Мы



хочам, каб інтэрнэт-актыўнасьць стала першым крокам да грамадзянскае актыўнасьці ў рэальным сьвеце».

«The Wall» па-беларуску сьпяваюць ня першы раз. Летась на «Басовішчы» яе сьпяваў «Parason» — і перамог.

**СБ**




**Лешак Можджар** (Польшча)

## Вайцюшкевіч у беларуска-расейскім мюзыкле

Нашага музыканта запрасілі на галоўную ролю ў мюзыкле «ПророК». «Мне патэлефанавалі ад рэжысёра Януша Юзэфовіча і прапанавалі прыехаць у Варшаву на праслухоўваньне. Я прыехаў, прасьпяваў і атрымаў запрашэньне,» — распавядае Зьміцер.

Партнэрам Вайцюшкевіча будзе вядомы расейскі актор Ільля Алейнікаў. Менавіта ён напісаў музыку да мюзыкла і мусіць выконваць галоўную ролю Прарока. «Мы будзем граць па чарзе, — кажа Вайцюшкевіч. — Колькі спэктакляў адыграе ён, колькі я».

Зараз увесь свой час Вайцюшкевіч праводзіць на рэпэтыцыях, што праходзяць пад Варшавай. Сьпявак настолькі рэдка бывае на Радзіме, што нядаўна яго кватэру абрабавалі. Прычым злодзеі патрапіліся інтэлігентныя – нідзе нічога на разламалі, а толькі сьціпла прыхапілі з сабой рарытэтны клярнэт музыканта і ягоную ж дарагую цёплую коўдру. Зьміцер больш перажывае менавіта за коўдру. «Спадзяюся, крадзеж майго клярнэта пойдзе тольк на карысьць беларускай музычнай культуры, – жартуе Вайцюшкевіч. – Магчыма, яшчэ хоць хтосьці ў нас навучыцца граць на клярнэце».

## The Project засьпяваў на вершы Генадзя Бураўкіна

Беларускі поп-гурт «The Project» прасьпяваў на расейскім фэстывалі «Новая волна» гіт «Песьняроў» «Зачараваная» на верш Генадзя Бураўкіна. Паводле ўмоваў, кожны ўдзельнік конкурсу меў сьпяваць акром свайго твору сусьветны і постсавецкі гіты. «Мы згадалі пра цудоўны твор «Istambul (Not Constantinople)» і «Зачараваную». Як для мяне — гэта найлепшы выбар», — апавядае лідэр The Project Яўген Чалышаў (экс-Харлі). Дарэчы, выканаўца «песьняроўскага» твору — Валер Дайнека быў настаўнікам па вакалу ў Чалышава. Рэпэтавалі хлопцы свае нумары на кватэры ў Я.Чалышава. «Калі сыходзім ад Яўгена, дык суседзі ўжо з намі вітаюцца, пытаюцца, як ідзе падрыхтоўка», — сьмяецца чарнаскуры вакаліст «The Project» Фрэд.

**«Тузін Гітоў»**

# Віно

Адкуль яно?
Піша **Георгі Навіцыян.**

Насуперак таму, што кажуць аматары піва і моцных напояў, нашы продкі рана пакаштавалі смак віна і зьведалі яго ўплыў на цела і дух. Напэўна, смак віна стаў вядомы жыхарам беларускіх земляў яшчэ ў рымскія часы, бо рымскія купцы гандлявалі віном далёка за межамі сваёй імпэрыі. Спраўдзіць гэта цяжка, але вядома, што і пазьней віно прыйшло сюды найперш праз камэрцыю, а потым праз элітызм. Арабскі аўтар X стагодзьдзя Ібн Фадлан, апісваючы просты і разьняволены побыт русаў, распавядаў аб штодзённым (і штоночным) ужываньні імі напою «набід», у якім мы можам пазнаць віно. Вялікі заваёўнік князь Сьвятаслаў меркаваў перанесьці сваю сталіцу з Кіева ў Пераяславец на Дунаі, куды сыходзіліся тавары з усёй Эўропы, а ў тым ліку віно з Грэкаў. Калі Русь хрысьцілася ў 988 г., прычасьце і іншыя абрады пазнаёмілі зь віном люд паспаліты. Тады ж і закладаліся падставы мясцовых густаў да віна. Пераняўшы царкоўнае віно ад грэкаў, продкі нашы засвоілі і прыхільнасьць да салодкіх грэцкіх гатункаў, найперш мальвазіі, ці мальмазіі, чырвонага дэсэртнага віна, што выраблялася на Кіпры, Крыце, іншых выспах Эгеіды і ў Пэлапанэсе. На працягу доўгіх вякоў мальмазія была ў нашых продкаў увасабленьнем віна і шыкоўным сымбалем тутэйшых застольных звычаяў. Акты XV стагодзьдзя ўжо згадваюць яткі для захаваньня і продажу віна. Спажываньне мальмазіі было задавальненьнем дарагім. Самыя танныя яе гатункі прадаваліся па 50 талераў за бочку. Пакупнік, які б завітаў з такімі грашыма на менскі рынак у 1507 г., мусіў бы выбіраць паміж віном і 50 адгадаванымі валамі.

У часы літоўска-рускія густы продкаў зрабіліся больш разнастайнымі. У канцы XIV ст. вялікі наш князь Ягайла злучыў пад сваёй каронай Літву і Польшчу, заступіўшы на польскім троне вугорскага караля Лаяша і ажаніўшыся зь яго дачкой Ядвігай. Вось тады і пазнаёмілася знаць руская і літоўская зь вінамі вугорскімі. Былі гэта розныя чырвоныя і белыя гатункі, ад він сярэдняй якасьці да найдаликатнейшых і найдаражэйшых. Сам Ягайла загадваў падаваць віно на стол толькі ў выпадках выключных, як сустрэча ў 1395 г. з новым вугорскім каралём у Сончы. Тады ж віно і атрымала славу напою арыстакратычнага, неадменнага атрыбуту пекнага жыцьця заможнай шляхты і магнатэрыі. Зь віном пачалі атаясамлівацца найлепшыя і найгоршыя рысы літоўскага панства: высакароднасьць і пыха, шчодрасьць і марнатраўства. Пасьля уніі ў Любліне вугорскае віно, якое паступала да нас з кароннай Польшчы, набыло адценьне польскай акупацыі. У параўнаньні зь ім заморская мальмазія здавалася родным і простым напоем са старых слаўных часоў. Славуты наш прамоўца і абаронца старасьвеччыны



АРЦЁМ ЛЯВА

**За кулісамі рыцарскага фэсту «Лідзкі замак» 20 траўня.**

смаленскі кашталян Іван Мялешка ў пачатку XVII ст. з настальгіяй казаў, што здаўна ў краі нашым «малмазію скромна півалі… але грошы пад дастаткам мявалі». Спрабавалі рабіць і віно ўласнае. Як пра тое кажа інвэнтар Бераставіцкага ўладаньня 1604 г., ля рынкавага пляцу знаходзіўся вінаграднік. Аднак эфэктыўных адносін у вінаграднай лазы з тутэйшым кліматам не атрымалася, і вытворчасьць віна не прыжылася.

Вядома, вытанчанасьць любіць разнастайнасьць. Сябры Вакха не хацелі прысуджаць сябе да піцьця аднаго толькі вугорскага. Ваярскі іх дух падтрымоўвалі моцныя партугальскія ды італійскія мадэры. Слодычы каханьня пасавала гішпанская малага. Строгім царкоўным абрадам адпавядаў кіслы смак чырвоных малдаўскіх він. Пітвом для размаітых аказій жыцьця былі лёгкія рэйнскія белыя віны накшталт «Пэтэр Сэмін», які простасардэчныя мясцовыя аматары перахрысьцілі на «патрыцымэнт». Некаторым жа гаспадарам зямлі тутэйшай, што звыклі перарабляць усё на свой капыл, мала было і перахрышчваньня. Нават і густ райнвайну дастасоўваўся да старасьвецкіх сармацкіх звычаяў і сродкамі простымі рабіўся нашмат саладзейшым. З найграным жахам згадвае французскі падарожнік тост князёўны Радзівілаўны, узьняты за здароўе князя Нойбурскага вялікім келіхам віна з укінутым у яго ладным кавалкам цукру. Жах французаў не пратрываў доўга, бо за вялікапышнымі саскімі часамі каралёў Аўгустаў II і III у вінныя рэкі Рэчы Паспалітай пацяклі і сьлёзы гальскіх лозаў: лёгкія белыя віны, рубінавае бардо, а зь сярэдзіны XVIII ст. і шампанскае з бургундзкім. Тыя, хто пнуўся выглядаць арыстакратычна, але кішэню меў нішчымную, замест імпарту карысталіся ўласнай вынаходлівасьцю. Хітрая ўсьмешка зьзяе са старонак кніжак, што апісваюць спосабы прыгатаваньня мальмазіі з гамбурскага піва, а шампанскага — зь бярозавага соку, лімону, цукру і дрожджаў.

Але ні райнвайну, ні бургундзкаму, ні фальшаванаму не пашанцавала пахіснуць шчасьлівых фартун вугорскага віна. Паспрыялі таму дзьве слаўныя падзеі, якія адбыліся ў XVII ст. У 1650 г. абат Матэ Сэпшы, які кіраваў такайскімі маёнткамі сям'і Ракашы, загадаў адкласьці збор ураджаю вінаграду з-за небясьпекі турэцкага ўварваньня. Калі ж ягады нарэшце дачакаліся збору, то зморшчыліся і аказаліся ўкрытымі цьвільлю. Сок гэтых ягад было вырашана выціснуць асобна, пасьля чаго дадаць у сусла. Калі ж віно, выробленае такім чынам, пакаштавалі на Вялікдзень, захапленьню знаўцаў не было мяжы. Бурштынавы нэктар меў водар, які, здавалася, нёс у сабе сонечныя промні далёкага поўдня і лёгкі подых свежасьпечанага жытнягa хлеба і айвы. Калі ў 1683 г. чарговае ўварваньне туркаў на падуладныя Габсбургам землі ўсё ж адбылося, для ваярства Рэчы Паспалітай, якое прыйшло ратаваць Вену, у адплату за сьмеласьць ужо быў гатовы вытанчаны прыз. Спрычынены высакароднай цьвільлю водар Такая Асу прыйшоўся так даспадобы сьмелым рыцарам, што ў далейшым цаніўся ў Рэчы Паспалітай удвая вышэй за найлепшыя францускія гатункі. Як выкладалі ў 1755 г. у сваіх справаздачах імпэратарскія дарадцы, купцы з Рэчы Паспалітай скуплялі ў вугорцаў віно ўжо падчас збору ўраджаю ці нават «на пні». Нядзіўна, што здабытае ваеннай славай і аплачанае вялікімі грашыма віно стала на землях Арла і Пагоні прадметам культу і заступіла мальмазію на пачэсным месцы ўвасабленьня старых добрых звычаяў.

Віно паяднала ў сабе форму і сутнасьць шляхетнай культуры Рэчы Паспалітай. З аднаго боку вінапіцьцё было рытуалам, у якім выражаліся найвысакароднейшыя пачуцьці моцнага сяброўства, выкшталцонага каханьня, непарушнага баявога брацтва. З другога — шляхетны напой, які ўздымаў дух, мацаваў сілы і сваім складаным водарам вучыў разумець адценьні і адрозьніваць добрае ад кепскага і пасрэднага, сам служыў крыніцай высокіх пачуцьцяў. Таму аднолькава натуральна віно пасавала афіцыйнаму прыёму, сяброўскай бяседзе, амурнаму спатканьню і вайсковай радзе. Як пісаў пра тое Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч:

І саноўнае панства, паводле закону,
Адбывае нараду de publico bono; —
Кожны пан сваю думку давесьці імкнецца,
А вугорскае хмельнай ракою ліецца, —
Нашы прадзеды самаважнейшыя справы
Вырашалі за кубкам у часе забавы.

Сваёй прыўкраснасьцю рытуалы вінапіцьця нагадвалі карункі барочнага мастацтва, а бравурнасьцю — атакі панцырных гусараў на турэцкія пазыцыі. Вось які выгляд мела бяседа шляхты вачыма красамоўнага Анджэя Кітовіча. «Спачатку гаспадар, зьеўшы кавалак мяса, наліваў у маленькі кілішак віна і піў ім «здароўе» ўсіх, хто сядзеў за сталом, — пачынаючы ад самых паважаных і сканчаючы астатнімі. Называючы кожную значную асобу, прытыкаў да вуснаў і адымаў кілішак. Скончыўшы з знакамітымі, астатніх застольнікаў называў аднаго за другім па прозьвішчы або агульным «Васпана здароўе»; калі каго ня ведаў, скіроўваў на яго позірк, не прытыкаў да губ кілішка, толькі трымаў яго ў руцэ; назваўшы ж апошняга, лыкнуў крыху або да дна піў, калі яму падабалася, і ставіў кілішак». Кожны названы госьць піў у рэспонс здароўе гаспадара. Да страў гарачых рытуал паўтараўся з большымі келіхамі, а часам і суправаджаўся залпамі гармат. Само віно ў ёмістасьцях на стале сваёй колькасьцю і расстаноўкай нагадвала ці то батальёны на полі бою, ці то расклад палітычных сіл і прыхільнасьцяў. Менавіта так быў сэрваваны стол Сапегаў падчас прыёму сярэдзіны XVII ст. у іх рэзыдэнцыі Дзярэчыне. «Што ж да напояў, дык былі чатыры кубкі, па ліку пораў году, зь віном часоў караля Сьцяпана Батуры. Парамі стаялі дванаццаць срэбных збаноў зь віном часоў Жыгімонта Вазы — гэтыя збаны сымбалізавалі дванаццаць месяцаў. Таксама парамі стаялі пяцьдзясят два барылкі, таксама срэбныя, якія адпавядалі колькасьці тыдняў у годзе, і напоўненыя яны былі кіпрскім, гішпанскім і італійскім віном. А далей — 365 бутэлек з вугорскім віном, столькі, колькі дзён у годзе». Дык то ня дзіва, што ўдзельнік такога рытуалу мусіў адчуваць сваю прыналежнасьць да нейкай значнай падзеі!

Але вінаградная лаза афарбоўвала карціны той вясёлай культуры і змрочнымі адценьнямі. Тая ж грамадзкая значнасьць віна, што прынесла яму паспалітую пашану, патроху ператварала яго ва ўсеагульнае зло. Кожны пан, які не хацеў выслаўлівацца

Працяг на старонцы 44.

# Віна

**Працяг са старонкі 43.**

як скнара, мусіў шчодра частаваць пітвом сяброў і гасьцей, аж пакуль не прыводзіў іх у стан непрытомнай эўфарыі. Мусіў пры тым піць і сам гаспадар. Горка скардзіўся ў сваім дыярыюшы канцлер Караль Радзівіл, як мусіў піць з цэлым войскам, а тады, ад'ехаўшы ад стану на чвэрць мілі і схаваўшыся ад сабутэльнікаў, праспаў ад трэцяй дня да шостай ранку. Тым больш гэта патрабавалася ад тых, хто меў амбіцыі палітычныя і хацеў такім чынам здабыць сабе прыхільнікаў. Вынікам таго, найперш, было страшэннае марнатраўства. Узор традыцый літоўскага панства, Радзівіл «Пане Каханку» ў 1780 г. папоўніў свае запасы да Каляд закупкай у Рызе 1500 пляшак шампанскага, 300 пляшак райнвайну, 200 пляшак бургундзкага, 100 пляшак аракі і 3 цэбраў ангельскага піва. Такія колькасьці віна зьліваліся ў адзін магутны вір і змывалі са свайго шляху тонкасьці рытуалаў. Менскі ваявода Крыштаф Завіша расказваў, як ладна напіўся з каралём Аўгустам II Моцным, перамяжаючы віно з падвойнай анісавай гарэлкай. Наколькі мондрымі пры гэтым былі іх дзяржаўныя думкі, Завіша не тлумачыць. Свой вэрдыкт наконт такіх зацных звычаяў урачыстым сілабічным вершам вынес Сімяон Полацкі:

Тако піянство ум наш помрачает; —
Всяк убо того верный да гонзает.

У другой палове XVIII ст. з такой думкай пагадзіўся і сам кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, за панаваньне якога Рэч Паспалітая пачала сваё незавершанае абуджэньне ад п'яных мрой. Не было культам віно і для энэргічных дзеячоў пакаленьня Касьцюшкі, Ясінскага, Сташыца, Калантая і Нямцэвіча. Будаваць абноўленую Рэч Паспалітую пад лёгкімі крыламі Асьветніцтва не выпадала ў штучна зьмененым стане розуму і сэрца. Але дыямантаваму напою



яшчэ выпала адлюстраваць крывавую славу рэспублікі абодвух народаў. Перад нашэсьцямі ўсходніх армій і ўжо пасьля падзеньня дзяржавы, пад імпэрскім ботам, віно ізноў стала сымбалем залатой вольнасьці, нядаўна страчанай, але ўжо недасяжнай. Яшчэ зьбіралася на свае соймікі гордая шляхта і пад акампанэмэнт вугорскага надзявала канфэдэраткі, ці то каб у чарговы раз пайсьці «до лясу», ці то каб дапамагчы вялікаму імпэратару прыняць у баяр ключы ад Масквы. Але як адыходзіла ў мінулае бліскучая легенда Рэчы Паспалітай і яе вялікапышнага панства, так вянула слава і іх напою. Да другой паловы XIX ст. віно ў Літве і Беларусі дажыло, страціўшы статус напою ўлады. Да люду ж простага яно не было дапушчана новай расейскай уладай, якая так клапацілася пра сваю ўлюбёную гарэлку, што ў пэўны час зьнізіла яе цану ў Віленскай губэрні з 14 да 2,5 капеек за кварту. Дыскутаваць з гэтым было немагчыма.

Зрэшты, як не дапамагала фартуна, дапамагло няшчасьце. Жорстка адлучаная ад бурлівага палітычнага жыцьця штыхом, ссылкай, а дзе і шыбеніцай, соймікавая літоўская і беларуская шляхта мусіла нанова знайсьці сябе ў вынаходніцтвах і будаўніцтве, дасьледаваньнях і падарожжах, творчасьці і каханьні, каб у новым спаборніцтве пераўзысьці сваіх супернікаў і годна паглязець ім у вочы. Нішто так не адпавядала гэтаму ўзьнёсламу парыву чалавечага духу і не жывіла яго так моцна, як здаўна знаёмае, але нанова адкрытае і тонка ацэненае віно. Ужо Міцкевіч успрымаў віно ня толькі як баявога сябра і неадменнага спадарожніка соймікаў і нарад, але і запрашаў Вакха далучыцца да заняткаў навукай, паэзіяй і каханьнем.

Мы венгерскае п'ём стогадовага смаку.
Рвецца з чараў каньяк, пунш шалее, шаманіць.
Прыгажуні мускатам сваю гасяць смагу,
Ён бадзёрыць, мускат, думак ён не туманіць.

А калі ж у вачох загарацца пажары,
Паплывуць захмялела дасьціпныя словы,
У паненак гусьцей зарумяняцца твары,
Кругам пойдуць ад позіркаў сьмелых галовы.

Не перамогшы палітычна, моцная духам шляхта здолела стварыць узор пана высакароднага і выхаванага і распаўсюдзіць звычаі свае шырока па-за межы свайго стану і свайго краю. Пераадолела цяжкія часы і традыцыя спажываць добрае віно. Тым больш і Расейская імпэрыя здолела дадаць новых кветак у букет, што красаваў у Літве і Беларусі. У дадатак да вугорскіх і францускіх він у Вільню і іншыя губэрнскія цэнтры пачалі завозіць старадаўнія каштоўныя віны з Кахетыі і Імэрэтыі кшталту сапэраві і ркацытэлі. Сіні Дон дарыў раздорскія і цымлянскія віны. Вызначалася сваімі мацаванымі і лікёрнымі вінамі крымская Масандра, дзе з 1826 году вінаграднікамі апекаваўся граф Воранцоў, а ў 1892 галоўным вінаробам стаў славуты князь Галіцын. І з гэтага ж году ў Крыме пачаў выраблятца з завезеных туды вугорскіх гатункаў вінаграду фурмінт і харшлевелю… славуты такай. Кола замкнулася. Віно, якое служыла сымбалем вольнасьці і жывіла дух змагароў з імпэрыяй, цяпер само ў вакхічным мірным шэсьці пераможна прайшло па імпэрыі, адзначыўшы трыюмф сілы і радасьці духу.

І з гэтым водарам сонечных промняў і подыхам сьвежасьпечанага жытняга хлеба і айвы, нашы продкі параілі нам не пераймацца тлумнымі справамі палітыкі, а віно пакінулі на сяброўскую цеплыню, філязофскі роздум і гульні каханьня.

Тая ж грамадзкая значнасьць віна, што прынесла яму паспалітую пашану, патроху ператварала яго ва ўсеагульнае зло.

## Музэй у сьвірне Элізы Ажэшкі

У вёсцы Мількаўшчына, што за 10 км ад Скідзелю, на месцы сядзібы Элізы Ажэшкі будзе створаны турыстычны комплекс. Аднаўленчыя работы плянуецца завяршыць налета. Да 6 чэрвеня, дня нараджэньня Э.Ажэшкі, на месцы былой капліцы будзе ўсталяваны і асьвечаны крыж. Плянуецца аднавіць адзін з захаваных будынкаў, дзе разьмесьціцца музэй.

Мількаўшчына ўключана ў турыстычны маршрут «Дарогай Элізы Ажэшкі і Адама Міцкевіча». Там захавалася кляновая алея, калодзеж, сьвіран са склепам. За парадкам сочаць вучні Мількаўшчынскай базавай школы імя Элізы Ажэшкі.

## Паэма пра расстрэл чыгуначнікаў перавыдадзеная

Грамадзкасьць Вялейкі выдала зборнік паэзіі Сяргея Законьнікава «Гэта мы».

У кнігу ўвайшлі паэмы «Чорная быль», «Цівалі» і «Зязюля», напісаныя ў 1988—95 г. «Чорная быль» прысьвечана чарнобыльскай трагедыі, «Зязюля» — В.Быкаву, а «Цівалі» — трагедыі часоў сталінізму.

Паэт распавёў, што ў вёсцы Цівалі (цяпер раён кінатэатру «Аўрора») у 1938 г. за адмову адпраўляць эшалёны рэпрэсаваных у Сыбір былі расстраляныя 300 беларускіх чыгуначнікаў. Каб утаіць злачынства, целы закапалі ў жывёламогільніку. Па санітарных нормах, такія могільнікі нельга раскопваць 100 гадоў. Аднак у 1960-я ў сувязі з пашырэньнем сталіцы ў раёне Цівалёў пачалося будаўніцтва. Салдаты ўскрылі могільнік і знайшлі парэшткі людзей, скручаныя калючым дротам. Па загадзе «зьверху» рэшткі людзей і жывёл былі спаленыя і пахаваны ў лесе ля дарогі на Ракаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Шалкевіч выступіў за рэфэрэндум

**22 траўня Віктар Шалкевіч сваім канцэртам распачаў акцыю «Музыкі супраць разбурэньня Горадні». Кампанія распачалася пасьля таго, як у межах «рэканструкцыі» ў старым горадзе зьнесьлі некалькі гістарычных будынкаў. Зараз грамадзкія актывісты рыхтуюць да рэгістрацыі ініцыятыўную групу па правядзеньні рэфэрэндуму ў абарону Горадні.**

## Быкаў па-амэрыканску

Ва Ўкраіне ў львоўскім выдавецтве «ВолЯ» пабачыла сьвет кніга прыпавесьцяў Васіля Быкава. Яна дзьвюхмоўная — тэксты зьмешчаныя ў арыгінале і па-ангельску. Дзесяць прыпавесьцяў на ангельскую мову пераклалі прафэсар-славіст унівэрсытэту Паўднёвай Алябамы Джозэф П. Мозур і перакладчык і журналіст з Флёрыды Ігар Казак, сын пісьменьніка Рыгора Крушыны.

## Палачане галасавалі за Ўсяслава Чарадзея

Месца, дзе мае стаяць помнік Усяславу Чарадзею, у Полацку выбіралі ўсёй грамадой. На абмеркаваньне было прапанавана пятнаццаць варыянтаў.

Пакуль спэцыялісты віртуальна ўсталёўвалі манумэнт на кожнае з прапанаваных месцаў і ацэньвалі кожны атрыманы пэйзаж, месьцічы актыўна галасавалі. Меркаваньні народнага галасаваньня і спэцыялістаў супалі. Помнік будзе ўсталяваны на скрыжаваньні вуліц Эўфрасіньні Полацкай і Кастрычніцкай. Справа ад Усяслава Чарадзея будзе манастыр Сьв.Эўфрасіньні, зьлева — Сафія. Усталяваць помнік плянуецца ў верасьні.

## На Канскім фэстывалі фільмы пры падтрымцы ЭС

Для 60-га Міжнароднага кінафэстывалю ў Канах былі адабраныя 11 фільмаў, прафінансаваных з дапамогай праграмы MEDIA Эўрасаюзу. Эўрапейскія структуры маюць цьвёрды намер з дапамогай інвэстыцый у кінаіндустрыю не дапусьціць манапалізацыі гэтага мастацтва адной краінай, а менавіта Галівудам.

**«Звязды», радыё «Свабода», Белта, Народных навінаў Віцебску**

# Хуліган і Міліцыянт





Пані Ганка з Пагулянкі
На гулянку выйшла зранку

Ёй насустрач - хуліган,
Сківаца нібы капкан.




http://www.tanakaland.org




«МОНОЛОГ»

**Уладзімер Цэсьлер**

**25 траўня** (пятніца) **а 19.30 у клюбе «Ізюм»** (пр.Незалежнасьці, 25) пройдзе выстава карцін мастака Ўладзімера Цэсьлера. На выставе будуць гучаць клясычная музыка, арыі зь італьянскіх опэр у жывым выкананьньні, а таксама дыджэйскія сэты. Азартных аматараў мастацтва чакае аўкцыён. Уваход вольны. Т.: (029) 605–25–25

## КАНЦЭРТ

**Опэра ля сьценаў Сафіі**

**1 чэрвеня** салісты і хор Опэры выступяць у вялікім начным канцэрце **ля сьцен Сафіі ў Полацку**. **Канцэрт пачнецца а 22-й**. Пры канцы будзе фаервэрк. Упершыню разам з опэрнымі артыстамі загучыць велічны арган Сафіі.

Праграма канцэрту складзеная з найлепшых узораў опэрнай клясыкі, а таксама эстраднай клясыкі — песьні Фрэнка Сінатры, мэлёдыі Дж.Гершвіна, Ф.Сарторы.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Нябачны»

«Нябачны»

ЗША, 2007, каляровы, 97 хв.

**Рэжысэр:** Дэвід С.Гоер

**Жанр:** Містычная драма

**Адзнака:** 4 (з 10)

Сюжэт фільму нібы ўзяты зь беларускай баляды. Нік — выдатнік і прыгажун. Пасьля школы яго чакае бліскучая будучыня. Але пасьля нападу хуліганаў ягонае зьнявечанае цела хаваюць у лесе, а душа блукае паміж жывымі.

Але аўтары заблыталіся з антаганістамі. Спачатку ў якасьці «ворага» выступае дзяўчына-хуліганка, якая ледзь Ніка не забіла, а цяпер мусіць ратаваць. Потым на ролю «дрэннага хлопца», зь якім герой мусіць сысьціся ў фінальнае бойцы, прэтэндуе татуяваны рэцыдывіст. Урэшце, галоўнай нягодніцай выяўляецца... матуля героя.

Сцэнарная блытаніна зьнішчае файную ідэю. Цікава, што ў рэклямным трэйлеры ёсьць пэрсанажы, якія не ўвайшлі ў фільм. Але стужка й так здаецца зацягнутай.

**Андрэй Расінскі**




## Газэта «Наша Ніва»

шукае карэктара на пастаянную працу

Зьвяртацца на e-mail:

**nn@nn.by**, **nn@promedia.by**.

Або праз тэлефоны:

**(017)284-73-29**, **613-32-32**, **707-73-29**.




## А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 25.**

# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі

Дзікар і Джулія. Чытачы «НН» сёньня. Рэпартаж з Паплавоў, Наваградзкага раёну .............................. 26

Чытач «НН» 100 гадоў таму. Лёс Міколы Аношкі зь Вялейшчыны .............................. 35

Хібы праектнай дакумэнтацыі: палеміка з артыкулам Сяргея Богдана «Перазагрузка Беларусі» .............................. 28

Перазагрузка пазытыўнага мысьленьня: палеміка з артыкулам Сяргея Богдана .............................. 30

Што Беларусі да Умару Яр'Адуа? .............................. 32

Як зьмянілі Польшчу тры гады ў Эўразьвязе .............................. 32

Злосная клясыфікацыя. Фэльетон пра незалежную прэсу, напісаны сьлесарам з-пад Пухавіч .............................. 36

Перакладчык «Байцоўскага клюбу»: Мы да таго ідзём ....... 38

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### САЛІДАРНАСЬЦЬ

**Беларусы!** Выявіце салідарнасьць – прыходзьце на суд па справе «Маладога фронту» — 28 траўня, 10.00, Лагойскі тракт, 3! Брат

### БАСОВІШЧА

**Шукаю тых**, хто вельмі хоча патрапіць на фэст у Польшчу, але па тых ці іншых прычынах ня мае спадарожнікаў. Прапаную вандраваць разам:))) katjaryna@gmail.com

### КАНТАКТЫ

**Чалавек**, які дасылаў Кастусю sms накont БХД, адгукніся. Т.: 329-61-96. Кастусь

**Дзяўчына**, якая абараняла дыплём на беларускай мове і давала прапанову накont сваёй справы, адгукніся. Т.: 329-61-96. Кастусь

**Шляхта** Рэчы Паспалітай. http://www.szlachta.org

### КНІГІ

**Прапаную кнігі**: Ермаловіч «Беларуская дзяржава ВКЛ», Юхо «Крыніцы беларуска-літоўскага права», Ластоўскі «Кароткая гісторыя Беларусі», Краўцэвіч «Тэўтонскі ордэн», «Беларускі кнігазбор», «Скарбы сусьветнай літаратуры», «Энцыкляпэдыя Гісторыі Беларусі» 1 — 5 т. ды шмат іншага, усе напрамкі. Т.: 753-70-05

**Абмен** культуралягічнай інфармацыяй, кнігамі. Дашлю сьпіс прапаноў. Канфэрэнцыі, літаратурныя вечарыны, выдавецкія праекты. Ад Вас — капэрта са зваротным адрасам. а/с 195, 220030, Менск. alesknigi@mail.ru

### ПРАЦА

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174-98-91

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Вучыцель ніколі ня бачыў і ня бачыць дабра. Усё яго жыцьцё — адна пакута. І хто над ім ня мае волі? Колькі ў яго начальства ўсякага? Поп, пісар, старшына, староста, вураднік, стражнік… Цьфу! Аж гаварыць брыдка ды і язык зломіш, покі іх пералічыш. І кожнае гэтае начальства лічыць сваім правам так ці іначай скубянуць вучыцеля, а то і ўкусіць яго. І вучыцеля скубуць і кусаюць, а яго доля — маўчы і цярпі.

**К.Наднёманец. «Наша Ніва». №20. 1907**

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 23.05.2007.

Замова № 2790.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.